Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

26 ЛІСТАПАДА 2015 г. ЧАЦВЕР № 229 (28087) Кошт 2000 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА



**Рэсацыялізацыя пасля турмы**

СТАР.4

Сямейная газета



**Талент без дыплома**



**Сем'і шчаслівыя таксама па-рознаму**

*ЦЫТАТА ДНЯ*



**Леанід ШЭНЕЦ, першы намеснік міністра энергетыкі:**

*«Рэалізацыя праекта па будаўніцтве ўласнай АЭС дазволіць Беларусі штогод замяшчаць больш як 5 млрд куб. м імпартуемага прыроднага газу: яго спажыванне ў краіне зменшыцца з сённяшніх 22 млрд куб. м да 16,5 мільярда куб. м у 2020 годзе. Гэта павінна адбыцца ў асноўным за кошт зніжэння амаль у два разы яго спажывання ў энергетыцы. Пры гэтым будзе захоўвацца нязменны ўзровень спажывання газу насельніцтвам. Сярэднегадавы выпуск электраэнергіі пры рабоце атамнай электрастанцыі ў базавым рэжыме складзе 17 млрд кВт-гадз. З 2019 года ў балансе электрычнай энергіі краіны імпарт будзе адсутнічаць. Акрамя таго, запуск Беларускай АЭС дазволіць знізіць выкіды парніковых газаў на 7-10 млн тон у год».*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 26.11.2015 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 18127,00 ▲ | |
| Еўра | 19328,00 ▲ | |
| Рас. руб. | 276,96 ▲ | |
| Укр. грыўня | 764,85 ▲ | |

ISSN 1990 - 763X

# ЗІМОВЫ АБУТАК ДЛЯ АЎТО





Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

**На Мінскай кальцавой дарозе ў аўтасэрвісе прадпрыемства «Аўташынамантаж» 10 гадоў працуе спецыяліст па замене колаў Міхаіл Казакоў *(на фота).* У гэтыя дні вопытнаму слесару адпачываць не даводзіцца — з наступленнем халадоў і па правілах дарожнага руху аўтауладальнікі імкнуцца «пераабуць» сваіх жалезных коней у зімнія шыны. Дзяржаўтаінспекцыя, дарэчы, рэкамендуе зрабіць гэта як мага хутчэй — да 1 снежня.**

# «НЕ ТРЭБА, НЕ ВАРТА НАРАКАЦЬ»

**Сёння Уладзіміру Караткевічу споўнілася б 85 гадоў... І ўжо больш як 30 яго няма з намі... І амаль столькі ж — 30 гадоў — яму было адведзена на свядомае віраванне «сярод сабе падобных» — на актыўную творчую дзейнасць, каб данесці чытачу свае думкі, сваё разуменне навакольнага свету праз друкаванае слова.**



Выдавецтва «Мастацкая літаратура» з 2012 года ажыццяўляе выданне Збору твораў Уладзіміра Караткевіча ў 25 тамах (на падыходзе ўжо 11-ты том). Аматары творчасці пісьменніка атрымалі магчымасць азнаёміцца з паэзіяй, апавяданнямі, аповесцямі і раманамі, падрыхтаванымі на падставе рукапісаў і машынапісаў — г. зн. без цэнзарскіх і рэдактарскіх правак, зробленых падчас прыжыццёвых публікацый.

Можа ўзнікнуць пытанне: чаму ж Уладзімір Караткевіч не пісаў «у стол», а згаджаўся на выданне сваіх твораў у змененым выглядзе? Адказы могуць быць самымі рознымі, але перадусім пісьменнік, мабыць, разумеў, што яго творы вельмі патрэбны цяпер (тады, у 1950—1980-я гады), яны павінны працаваць на выхаванне Чалавека разняволенага, пазбаўленага ад пацыны ранейшых падманных уяўленняў; гуманнага, сапраўднага Грамадзяніна, не скіраванага ў жыццёвых памкненнях толькі на сябе.

Творчае жыццё Караткевіча — гэта змаганне за свае творы, за сваё права на ўласнае бачанне гісторыі і сучаснасці. Таму ўсё прыжыццёва апублікаванае — пэўным чынам кампраміснае, тое, што аўтар здолеў абараніць. А на гэта выдаткоўваліся вельмі патрэбныя для напісання новых твораў высілкі, узнікалі зразумелыя для такіх выпадкаў творчыя крызісы і зрывы, а ў выніку — скарачалася і так кароткае чалавечае жыццё. Але і было спадзяванне, што ўрэшце ўсё напісанае дойдзе да чытача без змен. Невыпадкова ж Караткевіч пакідаў такія, напрыклад, заўвагі на палях: «Ай, ды рабіце вы, што хочаце!!!» (выпадковага ў асоб накшталт Караткевіча не бывае).

Ці шмат іх было, гэтых змен? Адносна кожнага твора іх трэба разглядаць асобна. Скажам толькі пра некаторыя, кранаючыся твораў розных жанраў.

СТАР. 5

УВАГА, «ПРАМАЯ ЛІНІЯ»

**Усё пра нерухомасць**

**Сёння, 26 лістапада,** у рэдакцыі «Звязды» адбудзецца **«прамая лінія» са старшынёй Дзяржаўнага камітэта па маёмасці Беларусі**

**Андрэем Анатольевічам ГАЕВЫМ**



Пытанні, якія тычацца правілаў і новых тэрмінаў дзяржаўнай рэгістрацыі нерухомай маёмасці, нюансаў ацэнкі дамоў і зямельных участкаў, а таксама ўсяго іншага, што звязана з зямельнымі надзеламі фізічных асоб, можна будзе задаць **з 15 да 16** гадзін **па тэлефоне (8-017) 287-18-71**.

Папярэдне свае пытанні магчыма пакінуць **па нумары (8-17) 287-17-51** альбо даслаць **на электронную пошту kurkach@zviazda.by** з пазнакай «Прамая лінія».

■ Парламенцкі дзённік

# ЭКАНАМІЧНЫЯ ПЕРСПЕКТЫВЫ НОВАСІБІРСКА

**«У нас ёсць вельмі вялікае поле для пашырэння ўзаемаадносін», — заявіў Міхаіл МЯСНІКОВІЧ, старшыня Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі, падчас сустрэчы з губернатарам Новасібірскай вобласці Уладзімірам Гарадзецкім і падзякаваў госцю «за развіццё беларуска-расійскага супрацоўніцтва, якое рэалізуецца ў сумесных праектах».**

— Я пазітыўна ацэньваю ўзаемнае супрацоўніцтва, але ў нас крыху прасеў тавараабарот. Магчыма, трэба было разгледзець нейкія прынцыпова новыя падыходы для таго, каб ажывіць гандлёва-эканамічныя і іншыя працэсы, — лічыць спікер верхняй палаты беларускага парламенту.

Ён удакладняе, што маецца на ўвазе ўдасканаленне схем фінансавання (крэдытавання ўзаемных паставак) і развіцця прамысловай кааперацыі, а таксама прапануе пры пастаўках тэхнікі абапірацца на лізінг.

Летась узаемны тавараабарот Беларусі і Новасібірскай вобласці быў больш за 230 мільёнаў долараў. Беларускі экспарт у асноўным складаецца з паставак трактароў і седлавых цягачоў, нафтапрадуктаў і панчошна-шкарпэтачных вырабаў. З Новасібірскай вобласці ў нашу краіну пастаўляюцца харчовыя тавары, фармацэўтычныя прэпараты, прадукцыя хімічнай прамысловасці. Сёлета за студзень-верасень тавараабарот склаў 103,8 мільёна долараў са станоўчым сальда больш як 61 мільён.

**Вераніка ПУСТАВІТ.** *pustavit@zviazda.by*

■ На думку парламентарыя

**Віталь БУСЬКО, старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі па міжнародных справах:**

# «НАТУРАЛЬНА І ЛАГІЧНА»

— З кім у Беларусі самыя цесныя адносіны? З кім Саюзная дзяржава? З Расіяй. У гэтым годзе ў рознага кшталту фарматах адбылося дзевяць сустрэч прэзідэнтаў нашых краін і пяць — на ўзроўні прэм'ер-міністраў. Узаемны тавараабарот па выніках 2014 года склаў 37,6 мільярда долараў, экспарт паслуг — 3,19 мільярда долараў, імпарт — 1,46. На Расію прыпадае 48% аб'ёму знешняга гандлю Беларусі. Сёння гэта асноўны партнёр для нашай дзяржавы.

Маючы адбыцца афіцыйны візіт набывае большую актуальнасць з прычыны таго, што зараз ідзе інтэнсіўнае развіццё інтэграцыйных працэсаў — стварэнне Еўразійскага эканамічнага саюза. За няпоўны год мы прыраслі ажно на дзве краіны! Гэта патрабуе ад ініцыятараў, «лакаматываў» еўразійскай інтэграцыі вельмі цеснага ўзаемадзеяння. Таму што мы прынялі ў



саюз краіну, якая не мае агульнай мяжы з членамі ЕАЭС, — Арменію. Гэта як лакмусавая папера: калі ўсё добра складзецца з ёй, з'явіцца шмат ахвотных уступіць у саюз.

Першым, хто павіншаваў Прэзідэнта Беларусі пасля перамогі ў выбарах, быў Прэзідэнт Расіі Уладзімір Пуцін. Калі ўсе гэтыя факты ўзяць у сукупнасці, то натуральна, лагічна і правільна, што першы візіт пасля інаўгурацыі Аляксандра Лукашэнкі адбываецца менавіта ў гэтую дзяржаву.

**Вераніка ПУСТАВІТ.** *pustavit@zviazda.by*

■ Службовая камандзіроўка

# ЦЯПЕР АПЛАЦЯЦЬ І ЭЛЕКТРОННЫ БІЛЕТ

### У МІНФІНЕ АДЗНАЧЫЛІ, ШТО ПРАЖЫВАННЕ Ў ПРЫВАТНАЙ КВАТЭРЫ РАБОТНІКУ КАМПЕНСУЮЦЬ, А Ў АГРАСЯДЗІБЕ — НЕ

**Падставай для кампенсацыі работніку расходаў па праездзе да месца службовай камандзіроўкі і назад можа служыць і электронны білет, паведаміла падчас анлайн-канферэнцыі на сайце БЕЛТА кансультант упраўлення фінансавання дзейнасці дзяржаўных органаў Міністэрства фінансаў Вольга КАРАЛІНСКАЯ.**

Яна растлумачыла, што, згодна з заканадаўствам, для пакрыцця расходаў па праездзе да авансавай справаздачы павінны быць прыкладзены сапраўдныя праязныя дакументы (квіткі), якія пацвярджаюць памер фактычна панесеных выдаткаў. Пры афармленні квітка на цягнік з электроннай рэгістрацыяй яму прысвойваецца рэгістрацыйны нумар, які з'яўляецца безумоўным ідэнтыфікатарам кошту і канкрэтных рэквізітаў паездкі і ў поўнай меры пацвярджае факт аплаты білета. Акрамя таго, у электронным білеце ўказваюцца прозвішча, імя і імя па бацьку пасажыра, якія ён абавязаны пацвердзіць пасведчаннем асобы пры пасадцы ў вагон. «У сувязі з гэтым уяўляецца магчымым пацвярджаць выдаткі на праезд на падставе бланка заказу, самастойна раздрукаванага на папяровым носьбіце пры афармленні электроннага праязнога дакумента з электроннай рэгістрацыяй на сайце Беларускай чыгункі», — адзначыла Вольга Каралінская. Гэта ж тычыцца і набытых праз інтэрнэт аўтобусных білетаў, бо ім аўтаматычна прысвойваюцца нумары, па якім ажыццяўляецца ўлік іх далейшага выкарыстання, а таксама ўказваюцца прозвішча і ўласнае імя пасажыра.

Квіток, самастойна раздрукаваны на папяровым носьбіце пры афармленні электроннага білета пры аўтамабільнай перавозцы пасажыра ў рэгулярных зносінах, таксама можа служыць падставай для кампенсацыі работніку расходаў па праездзе да месца службовай камандзіроўкі і назад.

А вось выдаткі камандзіраваных у межах Беларусі работнікаў на пражыванне ў аграсядзібе не пакрываюцца. Беларускім заканадаўствам не прадугледжана пражыванне камандзіраванага работніка ў аграсядзібе. Аграсядзібы прызначаны для часовага знаходжання грамадзян у мэтах атрымання паслуг аграэкатурызму, для адпачынку, аздараўлення, азнаямлення з прыродным патэнцыялам краіны, нацыянальнымі культурнымі традыцыямі без заняткі працоўнай, прадпрымальніцкай і іншай дзейнасцю.

Вольга Каралінская таксама пракаментавала выпадкі, калі на камандзіроўкі работнік здымае жыллё ў індывідуальнага прадпрымальніка. Пакрыццё такіх расходаў ажыццяўляецца па аналогіі з выдаткамі па пражыванні ў гасцініцы: пакрыццю падлягаюць выдаткі па найме ў індывідуальнага прадпрымальніка або аднапакаёвай кватэры, або аднаго пакоя ў кватэры, або аднаго месца ў пакоі.

Цікавы факт. Згодна са зменамі ў заканадаўстве, цяпер можна ездзіць у камандзіроўку без камандзіровачнага пасведчання. Неабходнасць выдачы работнікам камандзіровачнага пасведчання вызначаецца наймальнікам, калі іншае не прадугледжана заканадаўчымі актамі. Таму тыя арганізацыі, для якіх спецыяльныя заканадаўчыя акты не ўказваюць афармляць камандзіровачныя пасведчанні, самастойна прымаюць рашэнне аб яго выдачы з улікам канкрэтных умоў камандзіроўкі, у якую накіроўваюць работніка. Такім чынам, гэта норма мае рэкамендацыйны характар. Калі камандзіровачнае пасведчанне не афармляецца, то факт знаходжання работніка ў камандзіроўцы пацвярджаецца загадам аб камандзіраванні, а таксама дакументамі, прыкладзенымі да авансавай справаздачы (праязнымі дакументамі, квітанцыямі за пражыванне і інш.).

А яшчэ, калі работніку той бок, які прымае альбо адпраўляе яго, аплачвае харчаванне, сутачныя выплачваюцца ў памеры 50% ад вызначанай нормы.

**Сяргей КУРКАЧ.** *kurkach@zviazda.by*

# ПАТРАБУЕЦЦА СУР'ЁЗНАЯ ВЫТРЫМКА

### Інцыдэнт са збітым турэцкімі ВПС расійскім ваенным самалётам выклікае глыбокае шкадаванне і крайнюю занепакоенасць

Пра гэта заявіў **начальнік упраўлення інфармацыі — прэс-сакратар МЗС Дзмітрый МІРОНЧЫК**, адказваючы на пытанне аб тым, якая рэакцыя Беларусі на інцыдэнт са збітым турэцкімі ВПС расійскім ваенным самалётам, паведамляе БЕЛТА.

«Падобныя трагічныя і вельмі небяспечныя інцыдэнты выклікаюць глыбокае шкадаванне і крайнюю занепакоенасць. Асабліва, калі яны адбываюцца ў рэгіёне, дзе і без таго на працягу некалькіх гадоў ідзе крывавае ўзброенае супрацьстаянне, і калі ўдзельнікамі такіх інцыдэнтаў становяцца братэрская для нас Расія і дружалюбная Турцыя», — заявіў прэс-сакратар.

«Гэты драматычны абарот падзей не ў інтарэсах ні адной з уцягнутых краін і пагражае палітычнымі наступствамі для агульнай справы сусветнай супольнасці — барацьбы з міжнародным тэрарызмам», — падкрэсліў Дзмітрый Міронччык.

«У любых падобных сітуацыях патрабуюцца вытрымка, сумесная работа па дээскалацыі напружанасці і высвятленню ўсіх дэталяў інцыдэнту з тым, каб пазбегнуць іх паўтарэння ў будучыні», — дадаў ён.



■ Меркаванне

# НЕЧАКАНАЯ АТАКА



24 лістапада турэцкі знішчальнік нанёс удар па расійскім самалёце-бамбардзіроўшчыку «Су-24», які здзяйсняў баявы вылет у рамках аперацыі супраць групоўкі «Ісламская дзяржава» ў Сірыі. Загінуў як мінімум адзін лётчык, ёсць папярэдняя інфармацыя, што ён атрымаў раненні пасля катапультавання і быў забіты сірыйскімі паўстанцамі. Інакш як цалкам непрадуманым крокам з боку Турцыі гэта і не назавеш. Нягледзячы на тое, што Турцыя адкрыта не падабаецца прысутнасць расійскіх узброеных сіл на тэрыторыі Сірыі, іх задачы па барацьбе з «Ісламскай дзяржавай» аб'ектыўна выгадныя самой Турцыі, якая цярпіць ад шматлікіх тэрактаў. Але, як відаць, далёка не ўсе ў Турцыі падзяляюць гэты пункт гледжання. Многія разглядаюць неўзгодненую з Турцыяй прысутнасць расійскіх войскаў у Сірыі як адкрыты выклік яе рэгіянальнай магутнасці. Або спробай яго рэалізаваць у будучыні.

Паколькі Турцыя з'яўляецца членам НАТА, яна тут жа пасля таго, як збіла расійскі самалёт, звярнулася да альянсу па дапамогу. Як і варта было чакаць, НАТА падтрымала краіну-члена, заявіўшы, што дзеянні турэцкіх узброеных сіл былі абгрунтаванымі, яны абаранялі сваю паветраную прастору. Ніхто не ўзяў на сябе працу патлумачыць, якую небяспеку для Турцыі ўяўляў сабой расійскі бамбардзіроўшчык, які бамбіў тэрарыстаў на тэрыторыі суседняй дзяржавы, нават калі сцвярджэнні Анкары праўдзівыя і ён заляцеў у турэцкую паветраную прастору пры адным з манеўраў. Сітуацыю пагоршыла тое, што сірыйскія паўстанцы змаглі збіць расійскі верталёт, які вылецеў на пошукі пілотаў, у выніку чаго загінуў яшчэ адзін вайсковец Расіі.

Якіх наступстваў можна чакаць? Ключавым момантам з'яўляецца факт атакі Турцыі як члена НАТА на самалёт ядзернай дзяржавы, якая знаходзіцца, па сутнасці, у стане халоднай вайны з НАТА і заходнім светам. І без таго напружаныя адносіны яшчэ больш ускладняцца. Расія, відавочна, будзе прагнуць помсты. Гэтага патрабуе яе статус як члена Савета Бяспекі ААН, і, што больш важна, як краіны, якая зрабіла ў апошнія два гады сур'ёзную заяўку на вяртанне сабе звышдзяржаўнага статусу. Калі яе баявыя самалёты можна беспакарана збіваць, не плацячы за гэта сур'ёзна, ад усіх прэтэнзій на новы высокі статус можна добраахвотна адмовіцца. З першых крокаў, накіраваных на ваенную адплату, можна назваць перавод крэйсера «Масква», абсталяванага сістэмай СПА «Форт», у раён у прыбярэжнай частцы Латакіі з тым, каб знішчаць усе цэлі, якія ўяўляюць для авіяцыі Расіі патэнцыйную небяспеку. Акрамя гэтага, усе расійскія бамбардзіроўшчыкі ў паветры будуць суправаджацца знішчальнікамі для праціўдзеяння новым магчымым нападам. Хочацца верыць, што ў Турцыі таксама разумеюць сэнс гэтых дзеянняў і турэцкія баявыя самалёты стануць далёка аблятаць гэты раён, інакш вялікая верагоднасць, што як мінімум адзін з іх таксама будзе збіты.

Вельмі крыўдна, што абвастрэнне адносін Расіі з НАТА адбываецца ў момант, калі нядаўна з'явіўся рэальны шанц на змякчэнне супярэчнасцяў з Захадам. Тэрарыстычныя атакі ў Парыжы паказалі актуальнасць аб'яднання ўсіх краін у барацьбе з «Ісламскай дзяржавай», і гэта магло стварыць перадумовы для пошуку кампрамісу па праблемах на Украіне, што падзяліла Расію і Захад. Але інцыдэнт у Сірыі сур'ёзна ўдарыў па магчымасці рэалізацыі ў жыццё гэтай перспектывы.

**Ключавым момантам з'яўляецца факт атакі Турцыі як члена НАТА на самалёт ядзернай дзяржавы, якая знаходзіцца, па сутнасці, у стане халоднай вайны з НАТА і заходнім светам.**

Якія яшчэ крокі можа распачаць Расія ў дачыненні да Турцыі? Цалкам відавочнымі выглядаюць захады па скарачэнні колькасці расійскіх турыстаў, якія едуць на адпачынак у гэтую краіну, або наогул закрыццё Турцыі як турыстычнага кірунку для Расіі часова або да змены турэцкага ўрада. Такі крок нанясе сур'ёзны ўдар па пазіцыях цяперашніх турэцкіх улад, паколькі турыстычная галіна з'яўляецца адной з найважнейшых для эканомікі гэтай краіны, а ў выніку такога кроку з боку Расіі працу могуць страціць дзясяткі тысяч грамадзян Турцыі. Таксама могуць разарвацца асобныя гатэлі.

Верагодныя таксама крокі па абмежаванні магчымасцяў для паставак турэцкіх тавараў у Расію. Турэцкі экспарт у Расію параўнальна невялікі, але расійскі рынак разглядаецца як вельмі важны ў перспектыве для турэцкіх экспарцёраў.

Што азначае рэзкае пагаршэнне расійска-турэцкіх адносін для Беларусі? На самай справе мала што. Шчыра спачуваючы Расіі з нагоды гібелі яе вайскоўцаў у Сірыі, Рэспубліка Беларусь будзе прытрымлівацца сваёй традыцыйнай палітыкі наладжвання максімальна спрыяльных адносін з усімі краінамі свету. Тым больш што Расія цалкам здольная самастойна разабрацца з падобнага роду праблемамі і валодае для гэтага вялікім арсеналам магчымасцяў, у адрозненне ад Беларусі. Няма ніякіх сумненняў у тым, што Расія яго выкарыстае і Турцыя панясе шкоду нашмат большую, чым сама змагла нанесці Расіі 24 лістапада.

**Сяргей КІЗІМА, доктар палітычных навук**

# «НЁМАН»: УЧОРА, СЁННЯ, ЗАЎТРА

**Часопіс «Нёман» — адно з аўтарытэтных і папулярных літаратурна-мастацкіх выданняў краіны. У юбілейныя дні карэспандэнт «Звязды» гутарыць з галоўным рэдактарам часопіса Аляксеем ЧАРОТАМ**

***— «Нёман» сустракае сваё 70-годдзе... Якія яркія, на ваш погляд, творы прыйшлі да чытача з яго старонак у апошнія 2-3 гады?***

— Мне заўсёды вельмі складана адказваць на падобныя пытанні. Бо праца рэдакцыі ў тым і заключаецца, каб з велізарнага мноства дасланых твораў адабраць самыя яркія. Пералічыць усіх сапраўды таленавітых аўтараў, якія надрукаваліся апошнім часам у часопісе, у рамках інтэрв'ю, вядома ж, немагчыма. Але назваць хаця б некалькіх, хоць і астатнія не менш значныя, думаю, варта. У прозе гэта Алена Папова, Алег Ждан, Фёдар Конеў, Вера Зялёнка, Зінаіда Краснеўская, Уладзімір Саламаха, Андрэй Федарэнка, Уладзімір Сцяпан, Юрый Пелюшонак, Дзмітрый Федаровіч, Вікторыя Сінюк, Сяргей Лапцэвіч, Алена Карповіч, у паэзіі — Георгій Кісялёў, Лізавета Палеес, Алесь Разанаў, Віктар Шніп, Алесь Бадак, Міхаіл Пегасін, Людміла Клачко і многія іншыя.

***— А ўвогуле для пачатку гутаркі і такое, некалькі правакацыйнае пытанне... Ці не зжыла сябе форма «тоўстых» літаратурна-мастацкіх часопісаў?***

— Трэба сказаць, што ў апошні час гэтае пытанне стала даволі актуальным не толькі ў нашай краіне. Абмяркоўвалася яно і ў друку, і на сустрэчах супрацоўнікаў рэдакцыі з аўтарамі і чытачамі. Так, тыражы літаратурных часопісаў падаюць, цікавасць да сур'ёзнай літаратуры слабее... Таму і ўзнікае пытанне: ці патрэбны наогул падобныя папяровыя выданні? Мой адказ адназначны — яны неабходныя. Інфармацыйная прастора сёння перанасычана «творамі» самых розных жанраў. Кожны, у каго ёсць грошы або спонсар, без праблем можа выдаць кнігу і надрукаваць усё, што заўгодна. У інтэрнэце незлічоная колькасць сайтаў, дзе таксама любы, хто ўмее пісаць, хай нават з памылкамі, мае магчымасць размясціць свае, як ён лічыць, таленавітыя творы. Але як непадрыхтаванаму чытачу разабрацца ў гэтым багацці, як адрозніць літаратуру ад слаўеснага смецця? Вось тут і прыходзяць на дапамогу часопісы, у якіх працуюць адукаваныя, дасведчаныя рэдактары, здольныя не толькі «аддзяліць зерне ад жыцца», але і дапамагчы аўтару «адшліфаваць» твор. Таму зараз асноўная задача літаратурных часопісаў — быць своеасаблівым арыенцірам, эталонам літаратурнага густу. І лепш, калі такіх часопісаў будзе больш. Бо якімі б аб'ектыўнымі мы сябе ні пазіцыянавалі, у кожнай рэдакцыі, кожнага яе супрацоўніка, ёсць свая пазіцыя, свае перавагі, свае палітычныя погляды, якія, хочам мы таго ці не, уплываюць на наш выбар. У сілу такога збольшага суб'ектыўнага падыходу аднаму выданню намаляваць рэальную карціну стану сучаснай літаратуры немагчыма. Толькі сабраныя ў адзінае цэлае такія фрагменты могуць стаць дакладным адлюстраваннем літаратурнага працэсу. Але ў сувязі з усім гэтым узнікае яшчэ адно пытанне: у якім выглядзе сёння павінны існаваць «тоўстыя» літаратурна-мастацкія часопісы? Зразумела, што заставацца толькі ў папяровым варыянце ў век бурнага развіцця інфармацыйных тэхналогій яны не могуць. Вядома, трэба ісці ў нагу з тэхналогіямі, перамяшчацца ў інтэрнэт-прастору, займаць сваю нішу ў ёй. Але часопісы на паперы ўсё роўна застануцца і ў хуткім часе стануць чымсьці элітарным, чытаць іх будзе прыкметай адукаванасці і добрага густу. Я ў гэта веру.


Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

***— Як часта выступаюць у «Нёмане» пісьменнікі з іншых краін? Ці з'яўляецца гэта часткай рэдакцыйнай палітыкі часопіса?***

— Ніводны нумар часопіса не выходзіць без замежных аўтараў. Справа ў тым, што пасля спынення існавання часопіса «Всемирная литература», які да 2009 года выходзіў у Беларусі, яго функцыі ўзяў на сябе «Нёман». Гэта нават не рубрыка, а часопіс у часопісе. Толькі за апошні час у ім былі апублікаваны ўпершыню перакладзеныя на рускую мову творы Германа Гесэ, Барбары Пім, Жоржа Сімянона, Ірэн Неміроўскі, Джо Алекса, Джузэпэ Кулік'я, нашы чытачы мелі магчымасць пазнаёміцца з сучаснай нямецкай, дацкай, сербскай, кітайскай літаратурай. Ёсць у нас і рубрыка «Сябрына», у якой мы знаёмім з літаратурай краін блізкага замежжа — Расіі, Украіны, Казахстана, Малдовы... Матэрыялы гэтай рубрыкі займаюць значнае месца на сайце «Выдавецкага дома «Звязда» ў раздзеле «Сугучча. Літаратура і публіцыстыка краін Садружнасці» (www.sozvuchie.zviazda.by), дзе прадстаўлены ўсе краіны, што ўваходзяць у СНД. Ні адна нацыянальная літаратура не можа існаваць сама па сабе. Мастацкі пераклад — неад'емная частка любой культуры. Бо менавіта дзякуючы яму адбываецца ўзаемаабагачэнне, развіццё літаратурнага працэсу. Мы выдатна гэта разумеем, і проста не маем права пазбаўляць чытачоў магчымасці знаёміцца з мастацкімі дасягненнямі блізкіх і далёкіх народаў. Таму часопіс і надалей будзе надаваць вялікую ўвагу гэтай тэме, а на яго старонках будуць з'яўляцца творы замежных пісьменнікаў, артыкулы пра іх і літаратурнае жыццё розных краін.

***— У «Нёмана», наколькі аб гэтым можна меркаваць па старонках часопіса, цесныя партнёрскія сувязі з пісьменнікамі розных расійскіх рэгіёнаў. Але ж там таксама выходзяць свае рэгіянальныя літаратурна-мастацкія часопісы. Чым вы кіруецеся, выбудоўваючы такія сувязі?***

— Сапраўды, мы працуем не толькі з беларускімі аўтарамі, у часопісе даволі часта друкуюцца і расійскія. Прычым мы прадстаўляем не толькі рускіх пісьменнікаў, вялікая ўвага надаецца і літаратурам народаў, што ўваходзяць у склад Расійскай Федэрацыі. Бо руская літаратура ствараецца не толькі ў Маскве, таленавітыя аўтары жывуць ва ўсіх кутках велізарнай краіны: Калінінградзе, Санкт-Пецярбургу, Краснадары, Махачкале, Уфе, Іркуцку, Магадане, Архангельску, Казані, Новасібірску, Арэнбургу, Варонежы, Туле і г.д. А мы імкнёмся прадстаўляць літаратурны працэс ва ўсёй яго разнастайнасці. Бо толькі па публікацыях «Нашего современника» або «Нового мира» нельга скласці цэласную карціну рускай літаратуры. Ды і ў расійскай глыбінцы не заўсёды ёсць магчымасць пазнаёміцца з сучаснай беларускай літаратурай. Таму мы супрацоўнічаем не толькі з пісьменнікамі з розных куткоў Расіі, але і з рэгіянальнымі выданнямі, што дае нам магчымасць больш даведацца пра іх, а ім пра нас. Для «Нёмана» ўжо стала добрай традыцыяй рабіць сумесныя нумары з расійскімі літаратурнымі выданнямі. У розны час нашымі партнёрамі былі «Аврора», «Вологодский лад», «Сибирские огни», «Балтика» і іншыя.

***— Планы «Нёмана» на заўтра... Што цікавага ў партфелі часопіса, чым збіраецеся прыцягваць чытача ў бліжэйшых нумарах, у 2016 годзе?***

— У першую чаргу, вядома, добрай літаратурай. Хуткім часам мы плануем надрукаваць творы Аляксандра Сялецкага, Уладзіміра Арлова, Віталя Жураўскага, Генадзя Аўласенкі, Леаніда Левановіча, Раісы Дзэйкун, Фёдара Гурыновіча, Юрыя Мацюшкі, Вікі Трэнас, Георгія Барташа, Таццяны Купрыянец. У «Нёмана», як і ў любога літаратурнага выдання, натуральна, ёсць сваё кола аўтараў. Але некаторыя публікацыі з'яўляюцца нечаканымі нават для рэдакцыі. Бывае, прынясіць што-небудзь зусім невядомы аўтар, які нідзе раней не публікаваўся, і мы разумеем, што гэта адкрыццё. Як тут утрымацца, ставім у бліжэйшы нумар. Спадзяюся, такія сюрпрызы чакаюць нас і ў наступным годзе. Плануем удзяліць пабольш увагі і часопіснай публіцыстыцы. У апошні час наспела даволі шмат тэм, у тым ліку і не зусім літаратурных, якія нельга абысці ўвагай. У першым паўгоддзі нашы аўтары выкажуць свой пункт гледжання на тое, што адбываецца ў грамадстве. Акрамя таго, трэба нешта рабіць і з літаратурнай крытыкай, якая становіцца ўсё менш прыкметнай і перастае выконваць сваю функцыю — аказваць уплыў на літаратурны працэс. Я лічу, што гэта сур'ёзная праблема, якую трэба вырашаць. У бліжэйшы час мы збіраемся прыцягнуць да абмеркавання гэтага пытання вядомых літаратуразнаўцаў, крытыкаў, пісьменнікаў. Нельга забываць і пра тых, хто чытае нас у інтэрнэце. Хуткім часам плануецца запуск абноўленага сайта нашых выданняў, вядзецца праца па стварэнні старонак часопіса ў сацыяльных сетках. Спадзяемся, хутчэй гэта робіцца недарэмна, і цікавасць да сур'ёзнай літаратуры будзе расці ў тым ліку і дзякуючы часопісу «Нёман».

**Гутарыў Максім ІГНАЛЬСКІ.**

■ Цэны вабяць

## ЗНІЖКІ ДА 90%

### 29 лістапада ў сталічных крамах можна будзе выгадна закупіцца

**Акцыя «Адзіны дзень зніжак» ужо стала праходзіць па ўсёй краіне, некаторыя спецыяльна чакаюць яе, каб адправіцца па глабальныя пакупкі. У якія мінскія крамы і гандлёвыя цэнтры можна будзе завітаць у апошнюю нядзелю лістапада?**




Як паведамляе сайт Галоўнага ўпраўлення спажывецкага рынку Мінгарвыканкама, зніжкі пакупнікам на ўсе нехарчовыя тавары будуць прадастаўлены ва універмагах «ЦУМ «Мінск» — тут абяцаюць зменшыць кошты на 17%. Гандлёвы дом "На Нямізе" і універмаг «Беларусь» парадуюць пакупнікоў 20-працэнтнымі зніжкамі, а «Кірмаш» і «Бліскавіца» скінуць 15%.

ГУМ, «Інтэрпартнёр», «Севяранка» абяцаюць зменшыць кошты на 20% на тавары асобных вытворцаў. А «Лянок» прадастаўляе зніжку 20% на ўсе тавары.

Далучаецца да распродажу і гандлёвы цэнтр «Сталіца». Крамы ў ім прапануюць зніжкі ад 15 да 90% на золата, срэбра, гадзіннікі, біжутэрыю, мужчынскае і жаночае адзенне, абутак, цацкі для дзяцей і інш. Апроч таго, шэраг магазінаў уступіць 20% ад коштаў на ўсе тавары.

**Дзіяна СЕРАДЗЮК.** *seradzyuk@zviazda.by*

**ИЗВЕЩЕНИЕ**
**о проведении 09 декабря 2015 года повторных торгов с условиями по продаже имущества, принадлежащего ОАО «Электромодуль»**

| Сведения о предмете торгов (продаваемом имуществе) | | | |
|---|---|---|---|
| № | Наименование, характеристики и местонахождение продаваемого имущества | Начальная цена без НДС, бел. руб. | Размер задатка, бел. руб. |
| 1. | «Градирня», инв. номер в ЕГРНИ 630/С-73770, расположенная по адресу: Минская обл., Молодечненский р-н, г. Молодечно, ул. Великий Гостинец, 143 | 339 571 500 | 34 000 000 |
| 2. | «Склад с рампой» общей площадью 1106,2 кв.м, инв. номер в ЕГРНИ 630/С-73942, расположенный по адресу: Минская обл., Молодечненский р-н, г. Молодечно, ул. Великий Гостинец, 143/5 | 826 500 000 | 83 000 000 |

**Продавец имущества:** ОАО «Электромодуль», ул. Великий Гостинец, 143, 222310, г. Молодечно.

**Организатор торгов:** УП «Минский городской центр недвижимости», ул. К. Маркса, 39, к. 10, 220030, г. Минск.

**Условие торгов**: победитель торгов (покупатель) течение 3 рабочих дней со дня проведения торгов оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона, в размере 3 процентов от цены продажи предмета торгов.

Торги проводятся в соответствии со ст.ст. 417, 418 Гражданского кодекса Республики Беларусь и порядком проведения аукциона по продаже имущества, принадлежащего ОАО «Электромодуль», утвержденным организатором торгов.

К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, внесшие задаток и заключившие соглашение с организатором торгов о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона по соответствующему предмету торгов, а также представившие организатору торгов следующие документы:

заявление на участие в аукционе (по форме, установленной организатором торгов); заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона (по форме, установленной организатором торгов); копию свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); копию устава (для юридических лиц); копию платежного документа о внесении задатка (задатков); документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица; а также, при необходимости, иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

*Задаток (задатки) перечисляется на расчетный счет УП «Минский городской центр недвижимости» № 3012104971019 в региональной дирекции №700 ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, код 153001369, УНП 190398583 в срок, установленный для приема документов на участие в аукционе.*

Торги проходят в форме открытого аукциона с условиями на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором торгов. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов, а наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах торгов и не включает НДС. В ходе торгов участники могут предлагать свою цену за продаваемое имущество в соответствии с порядком проведения аукциона.

В случае, если торги признаны несостоявшимися в силу того, что заявление на участие в них подано только одним участником или для участия в них явился только один участник, предмет торгов продается этому участнику (покупателю) при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Оплата стоимости приобретенного имущества с учетом НДС осуществляется победителем торгов (покупателем) в порядке, предусмотренном в договоре купли-продажи.

Договор купли-продажи между продавцом и победителем торгов (покупателем) заключается в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов.

Торги проводятся **09 декабря 2015 года в 12.00** по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Прием документов, а также консультации по вопросам участия в торгах осуществляются **с 27.11.2015 по 07.12.2015 включительно** в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.45) по адресу: г. Минск, ул. К.Маркса, 39, каб. 6.

**Телефоны для справок:**
**(017)327-48-36 (УП «Минский городской центр недвижимости»)**
**(0176)74-72-04 (ОАО «Электромодуль»).**

**Дэпутаты і работнікі Сакратарыята Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь выказваюць глыбокае спачуванне загадчыку аддзела па забеспячэнні дзейнасці Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па нацыянальнай бяспецы Броннікаву Андрэю Сяргеевічу ў сувязі з напаткаўшым яго горам — смерцю МАЦІ.**

■ Партнёрства

## БЕЛАРУСЬ — КІТАЙ: ШЛЯХІ ДА ЎЗАЕМАРАЗУМЕННЯ

**Больш за 200 навукоўцаў з Беларусі, Расіі і Украіны стануць удзельнікамі VI Міжнароднай навуковай канферэнцыі «Кітайская цывілізацыя ў дыялогу культур», якая распачынаецца сёння.**

Удзельнікі абмяркуюць шырокі спектр пытанняў, у адпаведнасці з якімі будуць працаваць сем секцый: «Кітайская мова ва ўмовах глабалізацыі», «Кітайская культура: нацыянальная традыцыі і сучаснасць», «Знешняя палітыка КНР: гісторыя і сучаснасць», «Эканоміка КНР у XXI стагоддзі і яе значэнне ў сучасным свеце» і іншыя. Арганізатарамі навуковага форуму выступілі Рэспубліканскі інстытут кітаязнаўства імя Канфуцыя БДУ, кафедра мовазнаўства і краіназнаўства Усходу факультэта міжнародных адносін Белдзяржуніверсітэта і Мінскі гарадскі навукова-педагагічны цэнтр «Тайген». У канферэнцыі возьмуць удзел старшыня таварыства дружбы «Беларусь — Кітай» Анатоль Тозік, намеснік дырэктара Рэспубліканскага інстытута кітаязнаўства імя Канфуцыя БДУ Лю Сулін і іншыя.

**Надзея НІКАЛАЕВА.** *nikalalaeva@zviazda.by*

## Соцыум

# ЦЯЖКАЕ ВЯРТАННЕ



**Не сакрэт, што парадкі ў папраўчай установе рэзка адрозніваюцца ад заведзеных у звычайным жыцці. Але якім бы працяглым ні быў турэмны тэрмін, рана ці позна ён заканчваецца. Вельмі важна, каб чалавек знайшоў сваё месца па той бок кратаў.**

### КРОК НАСУСТРАЧ

— Вось ужо каля двух гадоў у краіне мы рэалізуем праект «Інтэграцыя былых асуджаных у грамадства», — гаворыць яго **менеджар Максім МУХА**. — Праводзіцца ён пры фінансавай падтрымцы Еўрапейскага саюза ў партнёрстве з Міністэрствам унутраных спраў. Праект ставіць на мэце паляпшэнне доступу асуджаных і былых зняволеных да медыцынскіх паслуг, аднаўленне сямейных сувязяў, аказанне дапамогі ў прафесійнай арыентацыі. Ён рэалізуецца ў Магілёўскай вобласці ў трох папраўчых установах. Праект разлічаны на працу з людзьмі на працягу года: паўгода да вызвалення і паўгода — пасля. На кожнага чалавека складаецца асабісты рэінтэграцыйны план, дзе і пазначана, як з ім працаваць. За два гады мы заключылі 58 дагавораў з былымі зняволенымі, але з намі засталіся толькі 43.

Сярод валанцёраў, якія дапамагаюць спецыялістам Чырвонага Крыжа, ёсць нямала людзей, якія выйшлі з-за кратаў. Яны і дапамагаюць у індывідуальным суправаджэнні чалавека на волі, які за час, праведзены ў калоніі, прывык жыць па камандзе. Робіцца гэта для таго, каб павысіць самастойнасць і адказнасць за свае дзеянні.

— Для многіх вялікай праблемай становіцца адсутнасць магчымасці зрабіць тэлефонны званок, — працягвае Максім Муха. — Ёсць людзі, у якіх няма грошай нават на тое, каб купіць талончык. Хтосьці не можа выйсці на вуліцу, бо ў яго няма цёплага адзення... Здавалася б, звычайныя жыццёвыя праблемы, якія вырашаюцца, але ж для тых, хто ўжо выйшаў на волю ці вось-вось пакіне месца зняволення, гэтыя перашкоды здаюцца невырашальнымі. Праект гэты неўзабаве завершыцца. Праз яго прайшло больш за сто чалавек. Назапашаны намі вопыт дазваляе сцвярджаць, што рэсацыялізацыя пры такім індывідуальным суправаджэнні адбываецца хутчэй і больш якасна.

### ПАД КАНТРОЛЕМ

Мяркуецца, што ён будзе скіраваны на прафілактычную працу з людзьмі, якіх раней прыцягвалі да крымінальнай адказнасці. Зараз 36% злачынстваў у Мінску прыпадае на рахунак рэцыдывістаў. Праўда, пяць гадоў таму лічба была яшчэ большая, даходзіла хіба не да паловы.

— Сярод рэцыдывістаў вялікая колькасць тых, хто не працуе, — заўважае **намеснік начальніка аддзела наглядна-выканаўчай дзейнасці ГУУС Мінгарвыканкама Дзмітрый КУЛАГІН**. — Гэта мы і лічым адной з прычын паўторных злачынстваў. І таму мы прапануем цэнтралізаваць намаганні па працаўладкаванні такіх людзей. Да 2009 года з раней судзімымі асобамі працавалі розныя падраздзяленні. З 2010-га ўся гэтая работа кантралюецца аддзелам наглядна-выканаўчай дзейнасці. І гэта дае плён. Прааналізаваўшы ўласны вопыт працы з такімі людзьмі, мы прапанавалі Камітэту па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Мінгарвыканкама стварыць асобнае падраздзяленне па рабоце з раней судзімымі асобамі. Ініцыятыву нашу падтрымалі.

Таксама, на думку Дзмітрыя Кулагіна, неабходна стварыць аддзяленне па рэсацыялізацыі на базе Дома начнога знаходжання асоб без пэўнага месцажыхарства. За 10 месяцаў бягучага года праз яго прайшлі 39 раней судзімых асоб, з іх траціна здзейсніла паўторныя злачынствы. Як правіла, яны ўхіляліся ад адбывання пакарання, прэвентыўнага нагляду.

— Сярэдні статыстычны партрэт чалавека, які вярнуўся з месцаў пазбаўлення волі і трапіў да нас, можна ахарактарызаваць адным словам — утрыманец, — кажа **намеснік дырэктара Дома начнога знаходжання Ларыса ВАЛАШЧУК**. — Не гатовы такія людзі жыць у нармальным грамадстве, ім патрэбен пэўны адаптацыйны перыяд. Ды і іх знаходжанне ў нас можа справакаваць канфлікты. Разам з тым на аднаго чалавека прыпадае толькі 2,1 «квадрата» метраў плошчы. Сутыкаюцца з вялікімі праблемамі і псіхолагі, якія працуюць з былымі асуджанымі. Часцей за ўсё гэта ўчарашнія выпускнікі, з якімі колішнія вязні паводзяць сябе нахабна.

### ПАТРАБАВАННІ І МАГЧЫМАСЦІ

**Намеснік начальніка аддзела праграм сацыяльнай занятасці Камітэта па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Мінгарвыканкама Марына ШАХЛОВІЧ** зазначае невысокую матывацыю былых зняволеных да працы:

— Па дапамогу аб працаўладкаванні былыя асуджаныя звяртаюцца да нас вельмі часта. Зараз у нас такіх 280 чалавек. Але праблема ў тым, што палова тых, хто да нас прыйшоў і стаў на спецыяльны ўлік, пасля кудысьці знікаюць. Гэта значыць, прыйшлі да нас па даведку аб рэгістрацыі ў службе занятасці — і на гэтым усё. Людзей з даведкай аб вызваленні, якія хочуць працаваць, мы ўладкоўваем. Звычайна на гэта патрабуецца каля двух месяцаў. Справа ж у тым, што і наймальнік хоча ўзяць на працу чалавека беспраблемнага.

Асаблівасць псіхалогіі многіх былых зняволеных у тым, што іх патрабаванні па вакансіях і зарплаце не адпавядаюць іх магчымасцям. Нават працоўная кваліфікацыя за гады знаходжання за кратамі мае вельмі вялікія шанцы страціцца. Што ўжо казаць пра тых, у каго, акрамя школьнага атэстата, іншай адукацыі няма зусім. Такім людзям застаецца прапаноўваць вакансіі грузчыкаў ці дворнікаў. За адным выключэннем — калі яны самі жадаюць атрымаць працоўную кваліфікацыю. Часта выбіраюць будаўніцтва ці зварачныя работы.

### НА ВОЛЮ — З ДЫПЛОМАМ ВНУ

Частка зняволеных пры гэтым вучыцца, яшчэ знаходзячыся ў калоніі. Сёння магчыма атрымаць 28 рабочых спецыяльнасцей. І гэта яшчэ не ўсё — 14 жанчын у папраўчай калоніі №4 дыстанцыйна вучацца ў Мінскім інавацыйным універсітэце па спецыяльнасцях «псіхалогія», «юрыспрудэнцыя», «менеджмент».

— Адметна, што студэнткі аплочваюць сваё навучанне самі, — адзначае **намеснік начальніка ўпраўлення арганізацыі папраўчага працэсу дэпартамента выканання пакаранняў МУС Аляксандр КРАЛЬКО**. — Але такі «дыстанцыйны» праект рэалізуецца ў нашай сістэме ўпершыню. Калі ён акажа станоўчы ўплыў на тых, хто знаходзіцца за кратамі, мы паспрабуем распаўсюдзіць яго і на тыя папраўчыя ўстановы, дзе адбываюць пакаранне мужчыны. Апошнім часам туды трапляюць студэнты, якія асуджаны па артыкулах, звязаных з незаконным абарачэннем наркотыкаў. І калі яны працягнуць вучыцца, шанцы на тое, што хутка знойдуць працу пасля вызвалення, узрастаюць.

**Валяр'ян ШКЛЕННІК.**
*schklennik@zviazda.by*

## Далікатная тэма

# ЖЫЦЦЁ БЕЗ ГВАЛТУ

## Праблема насілля над дзецьмі патрабуе пільнай увагі

**Кожная 4-я дзяўчынка і кожны 6-ы хлопчык у свеце можа знаходзіцца ў сітуацыі сексуальнага гвалту. У Беларусі ад яго церпяць каля 10% дзяцей, а ўвогуле ад фізічнага пакарання — да 27% малых (па выніках даследаванняў дзіцячага фонду ААН ЮНІСЕФ).**



«Далёка не ўсе нашы суайчыннікі ўспрымаюць гэта адпаведным чынам», — лічыць **Андрэй МАХАНЬКО, старшыня міжнароднага грамадскага аб'яднання «Разуменне»**, якое ўжо 15 гадоў абараняе дзяцей, стварае для іх сяброўскае сацыяльнае асяроддзе і дапамагае пацярпелым.

*— Важнае дасягненне сумеснай працы «Разумення» і адпаведных ведамстваў краіны — гэта прызнанне аўдыя- і відэазапісаў размоў — апытанняў пацярпелых дзяцей спецыяльна падрыхтаванымі псіхолагамі — у якасці доказнай базы ў судзе. Гэтая норма 11 чэрвеня афіцыйна замацавана ў Крымінальна-працэсуальным кодэксе Беларусі,* — паведаміў ён. — *Цяпер неабходна замацаваць заканадаўча рэкамендацыю апытваць ахвяру гвалту толькі адзін раз, каб захаваць псіхіку дзіцяці, а таксама якасць яго паказанняў, якія з кожным допытам становяцца ўсё менш праўдзівымі з прычыны асаблівасцей узросту малых.*

Яшчэ адна заканадаўчая ініцыятыва аб'яднання — прызнаць бездапаможным узрост да 12 гадоў, бо дзіця, якое не дасягнула гэтай мяжы, яшчэ не можа аказаць супраціўленне і не разумее поўнасцю характар некаторых дзеянняў у дачыненні да сябе.

У якасці прафілактычных і папераджальных мер рэкамендуецца крыміналізаваць такія праявы гвалту, як заляцанне дарослых да дзяцей і калекцыяніраванне дзіцячай парнаграфіі.

### ПРАД'ЯВІ МІНУЛАЕ!

«Разуменне» таксама прапануе зрабіць абавязковай заканадаўчай нормай праверку мінулага ўсіх асоб, што працуюць з дзецьмі, на наяўнасць недапушчальных дзеянняў сексуальнага характару. Пакуль айчынным працадаўцам толькі рэкамендуецца высвятляць гэта ў прэтэндэнта на працу з дзецьмі.

*— Мы прапануем прыняць ва ўсіх установах Беларусі, у першую чаргу адукацыйных, правілы абароны дзяцей ад гвалту,* — дадаў Андрэй Маханько. — *Гэта тыпавыя і ўніверсальныя рэкамендацыі, як абараніць дзіця, як арганізаваць рэагаванне на гвалт. Яны, дарэчы, падыходзяць пры праявах знявагі ў любых установах, а не толькі ў школах ды садках.*

**«Неабходна замацаваць заканадаўча рэкамендацыю апытваць ахвяру гвалту толькі адзін раз, каб захаваць псіхіку дзіцяці, а таксама якасць яго паказанняў».**

### КАЛІ ЗЛАЧЫНЦА — САМ ДЗІЦЯ...

Акрамя гвалту з боку дарослых, дзеці могуць падвяргацца дзеянням «сексуальнага злоўжывання» з боку аднагодак, якія не дасягнулі ўзросту крымінальнай адказнасці — 14 гадоў. На думку старшыні «Разумення», трэба альбо зніжаць планку ўзросту крымінальнай адказнасці, скажам, да 13 гадоў; альбо змяшчаць малалетніх злачынцаў у спецыяльныя рэабілітацыйныя цэнтры. Сучасныя закрытыя ўстановы для непаўналетніх не прыстасаваны да такой катэгорыі дзяцей.

*— Неабходна інфармаваць дзяцей аб спосабах неканфліктнага вырашэння сітуацый пры пераследзе іх з боку равеснікаў,* — дадаў старшыня «Разумення». — *Тлумачыць, як наладжваць адносіны, каб такіх выпадкаў не было, як паводзіць сябе пры адкрытай пагрозе. Настаўнікам не лішнім будзе напамінаць аб адміністрацыйнай адказнасці за магчымае замоўчванне эмацыянальна-псіхалагічных злачынстваў. Патрэбна працаваць і з бацькамі пацярпелых, бо яны не ведаюць, як паводзіць сябе і што рабіць, калі іх дзіця было згвалтавана.*

Стараючыся дапамагчы, трэба не забывацца і аб згубным уплыве на дзіцячую псіхіку занадта шырокага афішавання таго, што здарылася.

### АДЗІНАЯ МАДЭЛЬ АБАРОНЫ

У 2012 годзе «Разуменне» вырашыла адкрыць Нацыянальны цэнтр абароны дзяцей, у якім бы дзейнічала адзіная мадэль абароны ад гвалту для ўсіх катэгорый малых. Скрадзеных, згвалтаваных, зацкаваных равеснікамі, бездапаможных...

Аднак, як часта бывае, справа ўперлася ў грошы. Каб вырашыць праблему, аб'яднанне распачало ў інтэрнэце філантрапічны праект 10K-4-10.org — глабальную кампанію па прыцягненні ахвяраванняў для стварэння цэнтра. Стваральнікі сайта спадзяюцца, што добрая справа не застанецца незаўважанай.

**Ірына СІДАРОК**


Центр Промышленной Оценки
• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

| | |
|---|---|
| Организатор аукциона | **ЗАО «Центр промышленной оценки»,** г. Минск, ул. Мележа, 5/2, офис 1703 |
| Продавец | **Гражданин Республики Беларусь Минько А.В.** |

**Лот № 1**

- Здание мастерской с бытовым корпусом, инвентарный номер 602/С-40977, общ. пл. 2572,8 кв.м;
- Склад-навес теплоизоляционных материалов с инвентарным номером 602/С-40976;
- Водонапорная башня (бак-аккумулятор) с инвентарным номером 602/С-41281;
- Сеть канализации с инвентарным номером 602/С-40973, протяженность – 9,4 м;
- Сеть водопровода с инвентарным номером 602/С-40974, протяженность – 16,5 м;
- Электрическая сеть с инвентарным номером 602/С-40975, протяженность – 2,84 м;
- Тепловая сеть с инвентарным номером 602/С-41578, протяженность – 57,3 м

**Адрес:** Минская обл., Пуховичский р-н, Дричинский с/с, 1 (бывшая промплощадка Минской ТЭЦ 5)

**Сведения о земельном участке**: Кадастровый номер: 624400000001000650. Площадь (га): 1,3000
Категория: земли промышленности, транспорта, связи, энергетики, обороны и иного назначения.
Целевое назначение: обслуживание зданий и сооружений промплощадки. Земельный участок предоставлен на праве постоянного пользования Частному предприятию «МАВ-Недвижимость»

**Начальная цена – 540 000 долларов США**

**Лот № 2**

Изолированное помещение с инвентарным номером: 630/D-41119, расположенное по адресу: Минская обл., Молодечненский р-н, г. Молодечно, ул. Язепа Дроздовича, 1-98, общей площадью 457,4 кв.м. Наименование: изолированное помещение №2 (торговое помещение). Назначение: торговое помещение

**Начальная цена – 200 000 долларов США**

**Задаток 10%** от начальной цены предмета аукциона (Лота) в белорусских рублях по курсу Нацбанка РБ на дату платежа перечисляется на р/с № 3012343260010; нерезидентами РБ в валютном эквиваленте по курсу Нацбанка РБ на дату платежа на в/с: в долларах США (USD) – 3012343265044; в евро (EUR) – 3012343265060; в российских рублях (RUB) – 3012343265028; в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области (г. Минск, ул. Коллекторная, 11), код 153001739, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

**Срок подписания договора купли-продажи: 10** рабочих дней после снятия в установленном законодательством порядке обременения (ипотеки)

**Условия оплаты предмета аукциона**

Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5%) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты за предмет аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение **30 (тридцати) календарных дней** после подписания договора купли-продажи

Оплата за предмет аукциона производится резидентами РБ в белорусских рублях по курсу Нацбанка РБ на дату платежа; нерезидентами РБ в белорусских рублях, либо в иностранной валюте по курсу Нацбанка РБ на дату платежа, в порядке, предусмотренном в договоре купли-продажи

Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, а также оплаты вознаграждения и возмещения затрат за организацию аукциона победителем аукциона, оговорен в **Условиях его проведения**, размещенных на сайте организатора торгов **www.cpo.by**

| | |
|---|---|
| Дата и время проведения аукциона | **29.12.2015 в 14.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, офис 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»** |
| Дата и время окончания приема документов | **28.12.2015 до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, офис 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»** |
| Контактные телефоны | **Тел.: +375 17-280-36-37; +375 29-183-69-71. E-mail: auction@cpo.by** |

Сямейная газета

Выпуск № 19 (42)



Фота Надзеі БУЖАН

## ДРАЎЛЯНАЯ МІСКА

Напярэдадні дня нараджэння мама перадала нам з мужам новы двухспальны плюшавы плед. На заўтра з самага ранку патэлефанавала і запыталася, як нам пад ім спалася. Я шчыра прызналася, што мы вырашылі яго прадаць... Ну не аматары мы плюшу з кветкамі, і нічога з гэтым не зробіш. Па голасе пачула, што мама засмуцілася. У выніку — я таксама, паўдня хадзіла сама не свая. За абедам падзялілася сваімі перажываннямі з сяброўкай. Аказалася, я такая не адна...

«Мая мама таксама пастаянна перадае ўнуку розныя старамодныя абноўкі. Толькі і паспяваю перадорваць ды раздаваць. Але ж я, у адрозненне ад цябе, не расказваю ёй пра гэта. Наадварот, нахвальваю тыя падарункі, кажу, што ўсё носім. Пры гэтым для пераканаўчасці прыдумляю на хаду, з чым спалучаю тую ці іншую рэч. І ты, — раіць, — гэтак жа рабі. Сказала б: «Ой, як нам цёпла спаць пад тваім плюшавым пледам». Толькі ўяві, як бы яна ўзрадавалася!» — «А калі мама прыедзе і запытаецца, дзе ён?» — «Ну скажы, што ў шафе. Альбо ў кватэры стала цёпла, дык адвезлі да сяброў, бо ў іх вялікі дом, там месца больш». — «Гэта ж хлусня» — «Дык «во благо» ж».

Я тады быццам бы пагадзілася з ёй. Уявіла, што кажу маці, як нам цёпла, як яна радуецца і... у думках ужо набываю на апошнія грошы новае пакрывала (ну, ці нешта іншае, «плюшавае»), каб зноў нас «парадаваць».

І што зноў давядзецца хлусіць? «Дык «во благо» ж!» І тут лаўлю сябе на думцы, што па-беларуску «блага» — гэта «дрэнна». Уяўляю сябе на месцы сваёй маці, сваіх будучых дзяцей... І пасля гэтага я буду іх вучыць, што хлусіць нельга?!

Адзін чалавек на старасці гадоў пераехаў жыць да сына. Дзядуля быў вельмі слабенькі, у яго дрыжалі рукі і затуманьваўся зрок. За сталом ежа пастаянна вывальвалася з лыжкі на падлогу, а калі ён спрабаваў узяць шклянку, малако пралівалася на абрус. Тады сын і яго маладая жонка выдзелілі дзядулю месца за печкай, куды падавалі яму ежу. Адтуль стары сумна глядзеў на сямейнікаў, якія збіраліся за агульным сталом, і вочы яго рабіліся вільготнымі. Аднойчы ён не змог утрымаць талерку і тая разбілася. Маладая гаспадыня пачала сварыцца на старога. А той толькі цяжка ўздыхнуў. Тады сын з нявесткай купілі дзядулю драўляную — самую танную з тых, што знайшлі, — міску. Цяпер ён павінен быў есці з яе.

Аднойчы, калі маладыя бацькі сядзелі за сталом, у пакой увайшоў іх пяцігадовы сын з кавалкам дрэва ў руках. «Што ты будзеш рабіць з гэтым паленам?» — запытаўся бацька. «Драўляныя міскі, — адказаў малы. — Адну — для цябе, другую — для мамы, каб, калі я вырасту, вам было з чаго есці».

Тым жа вечарам сын беражліва ўзяў бацьку пад руку і правадзіў да стала. А нявестка села побач, каб дапамагчы свёкру есці больш ахайна, выціраючы яго мокры падбародак ручніком. Да канца сваіх дзён дзядуля займаў сваё месца за агульным сталом, і больш ніколі ні ў сына, ні ў яго жонкі не выклікалі абурэння ні разлітае малако, ні запэцканы абрус...

Недарма ж мудрацы раяць: «Не выхоўвай дзяцей, усё роўна яны будуць падобныя на цябе. Выхоўвай сябе».

...Каб цалкам развеяць свае перажыванні, я не прыдумала нічога лепшага, як патэлефанаваць маці і шчыра запытацца: «Што ты выбіраеш — горкую праўду ці салодкую хлусню?» Яна выбрала праўду... А той плюшавы плед мы ўсё ж такі вырашылі падарыць бабулі мужа, чым супакоілі і парадавалі маму. Вова кажа, што і бабуля абрадуецца!

**Надзея ДРЫЛА.**

■ Насуперак стэрэатыпам

# ЖЫЦЦЁ ПА-ЗА МЕЖАМІ ПЯСОЧНІЦЫ



Стэфанія і Януш «фотамадэляць» услед за мамай...

**Музыкант, аўтар, выканаўца, пераплётчык, каліграф, вышывальшчыца, гістарычны рэканструктар, мадэль, гісторык, рэлігіязнаўца. Страшна падумаць — усё гэта адзін чалавек. І зусім ужо неверагодна, што чалавек гэты, да ўсяго пералічанага, яшчэ і мама. Больш за тое: сваіх дзяцей яна робіць актыўнымі ўдзельнікамі творчага жыцця і падарожжаў у часе. Імя гэтай дзівоснай жанчыны — Кацярына Ваданосава.**

**Цікавая іх з мужам, Сяргеем Бураком, гісторыя знаёмства. На той час Кацярына ўжо спявала ў гурце «Alta Mente». «Сябар-аднакурснік прывёў Сяргея на рэпетыцыю, калі ад нас сышоў папярэдні гітарыст. Маўляў, нічога так хлопец грае, паглядзіце на яго — раптам падыдзе...» Сёння яны гадуюць чатырохгадовую Стэфанію і паўтарагадовага Януша.**

**На прыкладзе гэтай сям'і можна абвергнуць Талстога з яго сцвярджэннем, што ўсе шчаслівыя сем'і шчаслівыя аднолькава.**

...і разам з ёю.



***— Кацярына, пра сваю дзейнасць вы самі сказалі так: «Ствараю музыку, граю, спяваю. Працую рукамі ды сэрцам ва ўласнай майстэрні. Фотамадэлю перыядычна. Гадую дзяцей». І дзеці тут на апошнім месцы. У жыцці так, відавочна, не атрымліваецца...***

**Кацярына:** — Проста заняткі размешчаны па ўзрастанні значнасці!.. Калі сур'ёзна, нельга сказаць, што дзеці — гэта ружовае свята. Так, узнікаюць праблемы, часу становіцца меней: я ўжо не належу сабе ў той ступені, у якой хацелася б. Але любыя бацькі пагодзяцца — яно таго варта.

***— Возьмем адцягнены прыклад: маладая актрыса вагаецца — абраць кар'еру, што пачала ўдала складвацца, ці завесці дзяцей, якіх таксама хочацца. Што б вы ёй параілі?***

**К:** — Ёй, пэўна, трэба паглядзець на сваё атачэнне. Калі ёсць надзейны муж, блізкія людзі, якія дапамогуць, то няма і праблем. І ўсё ж, калі чалавек задумваецца: «Ой, што мне рабіць? Ці не рана заводзіць дзяцей?» — пэўна, сапраўды ранавата. Што тычыцца мяне, некалькі месяцаў пасля нараджэння Стэфы я не ведала, як мне жыць, што рабіць, і часам здавалася, што асабістае жыццё скончана. Але ўсё залежыць ад светаўспрымання, ад міру з сабой і асяроддзем. Вядома, нечым даводзіцца ахвяраваць. Але ахвярнасць — не тое слова: дзеці даюць табе значна больш, чым ты — ім.

*(Заканчэнне на 4-й стар. «СГ».)*

■ У вас будзе дзіця

# ЛЁШКАВЫ ФАНТАЗІІ

**На жаль, ёсць дзеці, якім пакуль няма каму сказаць запаветных слоў «мама» і «тата», а яны так мараць пра гэта. «Вы можаце стаць іх светам, а яны вашым шчасцем», — звяртаецца да патэнцыйных усынавіцеляў і апекуноў Людміла Бусько — вядучая тэлевізійнай рубрыкі «У вас будзе дзіця», што выходзіць на канале АНТ у рамках праграмы «Пакуль усе дома». Аўтары гэтага беларуска-расійскага праекта робяць вельмі важную справу — дапамагаюць дзецям, якія засталіся без бацькоўскай апекі, адшукаць новыя сем'і. Як вынік — 64 адзінокія сэрцы ўжо змянілі сцены дзіцячых дамоў на цяпло і ўтульнасць сямейнага ачага. «Звязда», што таксама бярэ ўдзел у праекце, працягвае знаёміць сваіх чытачоў з маленькімі героямі рубрыкі, якім трэба адначасова так шмат і так мала — бацькоўскі клопат, пяшчота і любоў.**



У Ждановіцкім дзіцячым доме сваіх будучых бацькоў чакае ўсмешлівы хлопчык Лёша. Яго галоўныя якасці, як кажуць педагогі, — дабрыня і жыццялюбства.

— У нашага Лёшкі — дзіцячы цэрэбральны параліч, таму яму складана хутка бегаць і танцаваць, — распавядае **настаўнік-дэфектолаг Юлія САЎКО**, — але гэта не замінае яму весела і энергічна ў такт музыцы рухаць рукамі. Хлопчык вельмі любіць спяваць і чытаць вершы — стараецца быць як усе. Ён вельмі кантактны, дружалюбны і вясёлы. З яго тварыка практычна ніколі не знікае ўсмешка. Лёша вельмі цікаўны. Любіць, калі яму чытаюць кнігі, ахвотна глядзіць тэлевізар. А яшчэ ён аматар фантазіраваць. Часам можа расказваць пра нейкіх жывёл, якія не існуюць у прыродзе, сяброў, якія заўсёды побач з ім. Гэта вельмі цікава і захапляльна. Акрамя таго, Лёша надзвычай уражлівы. Бачылі б вы, колькі радасці было ў яго вачах пасля нядаўняй паездкі ў заапарк і дэльфінарый! З якім захапленнем ён расказваў пра розных жывёл, што там бачыў!

Хлопчык вельмі любіць гуляць з іншымі дзецьмі. У гульні ён стараецца выбраць для сябе ролю галоўнага героя. Але часам яму хочацца пабыць аднаму, тады ён забіраецца ў домік у спальні і марыць там. Магчыма, проста ляжыць і пра нешта думае, але нам, педагогам, хочацца верыць, што марыць. Пра маму, тату, сваю будучую сям'ю, новы дом, дзе яму будзе цёпла і ўтульна і дзе яго будуць шчыра любіць.

***Калі вы хочаце даведацца пра Лёшу больш, патэлефануйце па нумары: (017) 284-71-51 — спецыялістам Нацыянальнага цэнтра ўсынаўлення Міністэрства адукацыі. Таксама для тых, хто хоча ўсынавіць дзіця, на сайце videopassport.ru змешчаны відэакурсы, падрыхтаваныя сумесна НЦУ і творчай групай праекта.***

# АРФЫ БЕЗ СТРУН І МУЗЫКАНТ БЕЗ ПРАЦЫ

## Чаму арфіст, які можа раз'язджаць з канцэртамі па ўсім свеце, жыве на адну пенсію?

**«У Глеба ідэальны слых. Складаныя музычныя дыктоўкі ён піша выдатна. Можа сыграць на арфе твор для фартэпіяна: мала хто з музыкантаў так умее. Але ў аркестр на працу яго не бяруць. Дыплом патрабуюць. А ў Глеба яго няма». У цеснай старэнькай кватэры Таісія Папова распавядае гісторыю свайго сына. Пакой, дзе мы гутарым, напоўнены музыкай. У прамым сэнсе: інструменты — два фартэпіяна і шэсць арфаў — займаюць амаль усё месца. Старэйшы сын Таісіі Фёдараўны, 48-гадовы Глеб, выконвае для нас на арфе эцюд. У мужчыны аўтызм. І, нягледзячы на тое, што яго талент не аднойчы адзначалі на сусветных конкурсах і фестывалях, асноўнымі слухачамі Глеба застаюцца суседзі...**

### ПРЫВАТНЫЯ ЎРОКІ Ў МАСКВЕ

Музыка для Паповых — сямейная прафесія. Таісія Фёдараўна скончыла кансерваторыю, вывучылася на арфістку. Яе муж быў трубачом, працаваў у ваенным аркестры Германіі (сям'я жыла ў Нямеччыне ў 1970-х гадах. — **Аўт.**).

— Глеб хадзіў у звычайную мінскую школу, — расказвае жанчына. — Паралельна скончыў дзве музычныя, па класе фартэпіяна і арфы. Мне прапаноўвалі перавесці яго ў спецыяльную. Я сказала, што ніколі гэтага не зраблю. Яго класная настаўніца тады заявіла: «Або я, або Папоў». У выніку сышла яна. Глеб тры гады ў восьмым класе адсядзеў. Няважна...

Апошнія гады хлопец давучваўся ў вячэрняй школе. Потым паступіў у музычнае вучылішча Глінкі ў Мінску. Але хадзіў туды толькі год. «Па спецыяльнасці ў Глеба было пяць, а па ўсіх астатніх прадметах (фізіцы, матэматыцы, хіміі) — два. Разумееце як? Замежная мова яшчэ добра давалася. Настаўніца сама гэта адзначала. А потым, як і ўсе, два паставіла. Згаварыліся... Дырэктар казаў: «Няхай бы былі ўсе тройкі, тады мы трымалі б». Яго выгналі. І ў гэтым жа годзе Глеба заўважылі на Усесаюзным аглядзе навучэнцаўарфістаў музычных школ».

Таісія Фёдараўна разумела, што талент сына трэба развіваць. Гадоў дваццаць вазіла яго на прыватныя ўрокі ў Маскву да вядомых выкладчаў. Раніцай прыязджалі на цягніку ў горад, займаліся — калі за грошы, калі бясплатна — і назад у той жа дзень. Дарога тады, па ўспамінах жанчыны, куды танней каштавала, можна было сабе гэта дазволіць. Калі ездзілі да прафесара Наталлі Барысаўны Сібар, спыняліся ў яе. Жылі там тыднямі (Таісія Фёдараўна ў музычнай школе працавала і на вакацыі «перасялялася» з сынам у Маскву. — **Аўт.**).

— У Сараджавай быў, у Дулавай быў... — жанчына пералічвае педагогаў, якія займаліся з Глебам. — Нам прапаноўвалі паступаць у маскоўскую кансерваторыю. Адмовіліся. Можа, дарэмна? Адукацыя там бясплатная была. Але ж Глебу давялося б асобна жыць у інтэрнаце, самому думаць пра харчаванне. Гэта складана. Ён замкнёны чалавек. Сын неяк хадзіў у нашу беларускую акадэмію. Студэнтам былі патрэбны вучні, і Глеба запрасілі, каб на ім практыкавацца. Хаця адна з выкладчыц тады сказала: «Вучыцеся ў яго, як трэба іграць на арфе».

### ЗА КАМПЛЕКТ СТРУН — 600 ЕЎРА

Першая арфа ў Паповых з'явілася ў 1991 годзе. Калі завялі размову пра інструменты, Глеб, маўклівы дагэтуль, ажывіўся.

— У нас увогуле раней ніводнай не было, а цяпер шэсць, — мужчына з усмешкай яшчэ не раз будзе паўтараць гэта.

— Ён нават маленькім любіў арфу, — узгадвае маці. — Напэўна, таму што чуў гэтую музыку яшчэ да нараджэння. Я, калі цяжарнай была, на апошнім курсе ў кансерваторыі вучылася, мне трэба было шмат іграць.

Адну арфу Паповым падарыла знаёмы музыкант з Вільнюса, другую — самі набылі. Яшчэ чатыры з'явіліся ў іх доме, калі музычныя школы пачалі спісваць інструменты, бо струны мяняць стала дорага. У савецкі час іх замаўлялі ва Украіне, у Палтаве. Цяпер набываюць за мяжой. Камплект — 600 еўра. Нейлонавыя струны таннейшыя, але найлепшыя — дарагія жыльныя. Таісія Фёдараўна расказвае, што яны часам звычайную лёску купляюць. З усіх арфаў, што стаяць у Паповых, рабочыя толькі дзве. Астатнія стаяць без струн.

— Адрамантаваць арфу — цэлае выпрабаванне, — дзеліцца праблемамі жанчына. — У Мінску майстроў я не ведаю. Калі спатрэбілася паправіць інструмент, вазілі ў Пецярбург. На цягніку, асобны квіток для арфы куплялі.

**«Глебу ў чатыры гады паставілі дыягназ шызафрэнік. Мама адваявала, каб дыягназ знялі. Вельмі шмат сіл у гэтай маленькай жанчыне».**

Тым часам прыйшоў малодшы сын Таісіі Фёдараўны — Дзмітрый. Ён, у адрозненне ад брата, атрымаў сярэднюю адукацыю (іграў на флейце. — **Н.Л.**). Цяпер працягвае займацца музыкай. Больш у тэхнічным плане: працуе гукарэжысёрам. Дзмітрый памятае, як у школьныя гады даводзілася заступацца за брата:

— Дзеці вельмі дрэнна ставіліся да яго. Глеб для іх быў кімсьці не ад гэтага свету. Спрабавалі яго «прасаваць». У нас быў сабака, калі вучыліся. З ім выбягалі адганяць крыўдзіцеляў. Цяпер гэтыя дзеці выраслі, жывуць з намі ў раёне, цудоўна разумеюць усё. Але ў свой час трэба было змагацца. Я, напрыклад, пра аўтызм даведаўся толькі з фільма. «Чалавек дажджу» называецца. Там убачыў тое, што і дома. А Глебу ў чатыры гады паставілі дыягназ шызафрэнік. Мама адваявала, каб дыягназ знялі. Вельмі шмат сіл у гэтай маленькай жанчыне. Тады нам дапамагаў кампазітар Ігар Лучанок, маці з ім вучылася.


Арфа — складаны інструмент. А Глеб з лёгкасцю выконвае на ёй творы, напісаныя для фартэпіяна.

Глеб позна стаў размаўляць. Таісію Фёдараўну гэта і насцярожыла: «Я звярнулася да ўрачоў. Сыну далі ІІ групу інваліднасці. Адна доктарка выпісала лекі са словамі: «Скажаце потым, будзе дрэнна ці добра». Калі гэта пачула, перастала па ўрачах вадзіць. Неяк хадзілі толькі дзеля санаторыя. Больш не пойдзем. У Глеба пенсія па страце карміцеля два мільёны, у мяне свая пенсія — тры. Пакуль спраўляемся *(усміхаецца)*».

### ЗАПРАШЭННЕ НА ФЕСТЫВАЛЬ У АМЕРЫКУ

Калі пытаюся ў Глеба пра любімы твор, ён не адказвае. Проста садзіцца за арфу і пачынае іграць. На музычных фестывалях Папоў станавіўся адным з найлепшых. Так, у 1997 годзе ён заняў трэцяе месца на І Маскоўскім міжнародным конкурсе арфістаў. Апошні раз мужчына ўдзельнічаў у ім у 2010-м.

— Гэта ўжо пяць гадоў мы не ездзім? Занадта шмат для нас! — смяецца Таісія Фёдараўна. — Нядаўна нам прыйшло запрашэнне ў Лос-Анджэлес на джазавы фестываль. У Лос-Анджэлес, уяўляеце? Але як мы можам на сваю пенсію паехаць туды? Праўда, Глеб, на ўсялякі выпадак, вывучыў джазавыя творы для арфы. Цяпер у яго рэпертуары ёсць і такое!

***— А ў Мінску Глеб выступае?***

— У філармоніі два разы ў канцэртах удзельнічаў. Нават грошы яму заплацілі. Хаця і маленькія, але заплацілі... Чамусьці ў Мінску арфай не цікавяцца. Я 60 гадоў з гэтым інструментам звязана і не бачыла, каб нашы арфісты давалі ў філармоніі канцэрты на два аддзяленні.

**«Нядаўна нам прыйшло запрашэнне ў Лос-Анджэлес на джазавы фестываль. У Лос-Анджэлес, уяўляеце? Але як мы можам на сваю пенсію паехаць туды?»**

Дзмітрый завёў для брата старонку ў Facebok. Выкладае туды яго фотаздымкі, дыпломы, відэа. «Самому Глебу інтэрнэт не цікавы. Але я хачу, каб пра яго ведалі». Таісія Фёдараўна таксама старалася прасоўваць сына. Запісвала яго музыку на касеты, аддавала на радыё.

— Так, трэба трапіць на радыё, — пачуўшы пра эфір, Глеб далучыўся да размовы. — Ажаніцца час. А дзе ноты вясельнага марша? Мне трэба вывучыць марш.

У Пецярбургу музыкант атрымаў сертыфікат, які дае права раз'язджаць па свеце з выступленнямі. Засталося знайсці спонсара. «У таго ж Чайкоўскага была жанчына, якая яго забяспечвала матэрыяльна. Музыканту трэба практыкавацца. Пяць гадзін прасядзець за інструментам. А за гэта ж яму ніхто не плаціць. Сын, калі ў школу хадзіў, у пяць раніцы ўставаў. Бегаў, потым за арфу, за піяніна».

Глеб і цяпер кожную раніцу пачынае з прабежкі. Дзве гадзіны фізічных нагрузак на свежым паветры — і зноў за арфу.

— Мы нічога не плануем, — кажа Таісія Фёдараўна. — Але музыканту трэба заўсёды быць у форме. А магчымасць выступаць з'явіцца, я ў гэтым не сумняваюся. Вядома, самім неабходна праяўляць ініцыятыву. Стукацца і напрошвацца.

**Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.**
*lubneuskaya@zviazda.by*.


Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.
Таісія Фёдараўна ўпэўнена: у сына з'явіцца магчымасць выступаць.

■ Цярпенне, толькі цярпенне...

# ЧАМУ ЎЦЯКАЕ КОТ,

## або Як паводзіць сябе з гарэзам?

**«Ён у вас такі худзенькі. Вы яго кормiце?» — бедавала бабуля, што яе трохгадовы ўнучак амаль не набірае вагі. Карміць жа мы кормім. Толькі бачылі б вы гэтую справу. Наш гарэза ні хвіліны не ўседзіць на адным месцы! Лыжку ў рот — і ён падрываецца, каб паскакаць па кухні, другую лыжку — і робіць новую гімнастычную фігуру, называецца «нага вышэйшая за галаву». Неўзабаве і гэта надакучае. І я чую катэгарычнае: «Стаміўся есці». Так кожны сняданак, абед, вячэру. За час кармлення сын яшчэ паспявае перарабіць шмат «спраў». Вось і патлумачце: адкуль узяцца больш ці менш нармальнай вазе, калі дзіця ўвесь час актыўна рухаецца? З раніцы да позняга вечара. І самае цікавае, што чым больш непаседа рухаецца, тым больш ён... Не, не стамляецца, а наадварот узбуджаецца і разыходзіцца.**



Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

Актыўны сын з нараджэння. Спакойна ляжаў, хіба што калі спаў. Да таго ж сон гэты быў кароткім і нерэгулярным, але вельмі жаданым для ўсіх астатніх членаў сям'і. Пра цішыню таксама заставалася толькі марыць. Дзіця галасіла і ноччу, і днём. Мы перацягалі яго па ўсіх дактарах, упэўніліся, што здаровы. «У вас такое дзіця. Набярыцеся цярпення», — заключылі медыкі. Балазе суседзі ставіліся з разуменнем: «Крычыце сабе на здароўе».

За дзіцячым столікам малы еў абавязкова прывязаны на ўсе рамяні. І глядзі, мама, не зявай! Інакш — каша на падлозе, а дзіця выскачыць з сядзення.

Поўзаць яму адразу спадабалася: «Колькі, аказваецца, усяго цікавага вакол!» Большасць небяспечных прадметаў у доме, безумоўна, «пераехала» на самыя верхнія паліцы шафы і пасялілася там на некалькі гадоў...

Не паспеў сын яшчэ навучыцца хадзіць, як пачаў бегаць. Задзярэ галаву і наперад. Брык! Гатова. А руку каб даць? Дзе там! На шчасце, я знайшла ў дзіцячай краме спецыяльныя рамяні-лейцы для навучання хадзьбе. Гэтая вынаходка стала «страховачным тросам» падчас пераадолення «паласы перашкод». Так я жартам называла нашы прагулкі на двары.

— Трымае маму ў тонусе, — пачула я каментарый суседа. Сказаў як уцяў! У той час, як іншыя мамы размаўлялі на лаўчацы, я накручвала кругі па дзіцячых пляцоўках найбліжэйшых дамоў. Каб хоць дзесьці затрымаўся! Горка, пясочніца, пагушкаць арэлі, пракацiцца на машынцы, зноў горка...

Я добра разумела, што ўсе малыя ў пэўнай ступені актыўныя. І гэта ёсць норма. Але ж ад такога разумення не станавілася лягчэй спраўляцца з непаседам. Ні табе пасядзець крыху, ні паесці, каб не адрывацца, аб «паляжаць» я ўвогуле маўчу. Можа, я не звяртала б на такія рэчы ўвагі, але ж усё, як кажуць, пазнаецца ў параўнанні.

— Я хоць выспалася за дэкрэтны адпачынак! — хвалілася мне адна мамачка.

— Ды што там паспяваць? Я яшчэ вязаць і шыць пачала, — здзіўлялася другая.

— Мой мульцікі цэлымі днямі глядзіць, а я займаюся, чым хачу, — расказала трэцяя.

Ну, што тут скажаш, і дзеці ўсе розныя, і мамачкі, таму пра свае «прыгоды» я маўчала. Здаецца, толькі адвернешся, як гарэза выскоквае на дарогу, імкнецца патрапіць у кожную яму і дагнаць усіх дваровых катоў. Таму лепш увогуле не адварочвацца. Бо мамчыны засцярогі аб небяспецы цалкам ігнаруюцца.

Часам здаецца, што ўнутры непасед умацаваны маторчык, нібы вечны рухавічок. Яны не могуць даслухаць да канца казку, якую прасілі прачытаць. Ці на доўгі час зацікавіцца новай цацкай. Яна ўжо праз пяць хвілін можа валяцца побач з кучай іншых, таксама ўжо не цікавых. Яшчэ добра, калі цэлая.

У актыўных дзяцей настрой мяняецца па хвілінах. «Сыходзь. Ты дрэнная!» — маці не дала цукерку перад ежай. «Мамачка, любіменькая», — чуеш хутка.

Як з гэтым усім спраўляцца? Цярпенне і зноў цярпенне. Сталёвае. Не ведаю, дзе яго столькі ўзяць, але абавязкова трэба. Да таго ж неабходна зразумець: дзіця гарэзіць і капрызнічае не назло маці і бацьку, гэта асаблівасці развіцця яго арганізма.

Дарэчы, хапае і станоўчых момантаў. Актыўныя дзеці арганізуюць мам. Любіла паспаць да абеду? Перакваліфікуйся ў жаўрука! Прывыкла ўсё рабіць павольна і нетаропка — давядзецца паскорыцца, інакш праца павялічыцца ўдвая. А лішкі вагі ўвогуле не з'явяцца. Рухомыя дзеці лепшыя за любую дыету. У краме станеш «спрынтарам». Аказваецца, усё неабходнае можна купіць нават за 10 хвілін.

Распавядаць, зразумела, яшчэ можна доўга. Бо кожны дзень для непаседы — чарада бясконцых падзей. А маміна задача — каб гэтыя падзеі засталіся ў памяці толькі добрым вопытам. Цярпення вам, матулі!

**Яна ЛЫЧКОЎСКАЯ.**

■

### У БАЦЬКОЎСКІ НАТАТНІК

### 12 парад, як паводзіць сябе з гарэзам

**1.** Актыўныя дзеці не любяць доўгі час займацца адной справай, яны хутка пераключаюць сваю ўвагу. Выкарыстайце гэта. Калі дзіця адчувае боль (павалілася, пабілася) — адцягніце ўвагу ад гэтага непрыемнага моманту: «Глядзі, які смешны сабачка пабег у камбінезончыку, уяўляеш?» І неўзабаве, забыўшыся на боль, дзіця пачне ўсміхацца. Такім жа чынам можна адцягнуць ад чагосьці забароненага, пераключыць на бяспечную справу, цікавую цацку.

**2.** Каб чагосьці дамагчыся, трэба запасціся цярпеннем. Тлумачце падрабязна ўсё, што вы робіце і навошта: «Ідзём спаць, бо настала ноч, ужо цёмна на двары, усе ідуць спаць і ты таксама».

**3.** Стварыце ў доме спрыяльную атмасферу, пазбягайце рознагалоссяў, сваркі заражаюць дзіця негатыўнымі эмоцыямі. Размаўляйце спакойна, не павышайце голас. Лаянка і пагрозы могуць толькі нашкодзіць.

**4.** Не забывайцеся пахваліць сваё дзіця кожны раз, калі яно гэтага заслужыла. Нічога, калі яшчэ не вельмі добра атрымліваецца маляваць або ўзводзіць замак. Галоўнае, каб было жаданне гэта рабіць. Можна таксама стварыць сістэму ўзнагароджання. Стаўце дзіцяці зорачку за кожны добры ўчынак, а за некалькі — дарыце ласункі або падарунак. Завядзіце асабісты дзённік, дзе будзеце адзначаць з дзіцём яго поспехі і дасягненні.

**5.** Прытрымлівайцеся з усімі членамі сям'і адзінай лініі ў выхаванні. Не ўпадайце ў крайнасці: не праяўляйце то празмерную строгасць, то залішнюю мяккасць.

**6.** Не стамляйце малога ўзмоцненымі заняткамі, не прымушайце яго рабіць гэта праз сілу, бо можаце ўвогуле адбіць жаданне вучыцца чаму-небудзь. Займацца лепш у пачатку дня, а не ўвечары, урокі будуць больш плённымі. Абавязкова перамяжуйце заняткі фізкультхвілінкамі. Жвавому дзіцяці патрэбна разрадка.

**7.** Прытрымлівайцеся рэжыму: дзённы сон, ранні вячэрні адыход у ложак, прагулкі на свежым паветры, збалансаванае харчаванне, чаргаванне рухомых гульняў і спакойных.

**8.** Не рабіце празмерных заўваг. Актыўныя дзеці цяжка ўспрымаюць крытыку. Старайцеся пазбягаць слоў «нельга», «не». Замест «Не бегай па газоне» скажыце лепш «Выйдзі на дарожку».

**9.** Пастарайцеся, каб дзіця як мага менш глядзела тэлевізар, гуляла ў камп'ютарныя гульні. Гэта ўзбуджае нервовую сістэму, стамляе арганізм.

**10.** Ні ў якім разе не прымушайце дзіця сядзець на адным месцы. Лепш накіруйце празмерную энергію ў патрэбнае рэчышча, далучыце да рухомых гульняў, аддайце ў гурток ці секцыю, якую яно само абярэ. Арганізуйце дома спартыўны куток. Дайце дзіцяці права выбару: пытайцеся, чым ён хоча займацца, у якія гульні гуляць.

**11.** Размаўляйце з малым максімальна кароткімі прапановамі. Не прасіце яго адразу зрабіць некалькі спраў, тады, верагодна, не зробіць ніводнай.

**12.** І самае галоўнае, памятайце, што дзіця не вінаватае, што такое спрытнае. Яго сістэма самакантролю яшчэ не ўсталявалася. Таму з дапамогай крыку, крытыкі, прымусу, лаянкі і бясконцых пакаранняў вы нічога на даможацеся, акрамя праблем з псіхікай.

■ Вазьму твой боль...




# СА МНОЙ ТАКОЕ НЕ ЗДАРЫЦЦА

У той вечар, калі ў Парыжы адбылася серыя тэрактаў, мы з мужам хадзілі ў тэатр. Я не шкадую, што склалася менавіта так. Больш за тое, назаўтра, калі прачытала навіны, я сабрала ўсю сям'ю і павезла ў гандлёвы цэнтр па пакупкі да зімы. Далей спланавала паход у кінатэатр, а потым запісалася на трэніроўку, якую даўным-даўно адкладала. Я зрабіла ўсё, каб паказаць няшчасцю: мы збіраемся жыць далей!

На мой погляд, найлепшы адказ на тэрор, вайну і ўсеагульнае гора — гэта жыццё. Мне хочацца паказаць бядзе, што дарэмна стараецца, што нас не зламаць. Вось мы набываем цёплую куртку сыну — так, рыхтуемся да халадоў, збіраемся перазімаваць без цябе! Вось мы чытаем кніжкі — назапашваем веды, нам будзе дзе прымяніць іх, адступіся! Мы ідзём у тэатр, кіно, на трэніроўку — мы расцём і развіваемся, імкнёмся стаць лепшымі, для лепшай будучыні без цябе!

Як бы мы ні спачувалі сотням незнаёмых людзей, як бы ні падзялілі іх боль, нам трэба працягваць жыць. І менавіта зараз, калі жыццё нагадвае, што ніхто не застрахаваны і што смерць — справа выпадку, нам варта жыць на поўную моц і не прапускаць свае магчымасці.

Мы дзень у дзень робім адны і тыя ж рэчы, праводзім звыклыя рытуалы пад'ём-сняданак-работа-абед-дадому-вячэра-сон. Назіраем за тэрактамі і вайной па тэлевізары і думаем, што з намі такое ніколі не здарыцца. Заўважаем інвалідаў і хуценька адводзім вочы — гэта не пра нас. Мы дапамагаем слабейшым і лічым, што гэтым набываем імунітэт ад такой жа бяды, нас не зачэпіць.

Нядаўна ў валанцёра «Клуба 5000» маці захварэла на рак. Віялета больш за 20 гадоў аддала цэнтру дзіцячай анкалогіі. Сама ў дзяцінстве перанесла захворванне касцявога мозгу. Яна для сваіх пацыентаў сапраўдны сябар, заўсёды старaецца зрабіць больш, чым проста медык. У яе і няма нікога, акрамя маці, бо, цалкам прысвяціўшы сваё жыццё працы, так і не збудавала сям'ю. І тут — удар у спіну. Здавалася б, такім служэннем яна абараніла сябе і сваё наваколле ад цяжкага захворвання, з якім усё жыццё дапамагала змагацца іншым. З ёй гэта не павінна было здарыцца! Але так бывае.

Адначасова з Віялецінай маці такі ж дыягназ паставілі яшчэ тром супрацоўнікам анкалагічнага цэнтра. Ад гэтага немагчыма засцерагчыся. Яно можа здарыцца з любым.

Даўняя вайна, якую мы вывучалі па кніжках і кінастужках, здавалася перажыткам мінулага, архаізмам. Мы проста шанавалі яе памяць і верылі, што з намі такое не здарыцца. Але яна паступова стала вяртацца ў сучаснае жыццё. Падступалася здалёк: Сірыя, Егіпет. І неўзабаве стукнула па суседзях, нашых найбліжэйшых братах. Ва Украіне гінуць і беларусы. Да нас прыехала шмат бежанцаў, якія шукаюць жыллё, працу і проста мірнае заўтра. Вось апошняга мы, на жаль, гарантаваць не можам. Бо цяпер зусім не ўпэўнены, што з намі такое не здарыцца.

Мы не застрахаваны ад няшчасцяў. Але не можам сядзець і чакаць, пакуль бяда прыйдзе ў двор. Мы будзем супрацьўляцца, рабіць усё наадварот. Супрацьстаяць слязам можа толькі ўсмешка, перамагчы смерць здолее толькі жыццё.

Калі не стала маёй цёткі, навіна застала мяне з эпілятарам у руках. Я збіралася пагаліць ногі. Паклаўшы тэлефонную трубку, так і спаўзла ў крэсла, не выпускаючы прыбор. Толькі паспела прамовіць, пакуль не задушылі слёзы: «І што цяпер рабіць?» — «Вядома, што, — ціха і спакойна адказаў мой муж, — галіць ногі». І на той момант гэта была самая карысная парада.

Я была за 330 кіламетраў ад роднага дома, дзе рыхтаваліся да пахавання, і магла паехаць туды толькі назаўтра. А сёння мне заставалася горка плакаць, няспынна хадзіць па кватэры, заламваць рукі, кусаць локці ці... галіць ногі. Звычайныя жыццёвыя справы, якія, колькі б ні адкладаў, усё роўна калі-небудзь давядзецца выканаць, неаднаразова ратавалі мяне ў цяжкія хвіліны скрухі.

Нядаўна я пачула гісторыю пра жанчыну, якая, хварэючы на анкалогію, кожную раніцу ў бальніцы пачынала з касметычных працэдур. Яна мела вялікі запас шкляначак з крэмамі і кожны раз з задавальненнем аддавалася працэсу. Жанчыне было гадоў 80. Няшчасныя маладыя суседкі па палаце даўно аддалі свае шэрыя твары пад уладу хваробе. А яна ўсміхалася і спакойна ўцірала крэм. І гэта была яе маленькая перамога. Перамога жыцця над смерцю.

**Таццяна НЕМЧАНІНАВА,**
**заснавальніца дабрачыннага руху**
**«Клуб 5000»**

■

# ЖЫЦЦЁ ПА-ЗА МЕЖАМІ ПЯСОЧНІЦЫ



Калі не ленавацца і не баяцца, з маленькімі дзецьмі можна перанесціся нават у Сярэднявечча.

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «СГ».)*

***— Як жа вы змагаліся з дэпрэсіўным станам?***

**К:** — Ды ніяк. Само мінула. Гэта натуральная з'ява. Вось, напрыклад, і цяпер: восень, цемра, няма настрою, праз што пакутуе муж, якому я ўчыняю разносы. Але гэта пройдзе, калі, вядома, не культываваць у сабе прагу пакутніцтва, як той Том Соер, які жадаў памерці пад вокнамі каханай, і яму гэта страшна падабалася. Наўрад ці нашы прабабулі і прадзядулі раздумвалі, якое ў іх цяжкае жыццё. Часу не было. Гэта, хутчэй, праблема сучаснага грамадства, якое сядзіць і займаецца самарэфлексіяй. Займайцеся справай — і не будзе тужлівых роздумаў. Я сабе гэта кажу кожны дзень.

**Сяргей:** — І мне таксама кажа.

***— Гэтак жа ў нашых продкаў былі папулярнымі шматдзетныя сем'і...***

**К:** — У маёй прабабулі было 14 дзяцей. Але я зусім не зайздрошчу гэтай няшчаснай жанчыне, якая прахварэла ўсё жыццё і не бачыла нічога, акрамя сваёй хаты ды дзяцей. Пакуль у мяне не нарадзіўся Янік, я думала, што ўсё жыццё прасяджу ў дэкрэце, буду нараджаць, пакуль стане сіл, і ствару ідылію ў асобе дваццаці чалавек сям'і... Але, як ні горка, мы мусім арыентавацца не толькі на свае жаданні, але і на інтарэсы дзяцей, на матэрыяльны бок пытання. Няцяжка нарадзіць, і нават выхаваць няцяжка — цяжка кожнаму дзіцяці даць трывалы задатак на далейшае жыццё. І калі кожны з іх запытае: «Мама, а дзе я буду жыць?» — ты мусіш даць годны адказ.



Сяргей БУРАК: «Не раз бачыў людзей, якія ў самалётах ляталі з немаўлятамі. Галаву яшчэ не трымае, а ўжо падарожнік...»

***— Стэрэатыпная роля мужчыны ў сям'і — здабытчык, які раніцай пайшоў, увечары вярнуўся, паглыбіўся ў сабе і адпачывае. У вас, Сяргей, да працы дабаўляецца яшчэ і музыка. Не так шмату часу, здавалася б, застаецца на сям'ю. Цікава, якую ролю адыгрываеце вы ў выхаванні дзяцей?***

**К:** — Лепш я адкажу на гэтае пытанне. Мне вельмі пашанцавала. Не ведаю іншых мужчын, якія б столькі ўвагі надавалі не толькі выхаванню, але і ўзаемаадносінам з дзецьмі. Сяргей прыходзіць з працы — і я смела магу зачыніцца ў пакоі і заняцца сваімі справамі. Ніякага падзелу абавязкаў не існуе. У каго ёсць час — той і гуляе з дзецьмі, мяняе памперсы, гатуе. Як і ў кожнай сям'і, у нас здараюцца канфлікты, але датычна дзяцей папракнуць мужа няма ў чым. Ён проста ўзорны тата.

*(«Ён святы!» — чуецца голас цешчы з іншага пакоя.)*

***— Калі бацькі — музыканты, можна чакаць, што і дзеці пачнуць захапляцца музыкай...***

**С:** — Будзем спадзявацца.

**К:** — Музычнай школы ім не абмінуць, але ў межах агульнаэстэтычнага развіцця. Пакуль мне здаецца, што для Стэфаніі музыка вялікага значэння не мае. Чаго не скажаш пра Яна. Яшчэ немаўлём ён чуў мелодыю — і адразу змяняўся ў твары, у паводзінах. Калі схільнасць пацвердзіцца, мы, вядома ж, зробім для яго ўхіл на музычную адукацыю.

Стэфанія ходзіць у тэатральную студыю, і кажуць, у яе вельмі добра атрымліваецца. Так ці іначай, яны самі вырашаць, што ім трэба. Дзеці не такія дурныя, як некаторыя думаюць.

***— Дарэчы, бачыла адзін фотасэт з удзелам Стэфаніі...***

**К:** — Яе вельмі любяць фатографы. Калі прыходзіш на здымкі з дзіцем, думаеш, будзе замінаць, а потым ты стаіш недзе ўбаку, а здымаюць яго. Калі такое здарылася ўпершыню, я непакоілася: «Ай, Божачкі, Стэфачка бедненькая будзе плакаць, баяцца». А Стэфачка дала мне фору. Я была вельмі ўражана, калі ёй казалі: «Складзі вось так ручкі, сядзь вось так...» — і яна слухалася. Каб жа так было дома!..

***— Кацярына, вы беларускамоўная. Цікава, якое значэнне надаеце мове ў выхаванні дзяцей?***

**К:** — Гэтае пытанне балючае. Я хацела выхаваць дзяцей у межах білінгвізму, аддаць Стэфачку ў беларускамоўны садок ці хоць бы групу. У нашым раёне знайшоўся толькі адзін садок з адной такой групай. І там мне сказалі: «Ну, у нас иногда дети учат белорусские слова... Если вы выступите инициатором и уговорите родителей, мы вам устроим белорусскоязычную группу». Зразумела, у той час, калі не было такой «канцэнтрацыі» беларускамоўных людзей, мне гэта было не па сілах. І ўзнікла праблема: ці маё дзіця будзе парыяй, ці мы пераходзім на рускую мову. Зараз мне збольшага даводзіцца гаварыць са Стэфай па-руску. Бо па-беларуску яе не разумеюць. І што б там ні казалі, быццам дзецям усё роўна... Не, яны бываюць вельмі жорсткія і могуць адштурхнуць ад сябе дзіця, якое звяртаецца да іх на незразумелай мове. Беларускія кнігі, канцэрты, музеі — так і мірымся з сітуацыяй.

**«Так ці іначай, яны самі вырашаць, што ім трэба. Дзеці не такія дурныя, як некаторыя думаюць».**

***— Што датычыцца вашага захаплення «хэнд-мэйдам»: калі з'явіліся дзеці, не прыйшло жаданне рабіць лялькі, цацкі, дзіцячую вопратку?..***

**К:** — Не, але адчулася невымоўная прага да творчасці. Зрэшты, такое часта бывае: ці не кожная другая мама ў дэкрэце займаецца пэўным відам рамесніцтва.

***— Вы ўдзельнічаеце ў гістарычных фестывалях...***

**К:** — Так, але ў асноўным у якасці музыкантаў. Перыядычна запрашаюць правесці майстар-класы па пераплётнай справе: мне вельмі падабаецца ўзнаўленне гістарычных тэхнік і тэхналогій стварэння кніг. Часам раблю паказальныя выступленні — узнаўляю тэхналогію кнігастварэння таго стагоддзя, якому прысвечаны фестываль.

***— А як часта вы выбіраецеся куды-небудзь усе разам?***

**К:** — Вельмі часта! Пагуляць, выехаць па справах у горад, да сяброў на вяселле — толькі з дзецьмі. Цяпер, калі ў нас з'явілася машына, праблем увогуле няма. А вось раней... Калі едзеш на грамадскім транспарце на той жа гістарычны фестываль у Мір, у спёку +30 — і аўтобус зламаўся... Вось гэта быў квэст, на які яшчэ раз рашыцца вельмі цяжка.

***— Калі пастаянна разам — не стамляецеся?***

**К:** — Не. І я зусім не крыўлю душой: калі іду куды-небудзь адна, пастаянна думаю: «А як там мае дзеці?». І мне заўсёды падаецца, што яны сядзяць ды плачуць: «Дзе наша мама?». Здараецца раз на паўгода, калі з малымі застаецца мая мама, а мы з мужам ідзём адрывацца... Але я, відаць, не зусім люблю рабіць гэта ў той ступені, як прынята цяпер. І ніколі не любіла.

***— Значыць, у вас схільнасць да сямейнага жыцця?..***

**К:** — Проста не люблю забавы, папулярныя ў сучаснай моладзі. Напрыклад, ніколі ў жыцці не хадзіла на дыскатэку. Мне гэта нецікава. Я магу схадзіць на выставу, у музей, зноў жа наведаць фестываль — усё гэта магчыма рабіць з дзецьмі. Разам мы былі на канцэртах, а адзін я нават вяла з дзіцём на руках. Адыграць канцэрт за два тыдні перад родамі — гэта я таксама магу.

***— Самая экстрэмальная сітуацыя, якая здарылася ў вас разам з дзецьмі...***

**К:** — Якраз падарожжа ў Мір. Мне вельмі хацелася трапіць на гістарычны фестываль, «выгуляць» новую сукенку, і я сказала: «Усё, муж, мы едзем». З малой Стэфкай на руках падаліся на аўтавакзал. Квіткоў на аўтобус ужо не было, узялі на рэйс праз пару гадзін. Спёка. Аўтобус зламаўся, нас не хочуць везці далей — але давезлі. Стэфка крычыць. Пайшлі з ёй у кавярню, каб накарміць супам. Потым дачка ўдарылася галавой. Пасля мы сталі шукаць, як з'ехаць з гэтага Міра, бо заначаваць не рашыліся — удзельнікі жылі ў рэаліях XIII стагоддзя, без усякіх там тэхналогій і памперсаў. Там, дарэчы, Стэфка ад іх і адвучылася.

Але і тут усе квіткі раскуплены. На нейкай папутцы, з кучай народу, седзячы адно ў аднаго на галовах, мы даехалі да электрычкі ў Стоўбцах. Потым, на электрычцы, дабраліся дадому — апоўначы...

***— Пасля такога, пэўна, ужо нікуды не хацелася выязджаць.***

**К:** — Як сказаў мой муж, «Каця, у цябе шыла ў адным месцы, прычым скіраванае ў бок навакольных». Так што я не толькі сябе пастаянна кудысьці ганяю, але і іншых.

***— А вам з такой актыўнай жонкай цяжка не бывае?***

**С:** — Заўжды. Дужа цяжка. Каця ставіць для сябе высокую планку і для астатніх не нізкую, тым больш для мяне. І я пастаянна «касячу». І няспынна ідзе праца над памылкамі.

***— З першага погляду на вашую сям'ю можна сказаць, што Кацярына — лідар...***

**С:** — Так! «Стары падабцаснік схапіўся за сэрца, але строгі погляд жонкі прымусіў яго пражыць яшчэ 20 гадоў» *(смяюцца)*.

**«Займайцеся справай — і не будзе тужлівых роздумаў. Я сабе гэта кажу кожны дзень».**

**К:** — Я кажу яму: «Давай, муж, будзь лідарам!». А ён адказвае: «Сям'я — справа сумесная». Сяргей у сваім юнацтве шмат у што нагуляўся. У тое, чаго мне не хапіла. Таму цяпер яму часта хочацца пасядзець спакойна, паглядзець кіношку, а я прачынаюся кожны ранак і думаю: «Так. Жыццё мінае. Трэба зрабіць тое, тое і тое. А то хутка нічога ўжо не зраблю!». Вядома, я бачу, што яго гэта напружвае. Але з кім ажаніўся...

**С:** — Чаму ж. Я не ў прэтэнзіі.

**К:** — Бачыце — поўная сямейная ідылія.

***— Са з'яўленнем дзяцей ці з'явіліся ў вас сяброўкі — маладыя мамы?***

**К:** — Зацыклівацца на прыгатаванні супу і распавядаць штодзень у адной і той жа пясочніцы адны і тыя ж рэчы... Мяне гэта стамляе. Не тое, каб я пазбягала жанчын, якім гэта цікава, але сама такой зрабіцца не хачу. Пры гэтым лічу: калі чалавек знаходзіцца у гэтым шчасце — цудоўна! Але кожнаму сваё.

***— Якая на сёння геаграфія сямейных падарожжаў?***

**К:** — Па ўсёй Беларусі, пара разоў — Літва. Але гэта, вядома ж, не канец.

**С:** — Да трох гадоў чалавек успрымае столькі ж інфармацыі, колькі пасля цягам усяго жыцця. У Заходняй Еўропе я часта бачыў людзей, якія ў самалётах ляталі з немаўлятамі. Галаву яшчэ не трымае, а ўжо падарожнік.

**К:** — Можа падацца, што мы зусім вар'яты, цягнем дзяцей, куды не трэба. Безумоўна, калі ў мамы з татам ёсць галава на плячах, яны не возьмуць малога ў холад, у дождж, мароз... Але калі вы не баіцеся ўласных дзяцей, то і падарожжа з імі — не страшнае. Напрыклад, летась, калі Яну было ўсяго тры месяцы, мы ездзілі на чарговы гістарычны фестываль — і нічога. Дзеці вельмі ўражлівыя і пазітыўна ўспрымаюць свет. Не трэба думаць, што ім дастаткова ўласнай вуліцы і адной пясочніцы. Чым больш вы ім пакажаце, тым больш удзячныя яны будуць пасля.

**Гутарыла Наста ГРЫШЧУК.**





Кацярына Ваданосава часам паказвае тэхналогію кнігастварэння таго стагоддзя, якому прысвечаны фестываль.

# ДА СТАРЫХ МАГІЛ

**Трапіць у гісторыю і ў гісторыі застацца — гэта, як вы разумееце, рэчы розныя. Але згадзіцеся, смеху варты той падарожнік, які не прагне трапіць у гісторыю як чыстай вады авантуру, выпраўляючыся наведаць тых, хто застаўся ў гісторыі як спісе слаўных і не вельмі падзей, іх прычын, наступстваў і ацэнак.**

**І вось яшчэ што. Выпраўляючыся ў падарожжа да тых, хто застаўся ў гісторыі, мы звычайна едзем да іх, як навечна жывых. І значна радзей наведваем іх магілы.**

Калі па аздобленай безліччу сучасных невялікіх палацаў і парачкай маляўнічых вадаёмаў «бетонцы», што злучае Рубяжэвічы з Дзяржынскам, ад'ехаць ад апошняга ў бок першага на літаральна восем кіламетраў (ад першага ў бок апошняга будзе дванаццаць, калі вы едзеце «не ў той бок») і спыніцца ля ўказальніка, які якраз такі кіламетраж і канстатуе, то... Можна трапіць на выцягнуты ўздоўж дарогі ўзгорак, парослы з аднаго боку бэзам, з другога — маладымі стройнымі бярозкамі. Прыкметны ён не толькі тым, што ля ўзведзенай на ім каплічкі-ратонды — «помніка стылізатарскай архітэктуры з элементамі неаготыкі» — фатаграфаваўся, седзячы ў траве, Уладзімір Караткевіч. Тут, на ўзгорку, стаяла калісьці царква. Пабудавана яна была даўно, яшчэ ў 1756-м, на сродкі пані Анэлі. Апошняя, нарадзіўшыся Анжалікай Мянчынскай, спачатку пабралася шлюбам з самым злосным з усіх Радзівілаў Еранімам Фларыянам. А калі аўдавела і зноўку пашлюбілася, то ператварылася ў княгіню Варанецкую, якой былы дзевер, Міхал Казімір Радзівіл Рыбанька, даверыў кіраванне Койданаўскім графствам. Кіравала пані Анэля не вельмі, але не пра тое размова. Царква, збудаваная на яе сродкі, называлася Рудзіцкай — ад назвы блізкай вёскі. Асвечана была як Праабражэнская. *«Будынкам драўляная, на каменным фундаменце, з адасобленай званіцай»,* — пішацца ў дакументах. Вы будзеце стаяць перад гэтым узгоркам, успамінаючы гэтыя словы, і бачыць бачыць гэтую царкву на свае вочы. Бо такі чароўны той узгорак.

Яшчэ літаральна летась тут ляжаў, «дагары нагамі» перакулены і напалову ў зямлю ўрослы, пашкоджаны часам і кулямі чорны помнік. *«Прохожий, помни о кончине своей, помолись о душе моей»,* — чыталі на яго паверхні цікаўныя і зацікаўленыя, ускараскаўшыся на ўзгорак, хутчэй, дзеля таго, каб зірнуць на капліцку — фамільны склеп паноў Дыбоўскіх, чым на гэты няшчасны помнік. Другі надпіс на ім амаль не чытаўся. Хіба што мясцовыя жыхары, памятаючы тэкст яшчэ з дзяцінства і з часу, калі ён не быў так моцна пашкоджаны, маглі працытаваць яго на памяць: *«Вот он лежит, отец наш милый, но он не наш уже, увы. Умолк язык его унылый, уста сомкнулись для молвы. Но наше сердце помнит, знает, что наши души его спасают. Привет из гроба вам, друзья, привет тебе, семья моя».* Узор эпітафіі пачатку XX стагоддзя, калі смерць яшчэ лічылася часткай жыцця, яе велічным, высакародным фіналам.



Капліца-пахавальня Дыбоўскіх.

## Рамантыкам

*Наўрад ці вы знойдзеце ў бэзавых зарасцях хаця б адзін экзэмпляр Lucanus maculifemoratus Dybowskii, жука-аленя. Гэты самы вялікі ў беларускай фаўне жук жыве ў вялікіх дубровах. Але звярніце ўвагу на частку відавога імя: Луканус макуліфемаратус Дыбоўскага. Маецца на ўвазе доктар Бенедыкт, вядомы навуковец мінулага, даследчык флоры і фаўны нашай і іншых зямель. Тыя Дыбоўскія, пра якіх ідзе тут размова, і доктар Бенедыкт, як і яго брат Уладзіслаў, таксама батанік, заолаг і палеантолаг, — людзі з аднаго роду. Магілу Уладзіслава можна знайсці на Навагрудчыне, каля Любчы. Мы, памятаю, выпраўляліся на яе пошукі разам з Міхаілам Карповічам, вядомым у Любчы краязнаўцам і вельмі нераўнадушным да падарожнікаў чалавекам.*

Помнік гэты быў усталяваны на магіле айца Уладзіміра Елісеевіча Квяткоўскага — настаяцеля Рудзіцкай царквы, памерлага ў 1908-м. Вядома нават, дзе і кім ён быў выраблены. *«И.Мехедко. Мінскъ губ. Сторожевская ул. д. 64»,* — выбіта на баку помніка.

Апошні надпіс стаў заўважным летась, калі перакулены і ўрослы ў зямлю помнік паднялі і адрэстаўрыравалі. Тады ж адкрыліся вачам выкананыя з таго ж каменю крыж і біблія, «пакладзеныя» на вяршыню помніка. Цяпер на ўзгорку, дзе была царква, стаіць самы сапраўдны алтар, перад якім можна маліцца, просячы аб заступніцтве і дапамозе. Помнік праляжаў перакуленым больш за сем дзясяткаў гадоў, магіла некалі была разрабавана. Цяпер сюды прыносяць кветкі. І я не дарэмна пісала з самым пачатку, наколькі варта падарожнікам прагнуць трапляць у авантурныя гісторыі, асабліва звязаныя з магілкамі і крыжамі: надмагілле святара адноўлена з нашай «падарожнай» ініцыятывы пад уздзеяннем здабытай у архіве інфармацыі на сродкі жыхароў вакольных вёсак.

А інфармацыя сапраўды ўражвала. Найперш — нечаканай дакладнасцю. Калі вы падарожнічаеце не толькі дзеля цікаўнасці, але і для таго, каб рабіць свету добрыя справы, выпраўляйцеся паміж вандроўкамі ў архівы. Вось што нам далі там кліравыя ведамасці.

Уладзімір Елісеевіч Квяткоўскі нарадзіўся ў сяле Морач Слуцкага павета ў сям'і святара ў 1849-м. Скончыў Мінскую духоўную семінарыю з атэстатам другога разраду. Спачатку настаўнічаў, выкладаў Закон Божы. Святаром пачаў служыць з 1874-га. Рудзіцкая царква, у якую ён быў пераведзены ў 1876 годзе, стала яго пятым і апошнім месцам службы. Тут айцец Уладзімір разам з мясцовым панам, Антоніем Яленскім (мужам Сабіны з тых самых Дыбоўскіх, капліца якіх стаіць побач), будаваў і адкрываў царкоўна-прыходскую школу. Тут недалёка і жыў — з жонкай Марыяй Міхайлаўнай, трыма сынамі і дзвюма дочкамі. Назначаны быў благачынным, за што аднойчы, у 1902-м, указам Кансісторыі за нумарам 4886 *«в награду прослужения с особенным усердием двенадцати лет сряду всемилостивейше сопричислен к императорскому ордену Святой Анны третьей степени».*

Вось яно як.

Магіла айца Уладзіміра тут не адзіная. У бэзавых зарасцях за капліцай таксама трапляюцца помнікі. Перакуленыя і без надпісаў. Магілы ў большасці разрыты, пра што сведчаць прамавугольныя ямы. Узгорак з капліцай Дыбоўскіх — любімае месца «паломніцтва» чорных капальнікаў. Магчыма, менавіта для гэтых «герояў» нашага часу больш за сто гадоў таму на чорным помніку з крыжам і Бібліяй было напісана: «Прохожий, помни о кончине своей...»

**Падарожнічала Святлана ДЗЯНІСАВА.**





Помнік айцу Уладзіміру Квяткоўскаму. Раней і цяпер.

## Паслядоўнікам

*Уваход у капліцу Дыбоўскіх апошнім часам забіты дошкамі. З аднаго боку, добра: менш смецця і розных спакусаў. З другога — шкада: няма магчымасці прасякнуцца таямніцамі, якія капліца дагэтуль хавае. Нішы ў ёй, як вы здагадваецеся, таксама разбураны. Але палічыць іх можна: пахаванняў было восем. Цяпер ужо невядома, хто дакладна знайшоў свой апошні прытулак там. Але вядома, што ў спісе землеўладальнікаў Мінскай губерні (крыніца — «Издание Минского губ. стат. комитета») пад прозвішчам Дыбоўскіх значацца: Сабіна (імя па бацьку Леапольдаўна, у дужках Яленская), Эмілія, таксама Леапольдаўна, Канстанцін, па бацьку зноў жа Леапольдавіч, як і ўсе астатнія, а менавіта — Фабіян, Юзэф, Юстын і Ян. Вы падлічылі іх колькасць? Сем чалавек, ці не так. Ну, а восьмы — сам Леапольд. Але гэта так, здагадкі...*

*А калі спусціцца з узгорка на процілеглы ад «бетонкі» бок, на поле, можна, стоячы на ім, заўважыць падазрона роўную, ідэальна круглай формы пляцоўку дыяметрам не менш як добрая арэна. Што б гэта магло быць?..*

## ■ Што бывае

# НАЗІРАННІ

➤ *Якой бы ўтульнай ні была сядзіба, з якой бы гістарычнай дакладнасцю ні была яна адноўлена і музеефікавана, а вока падарожніка, асабліва ўжо трохі «замыленае», нязменна ўдзячнае іншаму: не гэтай гістарычнай дакладнасці, не рарытэтным рэчам кшталту нейкага там звышрадкага пісьмовага ці туалетнага прыбора, а... Смяяцца будзеце — часам так прываблівають кветкі на падаконніках, што астатняе быццам перастае існаваць. Не трэба тут чытаць між радкоў, што экспанаты, маўляў, нецікавыя. Проста трэба аддаць належную ўвагу тым людзям, якія ўмеюць так дамовіцца з пурпурным дрэвападобным эоніумам ці, скажам, плектрантусам Эртэндаля, што тыя выглядаюць як расліны, якія дакладна бачылі Тадэвуша Касцюшку ці Адама Міцкевіча — настолькі раскідзістыя іх сцябліны і настолькі зайздросная іх «шавялюра». Сядзібная флора мінулых стагоддзяў — чым не тэма для сур'ёзнага даследавання? І ці не самая дакладная крыніца для ўзнаўлення інфармацыі — палотны тагачасных мастакоў. Паглядзіце, як выглядае ампельны Senecio rowleyanus на карціне Івана Хруцкага «У пакоі». Між іншым,1854 год.*

## ДАЛЁКА І БЛІЗКА

**Калі 29 лістапада апынецеся ў Анталіі, ведайце, што там адбываецца: міжнародны кінафэст «Залаты апельсін» пачынаецца якраз у гэты дзень. Гісторыя ў яго слаўная — пачатак вядзе ад 1964-га. Як вядома, кінафэст — мерапрыемства не толькі культурнае, але і свецкае. Таму не толькі прафесіяналам ад кіно там так цікава...**

Кірмашы Сен-Нікаля, правобраза французскага Дзеда Мароза, пачынаюцца ў Францыі! Самы старадаўні — з 1570 года — ладзіцца ў Страсбургу. Вам абавязкова трэба будзе пакаштаваць там гарачага віна і мяккіх пернікаў. І першае, і другі — з пахамі сапраўднага свята, без якога ніяк нельга трапіць у новы год жыцця. Самыя незвычайныя калядныя кірмашы ладзяцца ў Кёльне. Шмат дзівосаў можна ўбачыць, у шмат якіх забаўках паўдзельнічаць, шмат новага пачуць, калі да 26 снежня трапіць на набярэжную ля мясцовага музея шакаладу.



**Фестываль стваральнікаў радавых маёнткаў — гэта і сур'ёзнае мерапрыемства статусу «канферэнцыя», і проста забаўляльны марафон: з кірмашом і танцамі, гульнямі, карагодамі і канцэртам. 28 лістапада ў Івянецкім доме культуры. Пачатак апоўдні.**

Самы час ужо выпраўляцца ў госці да Зюзі. Знакамітая сядзіба нашых міфаў у Пастаўскім раёне запрашае ў музей абярэгаў, да магічнага дрэва, калодзежа з цудамі, у карчму, дзе і чарка, і скварка, і гарбата з мядовымі пернікамі, і да рознай іншай так патрэбнай нам зімою незвычайнасці.



**Вялікі баль у палацы Радзівілаў у Нясвіжы працягнецца да канца студзеня! Прыватныя калекцыянеры дэманструюць тут, у Вялікай выставачнай зале, унікальныя рэчы, звязаныя з шыкоўным дзействам — балем. Вы ўбачыце, напрыклад, сукенку Марыі Валерыі Габсбург, якую стварыў для яе куцюр'е XIX стагоддзя барон Крыстаф фон Дрэкал, або вясельны карсаж ад Чарльза Фрэдэрыка Ворта (цікава, на кім ён служыў сваю службу?), або яшчэ шмат чаго іншага. Ведаеце, што такое партрэзор, бюск, фіжма, аграфія? Там даведаецеся...**



Центр Промышленной Оценки

- Организация аукционов
- Оценка всех видов имущества

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

| | |
|---|---|
| Организатор аукциона | **ЗАО «Центр промышленной оценки»,** **г. Минск, ул. Мележа, 5/2, офис 1703** |
| Продавец | **ОАО «Строммаш»,** **г. Минск, Бетонный проезд, д. 6, к. 309** |

**Предмет аукциона**

**Производственная база** в составе: главный корпус – производственный цех (1 775,5 кв.м, инв. № 630/С-46711), сварочный цех – механическая мастерская (852,5 кв.м, инв. № 630/С-46708), склад-магазин (361,8 кв.м, инв. № 630/С-46709), здание склада (175,5 кв.м, инв. № 630/С-46710), склад (44 кв.м, инв. № 630/С-73831), гараж (23,7 кв.м, инв. № 630/С-73652), проходная (9,7 кв.м, инв. № 630/С-46712), подкрановые площадки (683 кв.м, инв. № 630/С-73651 и 677 кв.м, инв. № 630/С-73649, составные части – рельсы, краны козловые с электроталями), теплотрасса (225,6 м, инв. № 630/С-73656), фекальная канализация (91,6 м, инв. № 630/С-73655), водопроводная сеть (17,9 м, инв. № 630/С-73650), объекты благоустройства (инв. № 630/С-73647, составные части – ограждения, площадки). В состав предмета аукциона входит **оборудование:** кран однобалочный, кран-балки 2 шт., электроталь, трансформаторы 2 шт., распределительное устройство, компрессор, ресивер, молот пневматический, водонагреватели 3 шт.

**Месторасположение предмета аукциона**:
Минская обл., Молодечненский р-н, г. Молодечно, ул. Громадовская, 20

**Начальная цена с НДС 20% – 1 784 923 584 белорусских рубля (снижена на 80%)**

**Сведения о земельном участке**: для обслуживания зданий и сооружений продавцу предоставлен на праве постоянного пользования земельный участок пл. **1,6288 га**

**Задаток 10%** от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях перечисляется на р/с №3012343260010; нерезидентами РБ в валютном эквиваленте по курсу Нацбанка РБ на дату платежа на в/с: в долларах США (USD) – 3012343265044; в евро (EUR) – 3012343265060; в российских рублях (RUB) – 3012343265028; в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области, БИК 153001739, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

| | |
|---|---|
| **Срок подписания договора купли-продажи** | **5** рабочих дней после проведения аукциона |

**Оплата за предмет аукциона** должна быть произведена в течение **20 (двадцати)** календарных дней после проведения аукциона

**Условия аукциона:** покупатель обязан приобрести многолетние насаждения, числящиеся на балансе продавца

Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, а также возмещения затрат и оплаты вознаграждения за организацию аукциона, оговорен в Условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов **www.cpo.by**

Предыдущее извещение о проведении аукциона опубликовано **газете «Звязда» от 06.11.2015**

| | |
|---|---|
| Дата и время проведения аукциона | **08.12.2015 в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, офис 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»** |
| Дата и время окончания приема документов | **07.12.2015 до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, офис 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»** |
| Контактные телефоны | **Тел.: +375 17-280-36-37; +375 29-183-69-71. E-mail: auction@cpo.by** |

Центр Промышленной Оценки

- Организация аукционов
- Оценка всех видов имущества

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

| | |
|---|---|
| Организатор аукциона | **ЗАО «Центр промышленной оценки»,** **г. Минск, ул. Мележа, 5/2, офис 1703** |
| Продавец | **ОАО «Волковысский машиностроительный завод»,** **г. Волковыск, ул. Пролетарская, 31** |

**Предмет аукциона**

| Наименование | Назначение | Общая площадь | Инвентарный номер | Адрес |
|---|---|---|---|---|
| Здание клуба | Здание специализированное иного назначения | 1013,4 | 410/С-1896 | Гродненская обл., Волковысский р-н, г. Волковыск, ул. Пролетарская, д. 31 |

Год постройки – 1967. Составные части и принадлежности: пристройка Б1/к. Обременения: частичная аренда, 2 арендатора, арендуемые площади 189,9 кв.м и 773,5 кв.м

**Сведения о земельном участке**: площадь (га) 0,1725. Категория: земли населенных пунктов, садоводческих товариществ, дачных кооперативов. Целевое назначение: земельный участок для размещения объектов культурно-просветительного и зрелищного назначения (код 1 16 15). Предоставлен продавцу на праве постоянного пользования

**Начальная цена с НДС 20% – 4 306 471 200 белорусских рублей**

**Задаток 10%** от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях (BYR) перечисляется на р/с № 3012343260010; нерезидентами РБ задаток может перечисляться в валютном эквиваленте по курсу Нацбанка РБ на дату платежа на в/с: в долларах США (USD) – 3012343265044; в евро (EUR) – 3012343265060; в российских рублях (RUB) – 3012343265028; в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области (г. Минск, ул. Коллекторная, 11), БИК 153001739, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

| | |
|---|---|
| **Срок подписания договора купли-продажи** | **2** рабочих дня после проведения аукциона |

**Условия аукциона и оплаты предмета аукциона**

Аукцион проводится с условием установки покупателем до 1 мая 2016 года ограждения в границах земельного участка, выделенного для обслуживания предмета аукциона, обеспечивающего сохранность имущества ОАО «ВМЗ». Оплата за предмет аукциона осуществляется в следующем порядке: 50% от цены продажи оплачиваются в течение 20 дней после проведения аукциона. Оставшаяся сумма в течение 60 дней после проведения аукциона

Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, а также возмещения затрат за организацию аукциона, оговорен в Условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов **www.cpo.by**

| | |
|---|---|
| Дата и время проведения аукциона | **28.12.2015 в 14.00 по адресу: г. Волковыск, ул. Пролетарская, 31, ОАО «Волковысский машиностроительный завод»** |
| Дата и время окончания приема документов | **24.12.2015 до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, офис 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»** |
| Контактные телефоны | **Тел.: +375 17-280-36-37; +375 29-183-69-71. E-mail: auction@cpo.by** |

## «Управляющий ООО «ПрофДМ» проводит торги в форме открытого аукциона по продаже имущества ДУП «ПМК-199» УП «Минскоблсельстрой» (УНП 690018982), а именно:

| № | Описание | Начальная цена, бел. руб. |
|---|---|---|
| 1 | Одноэтажное кирпичное здание магазина, общ. пл. 159,1 кв.м и земельный участок с кадастровым номером 620887409101000662 площадью 0,0522 га, расположенный по адресу: Минская обл., Борисовский р-н, Пригородный с/с, д. Углы, ул. Октябрьская, 3 | **277 246 000** |
| 2 | Административно-бытовое здание, общ. пл. 636,1 кв.м и условный земельный участок, расположенный по адресу: Минская область, Борисовский р-н, г. Борисов, ул. Демина, д. 35В | **803 729 000** |
| 3 | Парикмахерская (изолированное помещение) общ. пл. 51,3 кв.м (в составе: коридор – 2,2 кв.м, помещение – 15,4 кв.м, помещение – 8 кв.м, парикмахерская – 23,1 кв.м и сан. узел – 2,6 кв.м), расположенная по адресу: Минская область, Борисовский р-н, г. Борисов, ул. Мелиоративная, 15Б | **179 979 000** |
| 4 | Помещение АТС (изолированное) общ. пл. 45,3 кв.м (в составе: помещение – 38,06 кв.м, помещение – 6,7 кв.м), расположенное по адресу: Минская обл., Борисовский р-н, г. Борисов, ул. Мелиоративная, 15Б | **153 941 000** |
| 5 | Блок бытового обслуживания (изолированное помещение) общ. пл. 467,3 кв.м (в составе: кладовая – 3,6 кв.м, кладовая – 5,3 кв.м, коридор – 4,3 кв.м, помещение – 5,0 кв.м, коридор – 16,6 кв.м, коридор – 19,8 кв.м, сан. узел – 5,5 кв.м, сан. узел – 4,2 кв.м, сан. узел – 3,9 кв.м, помещение – 10,0 кв.м, помещение – 13,8 кв.м, помещение 275, 1 кв.м, подвальное помещение 100,2 м.кв.), расположенный по адресу: Минская область., Борисовский р-н, г. Борисов, ул. Мелиоративная, 15Б | **1 108 212 000** |
| 6 | Здания и сооружения производственной базы (в составе: резервуарная, общ. пл. 112,6 кв.м и расположенная на земельном участке с кадастровым номером 620887409101000661 по адресу: Минская обл., Борисовский р-н, Пригородный с/с, д. Углы, ул. Октябрьская; не завершенный строительством объект (стройматериалы), расположенный на земельном участке с кадастровым номером 620887409101000661 по адресу: Минская обл., Борисовский р-н, Пригородный с/с, д. Углы, ул. Октябрьская; ограждение территории железобетонное, инв. № 30) | **450 000 000** |
| 7 | Здание гаража, общ. пл. 59,8 кв.м | **41 641 800** |

**Аукцион состоится 24.12.2015 г. в 11.00 по адресу: Минская обл., Борисовский р-н, д. Углы, ул. Октябрьская, д. 5. Заявки на участие в аукционе принимаются с 24.11.2015 по 23.12.2015 г.**

Для участия в торгах лицо, заявившее о своем участии в торгах, вносит задаток в счет обеспечения оплаты приобретаемого на торгах имущества в размере 1 процента от начальной цены имущества должника, выставляемого на торги.

*Задаток перечисляется на следующие реквизиты: р/с № 3012401820017 в РКЦ 21 в филиале ОАО «Белагропромбанк» г. Борисова, код 942, УНП 690018982.*

По вопросам участия в аукционе, ознакомления с предметами торгов, а также по всем иным интересующим вопросам, связанным с проведением торгов, обращаться по тел.: +375 (17) 395-81-34; +375 (29) 698- 51-76.

## РУП «ЖИЛКОММУНТЕХНИКА» ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОННЫХ ТОРГОВ ПО ПРОДАЖЕ СОБСТВЕННОСТИ ОАО «ЖЕЛДОРСЕРВИС»

| Номер лота | ЛОТ № 1 | ЛОТ № 2 |
|---|---|---|
| Наименование объекта | 1. Капитальное строение с инвентарным номером 120/С-14253 (Хлебопекарня №2), общ. пл. 285,0 кв.м, расположенное по адресу: Брестская обл., Березовский р-н, Первомайский с/с, д. Первомайская, ул. Савчука<br>2. Капитальное строение с инвентарным номером 120/С-14254 (Сарай), общ. пл. 25,8 кв.м, расположенное по адресу: Брестская обл., Березовский р-н, Первомайский с/с, д. Первомайская, ул. Савчука<br>3. Капитальное строение с инвентарным номером 120/С-23533 (Сарай), общ. пл. 75,3 кв.м, расположенное по адресу: Брестская обл., Березовский р-н, Первомайский с/с, д. Первомайская, ул. Савчука, 119В/2<br>4. Кабельная линия АВББШВ4*70 (инв. №11066), длина 270 м<br>5. Сеть водопровода (инв. №11067), длина 15 м<br>6. Сеть канализации (инв. №11068), длина 15 м<br>7. Ограждение бетонное (инв. №11072), длина 30,6 м<br>8. Ограждение из металлопроката (инв. №11073), длина 41,4 м<br>9. Ограждение деревянное (инв. №11071), длина 13,3 м<br>10. Ограждение деревянное (инв. №11070), длина 8,6 м | 1. Капитальное строение с инвентарным номером 100/С-47784 (Склад №4), общ. пл. 434,7 кв.м, расположенное на земельном участке с кадастровым номером 140100000001029214 по адресу: Брестская обл., г. Брест, ул. Скрипникова, д. 3<br>2. Капитальное строение с инвентарным номером 100/С-47792 (Подсобное помещение), общ. пл. 177,2 кв.м, расположенное на земельном участке с кадастровым номером 140100000001029214 по адресу: Брестская обл., г. Брест, ул. Скрипникова, д. 3<br>3. Капитальное строение с инвентарным номером 100/С-47785 (Склад №3), общ. пл. 130,8 кв.м, расположенное на земельном участке с кадастровым номером 140100000001029214 по адресу: Брестская обл., г. Брест, ул. Скрипникова, д. 3<br>4. Капитальное строение с инвентарным номером 100/С-47783 (Холодильные камеры), общ. пл. 386,7 кв.м, расположенное на земельном участке с кадастровым номером 140100000001029214 по адресу: Брестская обл., г. Брест, ул. Скрипникова, д. 3<br>5. Капитальное строение с инвентарным номером 100/С-47788 (Здание склада), общ. пл. 235,1 кв.м, расположенное на земельном участке с кадастровым номером 140100000001029214 по адресу: Брестская обл., г. Брест, ул. Скрипникова, 3А/4 |
| **Начальная цена продажи, руб. без НДС** | **701 305 000** | **2 754 430 000** |
| **Размер задатка, руб** | **70 130 500** | **275 443 000** |
| **Площадь земельного участка, га** | | 0,7022 |
| **Права на земельный участок** | Право постоянного пользования | Право постоянного пользования |
| **Условия продажи** | Без условий | |
| **Продавец (Балансодержатель)** | ОАО «Желдорсервис» | |
| **Организатор торгов** | РУП «Жилкоммунтехника» Филиал «Центр «Белтехинвентаризация» Брестское областное управление | |
| **Срок заключения договора купли-продажи** | В течение 20-и рабочих дней с момента подписания протокола о результатах аукциона | |
| **Условия оплаты** | В соответствии с заключенным договором купли-продажи | |
| **Номер р/с для перечисления задатка** | р/с 3012105618108 руб. РБ в региональной дирекции №700 ОАО «БПС-Сбербанк» по г. Минску, код 153001369, УНП 102353509 | |

**Аукцион состоится 28 декабря 2015 г. в 11.00 по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10-325, Филиал «Центр «Белтехинвентаризация»**

Для участия в аукционе необходимо предоставить:

1. Заявление на участие в аукционе по установленной форме и подписанное соглашение о правах и обязанностях с Филиалом «Центр «Белтехинвентаризация».
2. Заверенную банком копию платежного поручения о внесении задатка на расчетный счет организатора торгов.
3. Юридическим лицам – резидентам Республики Беларусь – копию документа, подтверждающего государственную регистрацию юридического лица; представителю юридического лица – доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица).
4. Юридическим лицам – нерезидентам Республики Беларусь – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписку из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена не ранее чем за 6 месяцев до даты подачи заявления на участие в аукционе); представителю юридического лица – доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица).
5. Индивидуальным предпринимателям – копию документа, подтверждающего государственную регистрацию; представителю индивидуального предпринимателя – доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица).
6. Физическим лицам – представителю физического лица – доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица) и документ, удостоверяющий личность данного представителя.
7. При подаче документов на участие в аукционе физические лица, представители физических и юридических лиц предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность.
8. Участник аукциона, выигравший торги, оплачивает продавцу НДС в размере 20% от продажной цены объекта, стоимость затрат на организацию и проведение аукционных торгов – Поверенному.

**Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10, каб. 329 в рабочие дни с 9.00 до 17.00.**

**Последний день приема заявлений – 28 декабря 2015 г. до 10.00.**

**Контактные тел.: 8-(0162)-20-92-13, 21-88-81.**

## ООО «Экономическая стратегия» – ликвидатор ООО «Завод металлоконструкций «Профит», извещает о проведении торгов в форме открытого аукциона по продаже имущества, принадлежащего должнику

**Торги состоятся 26 декабря 2015 года в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Долгиновский тракт, д. 149а/1, к. 4.**

Для участия в торгах необходимо подать до 19 декабря 2015 года заявку и перечислить на расчетный счет ООО «Завод металлоконструкций «Профит» р/с 3012327630024 в ЗАО Банк ВТБ, Дополнительный офис №2, код 108, УНП 690703642 сумму задатка в размере 5% от начальной цены имущества. Сумма шага аукциона по каждому лоту составляет 5% от начальной цены предмета аукциона.

С имуществом, выставляемым на торги можно ознакомиться по его месту нахождения: Минская область, Минский район, п. Колодищи, ул. Минская, 69, предварительно согласовав время с ликвидатором. Все имущество в рабочем состоянии.

Прием заявок и документов на участие в торгах осуществляет организатор торгов – ООО «Экономическая стратегия» – ежедневно по рабочим дням с 9.00 до 18.00 по адресу: 220053, г. Минск, ул. Долгиновский тракт, д. 149а/1, к. 4.

Сведения об имуществе, выставляемом на торги.

| Номер лота | Сведения об имуществе | Начальная цена, за ед. рублей без НДС | Сумма задатка |
|---|---|---|---|
| 1 | Пресс гидравлический ПБ6330 | 90 778 000 | 4 538 900 |
| 2 | Станок фрезерный 6Р82Ш | 45 352 000 | 2 267 600 |
| 3 | Токарно-винторезный станок 1 М 165 | 107 227 000 | 5 361 350 |
| 4 | Станок ленточнопильный Pegas 290-320 SHI-LR | 67 651 000 | 3 382 550 |
| 5 | Рольганг PG 200/290 | 3 536 000 | 176 800 |
| 6 | Рольганг PG 200/290 | 3 536 000 | 176 800 |
| 7 | Рольганг PG 200/290-LR-RDP | 3 536 000 | 176 800 |
| 8 | Рольганг PG 200/290-LR-RDZ | 3 536 000 | 176 800 |

Победителем торгов является лицо, предложившее наибольшую цену.

Возмещение затрат на организацию и проведение аукциона производится победителем аукциона по фактическим затратам. Все расходы, связанные с регистрацией договора купли-продажи, оформлением перехода права собственности, несет покупатель.

В случае если торги признаны несостоявшимися в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником, предмет торгов продается этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 процентов.

По результатам аукциона организатор торгов составляет протокол в трех экземплярах.

Заключение договора купли-продажи осуществляется в течение 7 рабочих дней с даты проведения торгов.

Организатор вправе отказаться от проведения торгов не менее чем за 3 дня до даты проведения торгов.

С более подробной информацией о порядке, условиях проведения торгов, предметах торгов можно ознакомиться по тел.: +37517 388 03 67.

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА НА ПРАВО ЗАКЛЮЧЕНИЯ ДОГОВОРА АРЕНДЫ ЗЕМЕЛЬНОГО УЧАСТКА

## ОРГАНИЗАТОР: ЧАШНИКСКИЙ РАЙОННЫЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ

| | |
|---|---|
| **Адрес земельного участка** | Витебская обл., Чашникский р-н, г. Чашники, ул. Космонавтов, район дома № 17 |
| **Кадастровый номер участка** | 225150100001002584 |
| **Площадь, га** | 0,0100 |
| **Целевое назначение (назначение земельного участка в соответствии с единой классификацией назначения объектов недвижимого имущества)** | для установки и обслуживания торгового павильона (земельный участок для размещения объектов розничной торговли) |
| **Характеристика территории и расположенных на участке инженерных коммуникаций, строений и сооружений; инженерно-геологические условия*** | инженерно-геологические условия будут определены на стадии производства проектно-изыскательских работ |
| **Условия проведения аукциона** | Наличие не менее двух участников.<br>Заключение с Чашникским районным исполнительным комитетом соглашения.<br>Победителю аукциона либо в случае признания аукциона несостоявшимся, единственному участнику несостоявшегося аукциона, выразившего согласие на предоставление ему земельного участка в аренду:<br>- возместить расходы, связанные с проведением аукциона;<br>- внести плату за право заключения договора аренды земельного участка;<br>- заключить с Чашникским районным исполнительным комитетом договор аренды земельного участка;<br>- обратиться в течение двух месяцев со дня заключения договора аренды земельного участка в установленном порядке за государственной регистрацией прав, ограничений (обременении) прав на него в Чашникское бюро Лепельского филиала республиканского унитарного предприятия «Витебское агентство по государственной регистрации и земельному кадастру»;<br>- получить в установленном порядке разрешения на проведение проектно-изыскательских работ и разработки строительного проекта на строительство объекта в срок, не превышающий два года;<br>- занять данный участок в соответствии с целью и условиями его предоставления в течение шести месяцев, со дня государственной регистрации создания земельного участка и возникновения права на него;<br>- снять плодородный слой с площадок застройки и использовать его для благоустройства отводимого участка |
| **Условия инженерного развития инфраструктуры застраиваемой территории** | Подключение к сетям и сооружениям инженерной инфраструктуры выполняется по техническим условиям эксплуатирующих организаций с учетом нагрузок, определенных при разработке ПСД |
| **Срок аренды (лет)** | 5 |
| **Начальная стоимость (руб.)** | 1 340 389 |
| **Сумма задатка (руб.)** | 134 039 |
| **Стоимость расходов по подготовке и изготовлению документации, подлежащих возмещению (руб.)** | 2 508 000 |
| **Дата и место проведения аукциона, сроки приема документов** | Аукцион **состоится 24 декабря 2015 года в 15.00** по адресу: г. Чашники, ул. Советская, 44, (здание райисполкома) кабинет № 37. Заявления и пакет необходимых документов предоставляются участниками с 8.00 до 17.00 **по 18 декабря 2015 года** включительно по адресу: г. Чашники, ул. Космонавтов, 2, кабинет № 3 (землслужба) |

** Инженерно-геологические условия будут определены на стадии производства проектно-изыскательских работ.*

1. К участию в аукционе допускаются физические и юридические лица, индивидуальные предприниматели, подавшие в установленном порядке заявление на участие в аукционе, а также заверенную копию платежного поручения о внесении задатка, кроме того, в комиссию предоставляются:

гражданином – копия документа, содержащего его идентификационные сведения, без нотариального засвидетельствования;

индивидуальным предпринимателем – копия свидетельства о государственной регистрации индивидуального предпринимателя без нотариального засвидетельствования;

представителем гражданина или индивидуального предпринимателя – нотариально удостоверенная доверенность;

представителем или уполномоченным должностным лицом юридического лица Республики Беларусь – доверенность, выданная юридическим лицом, или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, копии документов, подтверждающих государственную регистрацию юридического лица, без нотариального засвидетельствования, документ с указанием банковских реквизитов юридического лица;

представителем или уполномоченным должностным лицом иностранного юридического лица – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена в течение года до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык, легализованные в установленном порядке доверенность или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык;

представителем иностранного гражданина – легализованная в установленном порядке доверенность, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык.

*Сумма задатка перечисляется на расчетный счет 3600329002002 в ЦБУ № 222 филиала №215 ОАО «АСБ Беларусбанк» г. Орша, МФО 150801647, УНП 300008503, код платежа 04002, получатель – главное управление Министерства финансов по Витебской области.*

Оплата стоимости предмета аукциона, подлежащая возмещению Победителем, осуществляется в течение 10 рабочих дней со дня утверждения протокола аукциона.

Контактные телефоны: 8-(02133) 4-24-05, 4-14-46.

■ Як за сцяной

# КАЛІ ПОБАЧ ТАКІ МУЖ

## 12 ГАДОЎ У ДЭКРЭЦЕ — НЕ МЯЖА

**«Калі жанчына бачыць у мужчыну Бога, ён бачыць у ёй Багіню-маці — гэта вынікае з самога слова «любоў» — «людзі Бога ведаюць». Тады ствараецца сапраўдная сям'я, заснаваная на павазе і шчырых узаемаадносінах», — разважае Віталь Малашчанка, псіхасаматык, якога адны лічаць вешчуном, другія — цудоўным мануалам, трэція — знаўцам чалавечых душ, чацвёртыя — гаспадаром, а жонка і шасцёра дзяцей ведаюць, што ён ахоўнік вялікага сямейства.**



У Малашчанкаў, як пад заказ, з'явіліся адзін за адным спачатку тры хлопчыкі, а потым — тры дзяўчынкі.

### Дзед Мароз за рулём

Па адукацыі Віталь Адамавіч аграном, і вынікі яго працы можна ўбачыць больш як на гектары зямлі ў вёсцы Вялікая Слабада Карэліцкага раёна, дзе ён разам з цесцем вядзе сумесную гаспадарку. Акрамя таго, Віталь Малашчанка выдатны знаўца чалавечых цела і душы. Практыкуе псіхасаматыку, аказваючы паслугі высокапастаўленым асобам у клініцы інвалідаў і ўдзельнікаў баявых дзеянняў, якая працуе пад эгідай усерасійскага баявога братэрства ў Ягор'еўску. Як смяецца жонка Таццяна, злучаючы адукацыйныя і псіхасаматычныя навыкі мужа: «Віталь — сейбіт у чалавечых душах».

**«Я купіў сынам планшэт. Устанавіў ліміт на карыстанне 1,5 гадзіны і патрабаванне — ніякіх сварак, інакш выкіну. Праз некалькі месяцаў, калі дзеці не змаглі дамовіцца, хто і калі гуляе з цацкай, я зламаў яе».**

У шматдзетнага бацькі гэта другая сям'я. Акрамя Серафіма, Яраслава, Юлія, Варвары, Насці і Мілы ў Віталя Малашчанкі ёсць дачка Алеся ад першага шлюбу і падораная ёю двухгадовая ўнучка. Калі Таццяна нараджала малодшую дачку, Алеся прыехала да бацькі, каб дапамагчы яму справіцца з вялікім сямействам.

У сям'і Малашчанкаў пануюць узаемная павага, клопат і разуменне, аднак кіруе ўсё ж такі мужчына. Таццяна не проста пагаджаецца з мужам, а можа працягнуць яго думку і нават завяршыць выказванне.

— Мужчына — галосная літара, якая абвяшчае і нясе інфармацыю аб сваім родзе і корміць яго, а жанчына — зычная, якая дапасоўвае і прадстаўляе свой род у родзе мужчыны і род мужчыны ў сваім родзе. Аднак гэта не азначае падпарадкаванне ўладзе, бо яна патрэбна, каб разумець і бачыць, а не ўладарыць, — разважае гаспадар.

Народных свят і звычаяў Малашчанкі таксама прытрымліваюцца і ладзяць відовішчы для ўсёй вёскі. Сёлета на Купалле ў вогнішчы спалілі МАЗ спецыяльна замоўленых бярозавых дроў. На Новы год у двары ўпрыгожваюць елку, запальваюць мноства гірляндаў. У гэтым годзе Віталь абяцаў апрануцца Дзедам Марозам, а Таццяну зрабіць Снягуркай (касцюмы ўжо куплены) і пабудаваць для казачнага персанажа сані з матарам і рулём, каб ездзіць на іх па вёсцы.

— Мы стараемся падтрымліваць традыцыі, каб на іх не забываліся, каб не гублялася радавая памяць. У маім дзяцінстве ўся вёска гула на святы, а зараз амаль ніякага руху. Мы і на Хрышчэнне ў сажалцы купаемся. Чаму даўней у студні акуналіся, ведаеце? — пытаецца Таццяна. — За тыдзень Калядаў людзі часта пераапраналіся ў нячысцікаў, і каб змыць з сябе гэтыя вобразы, ім трэба было абавязкова акунуцца ў ледзяную палонку.

### Сажалка з чорным амурам і лазня ў два паверхі

Вясковая сядзіба ўражвае памерамі не толькі ўчастка і збудаванняў на ім, але і колькасцю разнастайных раслін. На тэрыторыі 320 ружавых кустоў, 80 пладовых дрэў, многа ягад.

— Я не хачу, каб маім дзецям не хапала вітамінаў, таму ў нас расце шмат чаго, асабліва ранняспелага. Вядро клубніц, напрыклад, пусцее праз 15 хвілін. А сваю чарэшню аднойчы елі ўжо 15 мая. Яе нават ад шпакоў не давялося бараніць, бо яны не маглі ўцяміць, што ягады паспелі, — расказвае Таццяна.

На дзіцячай пляцоўцы з арэлямі, каруселямі і пясочніцай улетку збіраюцца ўсе навакольныя дзеці, а басейн на вуліцы з маленькім вадаспадам — мясцовая славутасць.

— Каля нашага плота ўсё лета стаіць па 20 дзіцячых ровараў аматараў пакупацца і пагуляць, — кажа шчаслівая маці.

**«Самае дарагое, што ў нас ёсць, — гэта дзеці, а той, у каго іх мала, — жабрак».**

Гаспадар выкапаў грунтоўную сажалку 40 на 50 метраў. Тут водзяцца таўсталобік, чатыры віды карасёў, карп, сом, лінь, плотка, шчупак і нават чорны амур.

Сваімі рукамі зроблена і працягвае аздабляцца 400-метровая двухпавярховая лазня, якая таксама адметная памерамі і формамі. На другім паверсе рускі більярд і працоўны кабінет гаспадара, на першым — парылка, басейн з воднай пушкай, якая выдае 600 літраў вады ў хвіліну. Тут адпачываюць святкуючы разам са сваякамі ды сябрамі, якіх у вялікай сям'і мноства. Застацца на ноч можна ў прасторным гасцявым доміку з усімі выгодамі ўнутры, што для невялікай вёскі таксама з разраду дзівосаў.



Двухпавярховая лазня здзіўляе сваёй арыгінальнай архітэктурай і памерамі.

Для працы ў руплівага гаспадара створана адпаведная база: свая піларама, трактар, грузавік, самаробны бімісер для бетону... Таму не дзіўна, што амаль усё ён робіць сам. Сцены лазні звонку, арку, што яднае лазню з вулічным басейнам, і мангал Віталь Адамавіч абкладвае каменнем. З яго ж цалкам зроблены і басейн.

Фундамент двухпавярховага дома, які Малашчанкі будуюць па льготным крэдыце для шматдзетных у Карэлічах, таксама ўпрыгожаны такімі ж камянямі, як і вясковая сядзіба. Нулявы цыкл будынка (180 кубаметраў бетону) Віталь з памочнікамі ўручную заліці самі за два тыдні. Зараз тут засталіся працы па ўнутраным аздабленні. Магчыма, ужо налета сям'я, якая цяпер жыве ў цешчынай трохпакаёўцы, пераедзе ў новыя сцены.

### Шматдзетнасць у спадчыну

— Таццяну я адбіў у двух прыхільнікаў і звёз, — успамінае Віталь пра пачатак адносін са сваёй другой паловай. — Мы жылі без шлюбу тры гады, вывучалі адно аднаго. Пасля я паставіў яе перад выбарам: або ідзём у ЗАГС, або збіраю чамадан.

— Давялося пагадзіцца пасля такога ўльтыматуму, — смяецца Таццяна. — Хаця мае бацькі развяліся, і я доўга не магла рашыцца на шлюб.

Малашчанкі разважаюць, што ў іх сям'і, пэўна, спрацавала генетычная памяць продкаў. У Віталя тры сястры і брат, у яго бабулі па маці было пяцёра. У Таццяны — сястра і брат, бабуля па бацьку таксама мела пяцярых, а па маці — шасцярых.

Цікава, што двух сыноў Таццяна нарадзіла за некалькі дзён да і пасля дня нараджэння мужа, а з Мілай трапіла акурат у дату — 11 жніўня, чым бацька вельмі задаволены.

— Самае дарагое, што ў нас ёсць, — гэта дзеці, а той, у каго іх мала, — жабрак. Чалавек нараджаецца не для сябе, а для людзей і Бога. Мы ёсць адно ў аднаго, і гэта галоўнае, а астатняе — не істотнае. Я — частка Таццяны, яна — частка мяне. Мы ж не можам крыўдзіцца на частку сябе. Таму мы з жонкай шукаем крыніцу праблемы, садзімся, размаўляем, і крыўды знікаюць.

Калі ў сям'і шмат дзяцей, яны лягчэй і прасцей адаптуюцца сацыяльна, бо вывучаюць канфлікталогію, гуляючы адно з адным, разам шукаюць выйсце з сітуацыі. «Тых жа, хто выхаваны ў сем'ях, дзе адно-двое дзяцей, асабліва з вялікай розніцай ва ўзросце, у дарослым жыцці пачынае выхоўваць наваколле», — упэўнены Віталь.

— Я купіў сынам планшэт, разумеючы, што пэўным чынам пазбаўляю іх вуліцы і сяброў, але ж, з іншага боку, на ім ёсць гульні для развіцця. Устанавіў ліміт на карыстанне 1,5 гадзіны і патрабаванне — ніякіх сварак, інакш выкіну. Праз некалькі месяцаў, калі дзеці не змаглі дамовіцца, хто і калі гуляе з цацкай, я зламаў яе папалам. Гэта вырашыла канфлікт — я не пакараў дзяцей, а пазбавіўся ад жалязякі, каб яны зразумелі, як у дарослым жыцці можа здарыцца, калі няма паразумення паміж людзьмі.

Думаецца мне, шасцёра — не апошняя лічба для гэтай сям'і, дзе маці ў свае няпоўныя 40 выглядае значна маладзейшай, а бацька мае столькі энергіі, што яе хопіць на ўсё і ўсіх.

**Ірына СІДАРОК.**
**Фота аўтара.**

■

■ Нататкі таткі



# ЛЮБОЎ З ВЫТРЫМКАЙ

**Наступным пасля «мама» і «тата» словамі Васілісы сталі «баба» і «дзедзя». Паслядоўнасць больш чым лагічная, бо гэта, калі не лічыць нас, бацькоў, самыя блізкія і родныя людзі. Нават больш за тое: у некаторых аспектах бабулі і дзядулі яшчэ могуць скласці сур'ёзную канкурэнцыю ў барацьбе за лідарства.**

Неяк давялося пачуць такое меркаванне, што нашы бацькі пры з'яўленні ўнукаў адчуваюць больш шчасця, чым пры нараджэнні ўласных дзяцей. Быццам гэта тыя ж любоў і пяшчота, але з вытрымкай і памножаныя на два. Не магу сказаць, наколькі гэта дакладна, але такой шчаслівай цешчу, як у дзень нараджэння Васілісы, я не бачыў ніколі. Гэта быў проста эмацыйны выбух, хвалі якога ў імгненне накрылі ўсю радню. Безумоўна, многае можна спісаць на тое, што Васіліса — першая ўнучка ў Вікіных бацькоў. Але ў рэальнасці колькасны паказчык тут мае не такое вялікае значэнне. У гэтым я пераканаўся, калі навіну аб з'яўленні яшчэ адной Алесік паведамляў сваёй маці. І хаця размова была па тэлефоне і нас аддзяляла больш за 500 кіламетраў, я выразна пачуў, як маці заплакала. Ад шчасця, нягледзячы на тое, што мая дачка — дванаццаты ўнук! Напэўна, навіна аб прадаўжэнні роду не з той катэгорыі, да якіх можна прызвычаіцца.

Дзіўна, але з нараджэннем малой змяніліся не толькі мы з жонкай. Іншымі сталі і нашы бацькі. Цесць — мужчына строгі і вельмі патрабавальны да блізкіх — стаў мякчэйшым і лагаднейшым. А калі з ім яшчэ побач аказваецца Васіліса, то ён ўвогуле ў імгненне вока ператвараецца ў вялікае дзіця. Аналагічна і з цешчай: пры любой магчымасці яна абавязкова цікавіцца справамі малой, заўсёды гатова сарвацца, каб пабыць з ёй. І, варта адзначыць, дачка вельмі хутка пачала адказваць тым жа. Напрыклад, калі бываем у бабулі ў гасцях, яна хоча бавіць час толькі з ёй. Жонка нават раўнуе, але ў глыбіні душы разумее, што гаворка ідзе аб рознай любові.

Варта разумець, што бабулі і дзядулі не толькі песцяць унукаў ці даюць магчымасць сваім дзецям часам перадыхнуць, узяўшы на выхадныя малых да сябе. Яны дораць успаміны, вучаць таму, на што не хапае часу ў бацькоў.

Са свайго дзяцінства я памятаю дзеда Сашу. Ён жыў адзін на хутары за 7 кіламетраў ад нашай вёскі. Там не было электрычнасці, але мы, малыя, летам вельмі любілі бываць у яго. Асабліва заставацца на ноч, нягледзячы на тое, што спаць даводзілася класціся, як толькі сцямнее, як мы жартавалі — у адзін час з курамі. Гэта было нешта заварожваючае. Спачатку — вячэра пры газоўцы, потым абавязкова слухалі навіны па старым радыёпрыёмніку. А калі ўжо ляжалі ў ложку, дзед доўга апавядаў нам розныя казкі і байкі. Шчыра скажу: такіх я больш нідзе не чуў. Потым раніцай прачыналіся пад трэск агню ў печы, у якой гатаваўся сняданак. Дзед ужо паспяваў справіцца па гаспадарцы, і мы разам у першых промнях новага дня гналі пасвіць кароў і авечак. Гэты занятак часта сумяшчаўся з пошукам грыбоў. І дзед заўсёды нешта расказваў, вучыў нас розным дробязям — усяму таму, што ўмеў сам. Мы вельмі любілі дзядулю, пры тым, што ён нас асабліва не песціў. Хаця без пачастункаў таксама не абыходзілася. Дагэтуль памятаю, колькі радасці зімой было ад духмяных яблычак, што ён захоўваў у сене, ці мёду з сотах, які заўсёды пакідаў спецыяльна для нас.

Мінула ўжо больш за дзесяць гадоў, як не стала дзеда, але я ганаруся тым, што нашу яго імя, часта ўзгадваю яго парады, думаю, як у той ці іншай сітуацыі паступіў бы ён. Магчыма, гэтая сувязь мела вырашальнае значэнне падчас выбару імя для нашай дачкі. Бясспрэчна, я вельмі хацеў бы назваць яе ў гонар сваёй маці, але адна з сёстраў мяне апярэдзіла. Таму вырашылі з жонкаю парадаваць цесця, які заўсёды так хацеў сына, але знайшоў сваё шчасце ў дочках. Цяпер у нас ёсць дзед Вася і ўнучка Васіліса. І я перакананы: пройдуць гады і дачка таксама будзе ганарыцца сваім імем, тым, што працягвае гісторыю дзядулі. Але пакуль Васіліса пра гэта не думае, яе больш турбуе дзень сённяшні, які яна дакладна не ўяўляе без мамы і таты, бабуль і дзядуляў.

**Аляксандр АЛЕСІК.**

■

■ Фотаздымак з гісторыяй

# ЛЯ БЕРЛІНСКАЙ СЦЯНЫ

«За кожным сямейным фотаальбомам хаваецца цэлая гісторыя, якую з захапленнем расказваюць удзельнікі цудоўнага конкурсу «Фотаздымак з гісторыяй», — *піша **Юлія МАЦІЕЎСКАЯ з аграгарадка Дубна, што ў Мастоўскім раёне Гродзенскай вобласці,** і дзеліцца з чытачамі адной са старонак гісторыі сваёй сям'і.* — Мой тата, Маціеўскі Аляксандр Георгіевіч, у 1989 годзе быў прызваны на тэрміновую службу ў рады Савецкай Арміі. Ён з'яўляўся салдатам 1-й мотастралковай роты 133-га асобнага мотастралковага батальёна 6-й асобнай мотастралковай брыгады. Галоўная задача таты і яго таварышаў па службе заключалася ў ахове помніка 75 тысячам савецкіх салдат, што загінулі падчас штурму Берліна. У той час ён знаходзіўся ў англійскім сектары. Таму кожны дзень салдатам даводзілася пераязджаць з Усходняга Берліна ў Заходні, каб змяніць на пасту сваіх таварышаў. Па расказах майго таты, кожны з іх павінен быў ведаць гісторыю помніка на «выдатна», нават здаваў іспыт.

Увогуле, пра службу бацька ўспамінае часта, і заўсёды я дaведваюся аб нечым новым. Напрыклад, зусім нядаўна, пераглядаючы фотаальбом, маю ўвагу прыцягнуў здымак, на якім насупраць вышэйзгаданага помніка сфатаграфаваны пажылы мужчына. Аказваецца, Райнхольд Энслен кожны дзень у знак удзячнасці савецкім воінам прыходзіў да брацкай магілы і фатаграфаваў салдат, што стаялі на пасту. Потым ён дарыў ім тыя здымкі на памяць аб гэтым месцы. Дарэчы, большасць фотакартачак, якія прывёз тата, зроблены менавіта гэтым чалавекам.

А яшчэ раней бацька паведаміў мне пра адну з армейскіх традыцый. Каля помніка знаходзіліся 2 танкі, што прымалі ўдзел у штурме Рэйхстага: 200-ы і 300-ы. Калі салдатам заставалася 300 дзён да загаду, яны фатаграфаваліся з 300-м танкам, а калі 200 дзён — з 200-м. У нашым сямейным альбоме таксама ёсць фотаздымкі, зробленыя татам згодна з гэтай традыцыяй.

Знаходзячыся на службе, бацька пазнаёміўся са шматлікімі людзьмі з усіх рэспублік СССР. Многія сталі яму сапраўднымі сябрамі, і зараз ён падтрымлівае з імі сувязь. Мне вельмі прыемна назіраць за гэтымі цёплымі сустрэчамі армейскіх таварышаў. Пасля іх разумееш, што сапраўднае сяброўства не раствараецца ў часе.

За два гады, што давялося прабыць у далечыні ад Радзімы, тата адкрыў для сябе шмат цікавага. Больш за тое, стаў сведкам адной з найважнейшых падзей XX стагоддзя — падзення галоўнага сімвала «халоднай вайны» — Берлінскай сцяны. У ноч з 9 на 10 лістапада 1989 года ён знаходзіўся ў каравуле і назіраў за тым, як людзі імкнуліся хутчэй разбурыць сцяну, якая столькі гадоў аддзяляла іх ад родных і блізкіх, раз'ядноўвала іх Радзіму.

На памяць аб падзеях той ночы тата прывёз дадому невялікую частачку берлінскай сцяны, якая і сёння займае галоўнае месца сярод нашых сямейных рэліквій.

Пасля аб'яднання Германіі бацька працягнуў службу ў горадзе Вюнсдорфе ў роце ганаровай варты, адкуль і быў звольнены ў запас».


Аляксандр Маціеўскі — у першым радзе злева.


**Подпіс на адваротным боку фота: «Берлін, 27.9.1990. З удзячнасцю маім рускім сябрам. Райнхольд Энслен».**

***Шаноўныя чытачы! Конкурс «Фотаздымак з гісторыяй» працягваецца. Мы па-ранейшаму чакаем ад вас цікавых фота з сямейнага альбома (за выключэннем леташніх здымкаў з курорта, вясельных фотасесій і сучасных фота дзяцей). Вам ёсць што паказаць і расказаць? Давайце пагартаем сямейныя альбомы разам! Фотаздымкі (не больш за тры) з гісторыяй дасылайце з адпаведнай пазнакай на адрас: 220013, г. Мінск, вуліца Б. Хмяльніцкага, 10а або info@zvyazda.minsk.by. Найлепшага аўтара чакае прыз. Арыгіналы дасланых фотаздымкаў абавязкова вяртаюцца.***

■ Майстар-клас

# Макароны, грэчку, рыс у... карціны

**У вясковай бібліятэцы журналіст навучыўся ствараць прыгажосць з таго, што звычайна выкарыстоўваецца для прыгатавання ежы.**

Рабіць аплікацыі з харчовых прадуктаў супрацоўніца Астроўшчынскай бібліятэкі Полацкага раёна Інэса Тарасевіч навучылася падчас дэкрэтнага водпуску:

— У дэкрэце хацелася не толькі дагледаць дачку, а і займацца чымсьці цікавым. Я вязала, шыла какошнікі і сукенкі... Але душа прагнула нечага незвычайнага.

Цяпер Інэса вучыць рабіць аплікацыі мясцовых хлопчыкаў і дзяўчынак, якія любяць прыходзіць у бібліятэку. Як старанны вучань, я таксама сеў за стол. І пачаў слухаць парады.

— Можна выкарыстоўваць розныя крупы. Толькі манная каша лопаецца, калі клей засыхае. І цукар раствараецца. Што тычыцца фарбаў, то пачынала з тых, якія выкарыстоўваюцца для афарбоўкі яек. Ну, што мы намалюем, каб потым прыклеіць зерне? Давайце сонейка для пачатку, потым — хмаркі, — пачала майстар-клас бібліятэкарка.



На дошчачцы з ДВП я абвёў алоўкам пластыкавую шклянку, намаляваў вочкі, вейкі, роцік. А пасля трэба было клей ПВА нанесці на контуры. Баяўся, што «размажу». Ды Інэса супакоіла: калі клей высахне, лішняга не будзе відаць.

Пінцэтам акуратна я чапляў зярнятка за зярняткам. Аказваецца, іх трэба прыклейваць не вертыкальна, як мне падалося спачатку, калі разглядаў гатовыя карціны, а пад нахілам 45 градусаў. Каб замацаваць рысінку, трэба яе пакласці на гарызантальную суседнюю і трохі прыпадняць.

— У якасці «палатна» можна выкарыстоўваць і кардон, і сайдынг, і фанеру... Многае падыдзе, галоўнае, каб тыльны бок добра прапускаў вільгаць, а фас меў клеючую здольнасць, — тлумачыць жанчына.

На развітанне Інэса падарыла мне аплікацыю, зробленую з фасолі, кававых зярнятак, панцаку... Карціна вельмі пахла кавай. Настолькі, што суседзі па маршрутцы агучылі жаданне зрабіць прыпынак ля кавярні на трасе. А я міжволі ўспомніў Астапа Бэндэра, які «падколваў» мастакоў. Памятаеце: «геніі» рабілі партрэты начальства з зярнят. Цяпер, напэўна, і я змагу парадаваць свайго куратара. Ну ці, як мінімум, навучу ствараць прыгажосць сваімі рукамі маіх сыноў.



**Аляксандр ПУКШАНСКІ**

■ Сямейная кухня

## БАБУЛІНА КАША

«Хочаце, распавяду, як мая бабуля прасяную кашу гатавала? Не? А я ўсё роўна распавяду, — піша **Таццяна ЛУКАШЭВІЧ.** — Раніцай, калі ў печы ў чыгунку варылася бульбачка, а побач у патэльні вытаплівалася сала, у гліняным гаршку кіпела проса. На вадзе варылася, з дробкай солі. Хутка каша станавілася мяккай, і тады бабуля разводзіла яе малаком, дабаўляла цукар, важкі кавалак дамашняга масла, убівала сырое яйка. Таксама дамашняе, куды ж у вёсцы без іх. Змешвала ўсё гэта, накрывала вечкам — і ў печ. Пасядзець, падумаць, адпачыць ды насыціцца ўласнымі сокамі.



Вымаўся гаршчок гадзіны ў чатыры. За гэты час мы з сястрой паспявалі пабіцца за права першай апынуцца каля яго. Галоўнай у кашы была, вядома, скарыначка. Моцна схопленая жарам печы, хрусткая, салодкая... За кавалак такой скарыначкі, запіты халодным малаком, можна было аддаць усё, што заўгодна.

Але шанцавала і таму, хто прайграў. Пад скарынкай хавалася такая мілата — не расказаць. Разварыстая, рассыпістая жоўтая каша пыхала парай і, мінаючы страўнік, адпраўлялася адразу ў душу. Той гаршчочак з'ядаўся за паўгадзіны. Гэта быў наш падвячорак. Гэта было шчасце.

Сумнае ў расказанай гісторыі толькі адно. 13 гадоў ніхто не варыць такой кашы».

## УСЁ ІДЗЕ ПА КОЛЕ...

Замалёўка з жыцця ад **маладой мамы Веранікі ГРЫШКОВАЙ з Мінска:**

«Размаўляем з мужам:

— Пайшла я ўжо спаць.

— А што так рана?

— Дык мне ж заўтра ў школу.

І смяюся. Так-так, у школу ранняга развіцця».

## А НА ДЭСЕРТ...

**прапануем цікавую падборку для самарэфлексіі.**

### Мы губляем сілы, калі...

— кажам «так», у той час як хацелася сказаць «не»;

— усміхаемся праз сілу замест таго, каб даць волю слязам;

— не адпачываем;

— угаворваем сябе патрываць яшчэ крыху замест таго, каб зразумець «Дзеля якой светлай мэты я зараз цярплю?»;

— крыўдзімся замест таго, каб папрасіць чалавека аб тым, што нам трэба;

— займаемся не сваёй справай, ходзім на нелюбімую працу;

— чалавек нецікавы, а мы з нейкіх прыдуманых прычын працягваем з ім падтрымліваць стасункі;

— людзі побач з намі вельмі шмат кажуць аб негатыве;

— размаўляем многа пра палітыку, тарыфы ЖКГ, заторы на дарогах і г.д .;

— пляткарым;

— шмат і эмацыйна расказваем пра тое, як жывуць іншыя;

— баімся;

— чакаем, што хтосьці прыйдзе (Дзед Мароз, прынц, алігарх) і жыццё зменіцца;

— лаем сябе, лічым сябе нявартымі, няўмелымі, няўдачлівымі.

### Мы набіраем сілу, калі...

— знаёмімся з новымі людзьмі;

— атрымліваем новыя веды;

— падарожнічаем;

— пераадольваем свае страхі;

— спрабуем нешта новае;

— гуляем (не блытайце з «бяжым на працу» або ідзём у краму, менавіта гуляем без усялякай пэўнай мэты);

— займаемся творчасцю;

— кантактуем з прыемнымі людзьмі;

— маем стасункі з людзьмі, якія нас падтрымліваюць і вераць у нас;

— займаемся сваім целам (падыдуць любыя цялесныя практыкі, лазня, басейн);

— вызваляем фізічную прастору (успомніце, як па-іншаму вы сябе адчуваеце, калі развітваецеся з непатрэбнымі рэчамі);

— вызваляем эмацыйную прастору (успомніце, якую палёгку вы адчуваеце, калі атрымалася даравань чалавеку і развітацца з моцнай крыўдай);

— пачынаем рабіць тое, што нам хочацца.

***Шаноўныя чытачы, дзяліцеся і вы сваімі назіраннямі, жыццёвым досведам, тым, што хвалюе. І, вядома, беражыце сябе!***

*«ЖЫЛЛЁ СТАНОВІЦЦА ДОМАМ ТОЛЬКІ ДЗЯКУЮЧЫ ЖАНЧЫНЕ АБО ПРЫСУТНАСЦІ ДЗІЦЯЦІ». Элінор Портэр, «Паліяна».*

Адказная за выпуск Надзея ДРЫЛА.

# БЫЎ. ЁСЦЬ. БУДЗЕ

## Караткевіч у кіно

**Кіно — гэта з'ява масавая, здымаецца, каб яго глядзелі. Таму пісьменнікі карысныя для кіно: калі іх творы чытаюць, то стужкі, знятыя па іх сцэнарыях, захочуць убачыць. Уладзімір Караткевіч для беларускага кіно стаў асобай выключнай: дзякуючы яму былі зняты цудоўныя фільмы. А некаторыя з яго твораў і цяпер было б актуальна экранізаваць.**



*« — Як вы прыйшлі ў літаратуру?*

*— Ад думкі: усе пішуць, а чаму я не магу?!»*

Мы ведаем яго як выдатнага літаратара, аўтара любімых «Дзікага палявання...» і «Чорнага замка...». Мы ведаем пра яго як пра сябра з выдатнай кнігі Адама Мальдзіса «Жыццё і ўзнясенне Уладзіміра Караткевіча». Мы нават можам даведацца пра Караткевіча-мужчыну з «Жанчын Караткевіча» Дзяніса Марціновіча. Але чамусьці не выдадзена яшчэ кніг пра тое, як здымалася кіно па творах пісьменніка, мы не ведаем Караткевіча-сцэнарыста, Караткевіча, які ператвараў уласныя кнігі ў экраннае мастацтва. Ён разумеў сілу кіно: нездарма вучыўся на сцэнарных курсах у Інстытуце кінематаграфіі ў Маскве. Сам напісаў сцэнарыі да некаторых фільмаў паводле сваіх твораў. Але рэжысёры і сцэнарысты зачытваліся імі — і самі хацелі зняць менавіта гэта.

«Чорны замак Альшанскі», «Дзікае паляванне караля Стаха», «Лісце каштанаў», «Сівая легенда» — гэты спіс можна працягваць, таму што паводле яго твораў здымаліся як ігравыя фільмы, так і анімацыйныя і дакументальныя.

А чаму б не здымаць, калі ў творах яго адно чараўніцтва? Яго кнігі захаплялі, трывожылі, заварожвалі, уздзейнічалі як чарадзейны эліксір.

*«— Якая мэта вашых гістарычных раманаў?*

*— Прышчэпка супраць памылак.»*

Кнігі Караткевіча і экранізацыі яго твораў — «розныя — як і яго вочы». І ў гэтым, з аднаго боку, няма нічога страшнага, бо рэжысёр у першую чаргу стварае ўласны мастацкі твор, які можа не адпавядаць кнізе. А з іншага боку, экранізаваць кнігу так, як хочацца, — гэта своеасаблівая здрада пісьменніку, бо гэта яго героі і яго сюжэт. Але тлумачэнне заўсёды адно: колькі людзей — столькі і думак.

Вось і з вядомым беларускім фільмам «Дзікае паляванне караля Стаха», як гэта ні дзіўна, адбылася гісторыя непрымання стужкі... самім Караткевічам. Рэжысёр Валерый Рубінчык зрабіў фільм сваім уласным творам, пра які, як пра нешта асобнае, незалежнае ад аповесці, немагчыма сказаць амаль нічога дрэннага — гэтае кіно называлі першым беларускім «фільмам жахаў». Так яно і было. Але ў ім «мала што засталося ад філасофіі Караткевіча». Адам Мальдзіс піша, што Караткевіча не дапускалі да здымкаў — ён ніяк не мог паўплываць на працэс, таму і вынік яго не задаволіў. Пасля выхаду стужкі пісьменнік казаў: «...Нялёгкі гэта пісьменніцкі хлеб. Пакутуеш, пакуль народзіш. А потым — другі раз, калі бачыш, што іншыя робяць з тваім чадам...»

— Памятаю, як Караткевіч прыйшоў на першы прагляд «Дзікага палявання...», ён сядзеў за мной, я чула, як ён соп, уздыхаў, а калі стужка скончылася, сказаў: «Гэта не маё кіно». Ён жа ў здымках не ўдзельнічаў, таму яму цяжка было прымаць вынік, але з кожным новым праглядам, я чула, ён прывыкаў да фільма, нельга сказаць, прыняў ён яго да канца ці не. Калі я чытала ўпершыню «Дзікае паляванне караля Стаха», мне было страшна, я чытала ноччу, я памятаю, як па скуры бегалі мурашкі. Мне вельмі падабалася. Я і сёлета гэтую аповесць зноў перачытвала», — падзялілася ўспамінамі апаратар **Таццяна Логінава.**

Фільм выйшаў, ля кінатэатраў выстройваліся чэргі. Можа, людзі ішлі глядзець на тое «Паляванне», якое яны чыталі, на тую Яноўскую, якую яны сабе ўяўлялі? А атрымалі іншае. Так, у экранізацыі ёсць і этнаграфічныя недакладнасці, і занадта хуткае развіццё сюжэту, і, безумоўна, неадпаведнасці тэксту аповесці. Але гэта мастацкі твор рэжысёра — Рубінчык з «кінагенічнага» «Дзікага палявання...» зрабіў «прыблізна гістарычную» стужку, якая, тым не менш, стала адной з самых прызнаных беларускіх карцін за мяжой — атрымала ўзнагароды ў Францыі, Канадзе, Італіі.

*«— Пісьменнік павінен весці?!*

*— Так. Але трэба ведаць, куды.»*

Караткевічу мала было слова. Ён імкнуўся працаваць з тэатральным, тэлевізійным кінамастацтвам. Калі яго творы ставілі ці здымалі, іх не заўсёды разумелі так, як гэта рабіў ён сам. Але няўдачы Караткевіча не ламалі, наадварот, яшчэ больш падбадзёрвалі. Кіно вабіла яго. І Караткевіч, калі яго творы перараблялі, спрабаваў іх выратаваць, прасіў «не псаваць гісторыю», нават на «Беларусьфільме» «кідаўся на калені», абяцаў, што больш нагі яго там не будзе. Не стрымаўшы абяцання, прыходзіў зноў.

Зноў ля кінатэатраў былі чэргі, зноў людзі шукалі квіткі, зноў быў экранізаваны Караткевіч. «Чорны замак Альшанскі» атрымаўся, на яго думку, лепш за «Паляванне», асабліва добра на экране «выглядаў» Лапатка, ролю якога выконваў **Генадзь Гарбук:**

— Калі здымаўся «Чорны замак Альшанскі», Караткевіча на пляцоўцы не было, ён тады хварэў. Рэжысёр Міхаіл Пташук аднойчы перад здымкамі, калі мяне зацвярджалі на ролю, кажа мне: «Калі ты вучыў тэкст — забудзься на яго. Ты будзеш нямы». Я ледзьве не аслупянеў, там былі вялікія маналогі майго героя! І я сказаў Пташуку, каб ён пагаварыў наконт такіх змен з Караткевічам. Праз дзень усё было ўзгоднена — аўтар пагадзіўся. Не ведаю, як рэжысёр яго пераканаў. Так мы і зрабілі — у мяне ў стужцы няма ніводнага слова. Калі фільм быў гатовы, Пташук павёз стужку да Караткевіча, у Аксакаўшчыну. Я не ведаў, як ён успрыняў фільм, а раніцай я ўбачыў Караткевіча ў Аляксандраўскім скверы ля фантана — падышоў да яго на «дрыготкіх каленях». І ён мне сказаў, моцна паціскаючы руку: «Ты, стары, не думай, у мяне ногі слабыя, а рукі яшчэ моцныя, як абцугі!» І гэта была праўда. Я моўчкі, але шматзначна, сеў ля яго, ён паглядзеў на мяне з усмешкай, ляпнуў па маёй назе і сказаў: «Стары, пераканаў!» Адносіны ў нас былі цёплыя. Пра яго казалі, што ён нелюдзімы, замкнёны — усё гэта лухта!



*«— Што самае галоўнае ў чалавеку?*

*— Суперажыванне, сукутванне з няўдачнікам.»*

Пра Караткевіча кажуць, што ён быў вялікім псіхолагам. Калі чалавек кранаў яго, калі пісьменнік адчуваў нешта роднаснае, то прымаў яго. Калі не — не прызнаваў. Таксама ён рабіў і са стужкамі, знятымі па ўласных творах. Калі Караткевіч бачыў у фільме сваю гісторыю, адчуваў сваю філасофію, пазнаваў сваіх герояў — ён прымаў гэты твор.

— У Караткевіча, вядома, былі непрыемнасці з «Дзікім паляваннем...». Ён ніяк не мог яго «дабіць». І нават стаяла пытанне — можа, замяніць назву стужкі? Ён сядзеў на калідоры мастацкага аб'яднання сумны, я падышла да яго і спытала, што здарылася. А ён адказаў: «Ды вось, прыдзіраюцца, не ведаюць, што трэба, можа, назву заменяць». І мы з ім пачалі хутка прыдумляць розныя назвы, — кажа **Ізольда Кавелашвілі**, якая працавала над сцэнарыем «Дзікага палявання караля Стаха».

Пісьменнік лічыў, што кіно — гэта магчымасць уздзейнічаць на людзей, абуджаць іх памяць, казаў, што гэта магутная сіла. Але ў той жа час разумеў, што «сапраўдны пісьменнік цалкам сябе кіно ніколі не аддасць, таму што кіно — мастацтва групавое, дзе індывідуальнасць аўтара нібы раствараецца». Кіно для Караткевіча было і радасцю, і болем.

Калі ён штосьці пісаў, усе гэтага чакалі, часам падганялі яго, прасілі хутчэй выдаць кнігу, на што ён адказваў: «А вы думаеце, мне гэта лёгка?! Любімых герояў — пад кулі, на вісельні, на катаргу, у ссылку...». Як маці дзяцей, ён нараджаў, бывала, з пакутамі, творы, якіх усе чакалі, як першага снегу. Караткевіча чыталі, паводле яго кніг здымалі, гэтыя фільмы глядзелі... Што і казаць, глядзяць і цяпер. А ён, як чалавек, якому неабыякавы лёс свайго дзіцяці, пытаўся:

*— Якія навіны на Божым свеце? Можа, мой фільм бачылі?*

**Маргарыта ДЗЯХЦЯР.**

# «НЕ ТРЭБА, НЕ ВАРТА НАРАКАЦЬ»

**(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)**

Напрыклад, хрэстаматыйнага верша «Багдановічу», які заканчваецца наступнай страфой:

*Смела крочу цяпер у пяскі я*
*Перад светлай заветнай гарой,*
*Бо як ёсць у народа такія —*
*Не загіне давеку народ.* —

і на заканчэнне гэтага ж верша, апублікаванага ў 2-м томе:

*Смела крочу цяпер у пяскі я*
*Перад светлай Сінайскай гарой,*
*Бо як ёсць у народа такія —*
*Не загіне давеку народ.*
*Не загіне ні слова, ні справа,*
*Калі здолеў хоць нешта сказаць:*
*Вашай сілы і вашае славы*
*«Не разбіць,*
*Не спыніць,*
*Не стрымаць!»*

Праўка «Сінайскай» на недарэчнае «заветнай» разбурае разуменне першага радка (чаму ж тут аўтар выкарыстоўвае «пяскі»?), нівелюе менавіта хрысціянскае светабачанне аўтара і ў выніку далучэнне Багдановіча да ліку тых, хто застанецца ў памяці чалавецтва. А ліквідаваная страфа — узор арыгінальна знітаванай з ідэйным зместам і са структурай верша цытаты з «Пагоні» Багдановіча, узор канцэптуальна важнай думкі пра неўміручасць усяго народа, які нарадзіў такога сына.

Вось пачатак шырокавядомай аповесці «Дзікае паляванне караля Стаха», якая друкавалася пры жыцці Караткевіча: «Я стары, я нават вельмі стары чалавек...» — і пачатак гэтага ж твора ў 4-м томе: «Я стары, я нават вельмі стары чалавек, а ў чалавека розум расце да хмар, пакуль сам ён расце ў зямлю...» Такое філасофскае асэнсаванне пражытых чалавекам у «нашай зямной юдолі» гадоў — сапраўдная залацінка!

**Караткевіч мог бы стаць класікам суседніх літаратур — той жа рускай ці той жа ўкраінскай. Але ён свядома цярабіў сваю беларускую сцежку, спадзяваўся на нас, яго супляменнікаў.**

Вось перад намі раман «Леаніды не вернуцца да Зямлі» (6-ы том) — шматпакутны твор, які асобнай кнігай выйшаў праз дваццаць гадоў пасля напісання пад назвай «Нельга забыць». Дзённікі Караткевіча пацвярджаюць, што ён да канца змагаўся за сваю назву («Увесь дзень вычытваў «Леаніды», — піша ён). Хадзіла пагалоска, што назву нават звязвалі з імем кіраўніка СССР генеральнага сакратара ЦК КПСС Леаніда Брэжнева, таму выключалася любая магчымасць вяртання да загалоўка, у якім кампрэсіўна выяўлена аўтарская інтэнцыя: Леаніды вернуцца да Зямлі толькі тады, калі знікне варожасць, калі перастане ліцца кроў і не будуць гінуць ні ў чым не вінаватыя людзі.

Вось вялікія тамы (7-ы і 8-ы) з раманам «Каласы пад сярпом тваім». Аб'ём твора несупастаўны з тымі тэкстамі, якія былі апублікаваны ў 1960-я гады і цяпер вывучаюцца ў школе.

Вось развагі Караткевіча з кнігі «Зямля пад белымі крыламі» (будучы 12-ы том), якія адсутнічаюць ва ўсіх выданнях: «Лес, што закрывае даляглад, абмяжоўвае кругазор, — чужы стэпавіку. Бязмежная роўнядзь, даляглад, стэп — вось ягоная стыхія. Тут яму шырака, вольна, люба, ёсць дзе размахнуцца, ёсць куды кінуць позірк. Беларус адчувае сябе на бясконцай раўніне пуста, гола і нібы сіратліва. Ён прывык быць закрытым, хаця з аднаго боку, зялёнай або нават сіняй ад далечы лясной сцяной. Любіць далі, але тыя, што адкрываюцца з узгорка, з высокага берага ракі або хаця з вышкі ляснога даглядчыка. У яго характары менш размаху, шырыні, зухаватасці, але затое паглыбленая ўвага да самых нязначных дробязяў у коле ўсяго жывога. Назіральнасць, мройлівасць, прыроджаны рамантызм нараджаюць у яго характары пэўную «фантастычнасць», ці што, і спакойную храбрасць». Ці ж не варты апублікавання такі погляд Караткевіча на беларуса і яго характар? Асабліва з улікам кантэксту, з якога ўзяты прыведзены фрагмент.

Вось захопленае слова пісьменніка пра Рыгора Шырму ў эсэ «Наш дзядзька Рыгор» (у прыжыццёвай публікацыі нават назва была зняцая): «Ён грамадзянін. Калі б ні прыйшоў да яго — ён заўсёды паможа. Ніколі ён не абмяжоўваўся адной музыкай» — і той жа абзац, які будзе змешчаны ў 13-м томе: «Ён грамадзянін. Калі б ні прыйшоў да яго — ён заўсёды паможа. Першы, напрыклад, падпішацца пад лістом аб зберажэнні гістарычнага цэнтра Мінска. Бо ніколі ён не абмяжоўваўся адной музыкай». Важнасць ліквідаванай інфармацыі для публіцыстычнага твора відавочная: аўтар пацвярджае грамадзянскую пазіцыю Рыгора Шырмы, прычым выяўленую праз учынак, які і сёння заслугоўвае ўхвалення.

Прыклады можна доўжыць... А як было аўтару бачыць, што з яго твораў робяць падфарбаваныя малюнкі тагачаснай рэчаіснасці? Але, відаць, Караткевіч вымушаны быў зжывацца з гэтым, і што яму гэта каштавала, мы даведаемся, хутчэй за ўсё, яшчэ нехутка. І новае прачытанне яго твораў новымі пакаленнямі беларусаў яшчэ наперадзе, і навуковае асэнсаванне іх з пункту гледжання еўрапейскага і сусветнага літаратурнага кантэксту чакае сваіх даследчыкаў.

Безумоўна, Караткевіч мог бы стаць класікам суседніх літаратур — той жа рускай ці той жа ўкраінскай. Але ён свядома цярабіў сваю беларускую сцежку, спадзяваўся на нас, яго супляменнікаў, верыў: «Як сканаю — душа застанецца». Глыбокая і шырокая душа Караткевіча штостаронкава пазірае на нас «вачыма празарлівца» з нядаўна апублікаванага дзённіка 1965—1966 гадоў. «Не трэба, не варта наракаць» — кажа ён сам сабе і адначасова нам, бо пісаў не толькі для сябе, але і для нашчадкаў. «Не трэба, не варта наракаць» — паўторым за Караткевічам і будзем сумленна і годна рабіць сваю працу кожны на адведзеным яму лёсам месцы, бо мы народжаны тут і любім «гэтую сваю святую зямлю аддана і да канца. Іншай нам не дадзена, ды й непатрэбна».

**Пятро ЖАЎНЯРОВІЧ.**

## ВЕЧАР З КЛАСІКАМ...

Літаратурна-творчая вечарына «Прачытай Уладзіміра Караткевіча!» пройдзе 26 лістапада ў Фундаментальнай бібліятэцы Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта (праспект Незалежнасці, 4). Пачатак у 16.00. Мерапрыемства прымеркавана да 85-годдзя з дня нараджэння пісьменніка.

На свяце збяруцца прыхільнікі творчасці Караткевіча, студэнты і выкладчыкі БДУ. Адкрыецца вечар сумесным чытаннем верша «На пачатку дарог». Працягне літаратурную акцыю выступленне студэнтаў, у выкананні якіх прагучаць урыўкі з найбольш вядомых твораў пісьменніка і песні на яго вершы. Гасцей вечарыны чакаюць інсцэніроўка ўрыўка з аповесці «Дзікае паляванне караля Стаха» і віктарына па тэме «Творчасць пісьменніка». Таксама запланавана сустрэча з навуковым кіраўніком і адным з укладальнікаў 25-томніка твораў пісьменніка Анатолем Вараб'ём.

А завершыцца літаратурная імпрэза ўзнагароджаннем найбольш актыўных удзельнікаў вечарыны.

**Надзея НІКАЛАЕВА.** *nikalaeva@zviazda.by*

■ Хто каго?

# «КАЛІ БУДЗЕШ, ТАТКА, СПАЦЬ, МЕЦЬМЕШ СУМНЫ ВЫНІК...»

**Што было — было.**
**Муж неяк з раніцы чухае патыліцу: «Дзіўна, — жонцы кажа, — прачнуўся, а цябе няма. Дзе ты была, дарагая?».**
**Тая ў адказ: «А дзе ты прачнуўся, дарагі?».**
**І сапраўды: калі ў парку на лавачцы (глянулі на верхні здымак?), то для другога чалавека там месца няма.**
**Што ёсць?**
**Як заўжды, у нашай пошце дзясяткі меркаванняў на тэму, што б гэта значыла?**



Такім чынам, погляд першы — ад **сужэнцаў Ніны ды Івана Астроўскіх з Мінска:**

*Усё на выгляд вельмі проста:*
*Хтось сярэдняга ўзросту,*
*Покуль сын ціхутка спіць,*
*Лёг на лаўку адпачыць.*

Заканамернае пытанне: ад чаго?

І досыць нечаканы адказ:

*У адзін з калядных дзён*
*Быў бацькоўскі марафон.*
*Старшы прапаршчык Алег*
*Толькі... восенню прыбег —*
*Дужа натаміўся:*
*Тут жа з ног зваліўся!*

Піша так **спадарыня Валянціна Гудачкова з Жыткавіч.** І, згадзіцеся, мае рацыю: калі ўлічыць, што ад Каляд да лістапада... дзевяць месяцаў, можна было натаміцца. І дзіцячы вазок — як вынік...

Прычым вынік цалкам заканамерны, ухвальны...

Сведчаннем таму ліст ад **спадара Валерыя Гаўрыша з Чавусаў.** «Жонка надоечы адправіла мяне ў краму, — піша Валерый Мікалаевіч. — Узяў там што трэба, стаў у чаргу, каб разлічыцца. А касірка, гляджу, замест таго, каб працаваць, па мабільным гаворыць, кажа некаму: «Куртачка на вешалцы, шалічак завяжы... І доўга не гуляйце...». Потым, праз паўзу, дадае: «Дома ручкі памыць не забудзься. І пакармі дзіця... Чым-чым? Кашы звары...». Скончыла размову, тэлефон у кішэньку паклала і ўжо нам, пакупнікам, кажа: прабачце, толькі тыдзень як з дэкрэтнага на працу выйшла. Першы раз дзіця на бацьку пакінула... Вось і хвалююся».

Ёсць чаго, згадзіцеся! Бо жанкі — і насамрэч — пол зусім не слабы. Прынамсі пасля бяссоннай ночы (а колькі іх у нашых матуль?!) мала хто з так званых дужых мужчын мог бы дагледзець дзяцей, навараць баршчу, штосьці памыць, прыбраць у кватэры і г.д. А жанкі могуць.

І каб толькі гэта! Баюсь, мужык (і такіх незлічона!) зразумець не мог, куды яго жонка грошы дзявае? Досвед — рэч незаменная: развёўся ён, месяц пажыў. Стаў потым гадаць, адкуль яна іх брала...

Спытаеце, прычым тут хлопец са здымка? Чытайце (**спадар Гаўрыш** піша):

*Пагадзіўся на дэкрэтны:*
*Тры гады! Во адпачну!..*
*Месяц вытрымаў канкрэтна*
*І ўжо выбіўся са сну.*

Цяжка беднаму! Не толькі фізічна, як лічыць **спадарыня Соф'я Кусянкова з вёскі Лучын Рагачоўскага раёна,** але і псіхалагічна. І тады, на гэтай глебе, чаго ні зробіш: нават сваю калыханку складзеш. Кшталту:

*Ой люлі, люлі, люлю,*
*Спі, сынок... І я пасплю.*
*Тваёй мамы не відаць —*
*Пайшла ў краму*
*Штось купляць.*
*Возьме паліто сабе*
*І кашульку на цябе.*
*А мне піва не прыждаць...*
*Дзе ж там носіць тваю «маць»?*

І гэта, як вы разумееце, яшчэ кветачкі. «Нехта з маладых бацькоў думае, што самы цяжкі час у выхаванні дзяцей, калі яны зусім малыя і спаць не даюць. Паверце мне як бацьку двух сыноў, — піша **спадар Мікалай Старых з Гомеля,** — што галоўныя праблемы яшчэ наперадзе:

*Калі малыя па калясках*
*І ноччу трэба калыхаць,*
*Ёсць час, каб трохі адаспацца,*
*Калі ўдзень вязеш гуляць.*

*А потым дзеткі вырастаюць*
*(Як бачыш час той праміне!)*
*Тады каленцы выкідаюць, —*
*Каб і хацеў, дык не заснеш!*

Што, канкрэтна, лічыць тымі самымі «каленцамі», — варыянтаў шмат. Ну ў прыватнасці — ад **спадара Міколы Кісяля з Мінска:**

*На прагулку вывез Сашку, —*
*Два знаёмцы ў двары.*
*«Раздавілі» з імі пляшку*
*І паснулі без пары...*
*Гэты татка спіць — не чуе,*
*Як яго сынок гаруе.*

Плача, трэба разумець! Бяда... І вялікая. Але ж — на думку **спадарыні Гудачковай** — іх абодвух можа напаткаць і большая:

*Калі будзеш, татка, спаць,*
*Мецьмеш сумны вынік:*
*Могуць хлопчыка забраць...*
*Могуць і падкінуць.*

Гэтым, на жаль, цяпер нікога не здзівіш. І татку, пра якога піша **спадар Анатоль Гарачоў з вёскі Даўнары Іўеўскага раёна,** яшчэ пашчасціла:

*Малады і нежанаты,*
*Ясь прылёг на лаве...*
*Аказалася, што... тата*
*Ён на «самай справе»!*
*Мабыць, правілы маралі*
*Паступова згінулі:*
*Пакуль спаў, не абакралі,*
*А дзіця падкінулі.*

Добра (на думку спадара **Міколы Кісяля з Мінска**), калі сваё, роднае:

*Ясь забыўся, як калісьці*
*Падабалася Марына,*
*Як кахаліся на лісцях...*
*Потым знікла дзесь дзяўчына.*
*А цяпер прывезла... «факт» —*
*У калясцы — немаўлятка.*
*Татку з ног зваліў інфаркт.*
*Не чакаў такога татка!*

Анекдот — пра такую ж неспадзяванку. Вечарам у цеснай кватэры бацька правярае, ці паснулі сынкі. Ціхенька просіць: «Ваня, падай вады». У адказ — цішыня. «Толя, падай вады». Ні гуку таксама. «Міша, можа, ты вады прынясеш?» Маўчок... Толькі ён да маці падсунуўся, — голас над вухам: «Татка, ты вады прасіў. На, папі».

Шчаслівы, трэба разумець, бацька: ёсць каму падаць... І будзе, бо як лічыць **спадар Гарачоў:**

*На аналіз ДНК*
*Пробы не паслалі б,*
*Бо і ў бацькі,*
*і ў сынка*
*Сто працэнтаў алібі!*

Што рэдкасць па сённяшнім часе: разбэшчаны свет (паводле **спадарыні Ніны Бурко з вёскі Капланцы Бярэзінскага раёна**). Яна, паглядзеўшы на здымак, піша:

*Разгадаць*
*«красворд» Валодзі*
*У матывацыі*
*паводзін —*
*Многа розуму*
*не трэба:*
*Каб чарговы*
*свой «лявак»*
*Прыхаваць*
*ад разявак,*
*На прагулку*
*ён знарок*
*Прыкаціў з сабой*
*вазок...*
*Немаўлятка*
*мо й дарэчы,*
*Бо не скажа ж*
*пра сустрэчу?*

Імідж прыстойнага чалавека губляць, падобна, не хочацца? Вось і прыдумляе татка розныя камбінацыі. Хоць, па вялікім рахунку, як лічыць **спадарыня Бурко,** гэта... марна, бо

*Вёска бачыць,*
*Вёска чуе,*
*Вёска ведае ўсё:*
*Хто ў каго калі начуе,*
*І ў каго чыё дзіцё.*

Але ж галоўнае, што ёсць яно, расце. А таму на адрас бацькі слушная парада ад **спадара Гаўрыша:**

*Малайчына — маеш сына.*
*Час і хату будаваць...*
*Побач з ёю — сад раскінуць....*
*Толькі трэба меней спаць.*

Да гэтага ж — меней спаць — заклікае і **спадар Гарачоў:**

*І я «тут быў»...*
*І не разок!*
*На жаль, гады ўжо не тыя...*
*Гаркотна, што адзін вазок:*
*Не спіце ў шапку, маладыя!*

Актуальны заклік. Але ж ці будзе ён пачуты (прынамсі мужчынамі)? **Спадар Гаўрыш,** напрыклад, сумняваецца. І не без падстаў: даведаўся, што сёлета куды раней, чым летась

*...Ў спячку заляглі мядзведзі,*
*Кажаны і барсукі...*
*Набіваюцца ў суседзі*
*Ім, падобна, й мужыкі?*

Прычым асобныя — як сведчыць здымак — ужо з пялюшак?

А зрэшты... Адны маладажоны, кажуць, сварыліся: муж даводзіў, што ён у сям'і галоўны, а жонка — што яна... Ледзь да разводу справа не дайшла. Дзякаваць Богу, дзіцятка ў сям'і з'явілася. І ўсё на свае месцы паставіла: яно галоўнае. Адкуль (ад **спадара Гарачова**):

*Не бачу я дзіцяці твар*
*Ды й не хачу яго сурочыць...*
*Скажу адно: пакуль спіць Цар —*
*І варце можна звесці вочы.*

Ёсць ад чаго (паводле **спадарыні Раісы Васільевай з Гомеля**):

*Ясь круціўся, што ваўчок,*
*Каб заснуў яго сынок...*
*Храпу ўдвух затым задалі —*
*Ажно лісце пастрасалі!*
*А ў выніку малюнак атрымаўся...*

Гляньце яшчэ раз і разам са **спадарыняй Аленай Бажок з Бабруйска** ўсклікніце:

*Гэта што ж за ягамосці*
*Спяць у ціхай прыгажосці?*

(Слоўка цікавае — ягамосць. Паводле слоўніка — незнаёмы мужчына. А яшчэ — форма звароту: тое ж, што пан ці васпан... Гучыць, згадзіцеся? І шкада, што рэдка!)

Але ж гэта так, лірычнае адступленне — перад такім жа лірычным (ад **спадарыні Гудачковай**):

*Закалыхалі шаты*
*І немаўля, і тату...*

А ўсё таму (ад **спадарыні БАЖОК**), што

*Прыгажосць — гэта страшная сіла:*
*Абодвух асілкаў з ног паваліла!*

Яна, згадзіцеся, і сапраўды — можа!

Вось на гэтай прыгожай ноце і завершым чарговы агляд. Што да папярэдняга (гл. «Звязда», 8 кастрычніка г.г.), то найперш трэба нагадаць здымак. На ім (хто не памятае) былі два мужыкі, якія ці то рукамі, ці то жыватамі націскалі на коўш экскаватара.

Паводле вялікага чытацкага журы, найлепшыя радкі пра ўбачанае напісалі **спадарыні Бурко з Бярэзіншчыны, Бажок з Бабруйска, Гудачкова з Жыткавіч, Васільева з Гомеля, спадар Гаўрыш з Чавусаў, сужэнцы Астроўскія з Мінска...**

Апроч гэтага,

*Вось* ***Міколу Кісяля***
*Я хваліў бы і хваліў,*
*Хоць не даў ён ні рубля*
*Ды і чаркі не наліў.*
*Крыўду тую я сцярплю,*
*Пагляджу наўкола —*
*Ды і зноўку пахвалю:*
*Маладзец, Мікола!*

Напісаў гэта **спадар Гарачоў з Іўеўшчыны. Спадар КІСЕЛЬ** адказаў яму прозай: «Неяк на аўтобусе я падвозіў дэлегатаў з В'етнама і, вядома ж, спытаў, ці падабаецца ім у нас, ці палюбілі яны Беларусь? Тыя ў адказ дружна заківалі галовамі, разам адказалі: «Так», — піша спадар Мікола. — Тады я папытаўся, як будзе па-іхняму, па-в'етнамску «я люблю». Адказалі: «Іў, а калі моцна люблю, то іўеў». Дык вось якія людзі жывуць на Іўеўшчыне — вартыя самай моцнай любові!».

Дадам ад сябе, што не толькі там! Як сведчыць рэдакцыйная пошта, яны ў нас жывуць усюды! Вось толькі часам маўчаць і тым самым хаваюць сваю прыгажосць, свае таленты. Да болю шкада!

Пакуль жа... Пераможцам конкурсу на найлепшы подпіс да здымка пра мужыкоў з экскаватарам аб'яўляюцца **сужэнцы Астроўскія з Мінска.** Гэта значыць, што менавіта да іх цягам першага квартала наступнага года будзе бясплатна прыходзіць «Звязда» — любімая газета нашых бацькоў, дзядоў і прадзедаў, найстарэйшая, адзіная са штодзённых беларускамоўная...

Хочаце, каб такая шаноўная, амаль стагадовая госця пяць разоў на тыдзень прыходзіла і да вас? Тады выпісвайце! Або — іншы варыянт — уважліва глядзіце на новы конкурсны здымак, прыдумвайце подпісы (можна — шмат, але не больш як па восем радкоў), дасылайце ў рэдакцыю. Шанц на тое, каб выйграць падпіску, ёсць у кожнага.

**Валянціна ДОЎНАР.**
*dounar@zviazda.by*

***Ад яе ж*** *шчырыя прабачэнні ўсім, чые радкі не прайшлі строгага конкурснага адбору, і гэтаке ж шчырае запрашэнне: «Пішыце!». Свет захаваўся, таму што смяяўся. І думаў.*

■



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

## РУП «Институт недвижимости и оценки» извещает о проведении открытого аукциона по продаже тепличного комплекса и оборудования, принадлежащих ОАО «Нафтан»

| Лот №1 | Тепличный комплекс и оборудование | Витебская обл., Полоцкий р-н, Боровухский с/с, д. Гвоздово, ул. Земляничная, 12 | Начальная цена с НДС, бел. руб. | Задаток, бел. руб. | Шаг аукциона, % |
|---|---|---|---|---|---|
| | | | 334 901 183 540 | 2 000 000 000 | 0,1 |

**ОПИСАНИЕ**

1. Тепличный комплекс с инв. № 250/С-37773. Назначение – здание специализированное растениеводства. Г.п. – 1994. Этажей – 1. Общая площадь – 42601,4 кв.м. Примечания: материал стен – стекло в металлическом каркасе, сендвич-панели.
2. Оборудование: - кондиционер/GENERAL/ инв. № 06253570; - насос дозирующий марки ALPb612PP1000AO, инв. № 06270772, № 06270773, № 06270774, № 06270775, № 06270776; - насос Grundfos CR 15-03 22 3 кВт, инв. № 06273223; - насос Grundfos CR 32-2 22 4кВт, инв. № 06273224; - насос высокого давления EMPAS 37/5 22 с инв. № 06273225; - насос Eletpon CR-60DN, инв. № 06273476, № 06276696; - тележка, инв. № 15200148, № 15200149, № 15200150, № 15200151; № 15200152, № 15200153, № 15200154, № 15200155; - система охранно-пожарной сигнализации/кладовые/ инв. № 08156339; - охранно-пожарная сигнализация, инв. № 08156431; - измеритель EC ELMECO инв. № 08156888, № 08156889; - весы электронные инв. № 08157762; - датчик направления ветра для метеостанции инв. № 08157797; - мультиплексор для климатического компьютера PRIVA, инв. № 08157798; - мультиплексор (С02 селектор), инв. № 08157799; - принтер LX- 300, инв. № 10151147; - тележка трубно-рельсовая, инв. № 13150737, № 13150738, № 13150739, № 13150740, № 13150741, № 13150742; № 13150743, № 13150744; - тележка инв. № 13150835, № 13150836, № 13150837, № 13150838, № 13150839, 13150840; - тележка трубно-рельсовая, инв. № 13150844, № 13150845, № 13150846, № 13150847, № 13150848, № 13150849, № 13150850, № 13150851, № 13150874, № 13150875, № 13150876, № 13150877, № 13150878, № 13150879, № 13150880, № 13150881, № 13150882, № 13150883; - турбо-рельсовая тележка алюминиевая с тормозом со стальными колесами для уборки урожая, инв. № 13150894, № 13150895, № 13150896, № 13150897, № 13150898, № 13150899; № 13150900, № 13150901; - устройство для вырезания отверстий, инв. № 15210820, № 15210821, № 15210822, № 15210823, № 15210824, № 15210825

**ЗЕМЕЛЬНЫЙ УЧАСТОК**

Земельный участок площадью 11,2957 га с кадастровым номером 223881401601000039. Целевое назначение – использование под тепличное хозяйство. Право постоянного пользования.
Ограничения (обременения) прав на земельные участки, расположенные: - в охранных зонах линий электропередачи напряжением свыше 1000 В, площадь 0,8073 га; - в водоохранных зонах водных объектов (река Полюшка), площадь 0,7050 га; - в охранных зонах сетей и сооружений газоснабжения, площадь 0,3690 га. На земельном участке расположены иные объекты, которые не выставляются на аукцион. Переход права на земельный участок осуществляется в соответствии с действующим законодательством Республики Беларусь.

**УСЛОВИЯ**

Победитель аукциона либо в случае, если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в аукционе подано только одним участником и он согласен приобрести Объект по начальной цене, увеличенной на 5% (пять процентов), – Претендент на покупку, должен подписать с Продавцом договор купли-продажи Объекта в течение 30 (тридцати) календарных дней с назначенной даты проведения аукциона.
Победитель аукциона (Претендент на покупку) должен оплатить Продавцу всю стоимость приобретенного на аукционе Объекта не позднее 30 (тридцати) календарных дней со дня подписания договора купли-продажи.
Победитель аукциона (Претендент на покупку) оплачивает Организатору аукциона вознаграждение в размере 250 000 000 (Двести пятьдесят миллионов) белорусских рублей в течение 3 (трех) банковских дней со дня подписания протокола о результатах аукциона.
На Претендента на покупку распространяются правила и условия, установленные законодательством Республики Беларусь для Победителя аукциона.

**Аукцион состоится 29.12.2015 в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, 3 этаж, каб. 4.**

Порядок оформления участия в аукционе содержится на сайте Организатора аукциона **ino.by**.
*Задаток перечисляется на р/с 3012154337010 в ОАО «БПС-Сбербанк» ЦБУ №703, 220004, г. Минск, ул. Кальварийская, д. 4а, код 369. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182. Назначение платежа: задаток для участия в аукционе по продаже тепличного комплекса и оборудования ОАО «Нафтан»,* **проводимом 29 декабря 2015 г.**
Заявления на участие и необходимые документы принимаются в рабочие дни с 8.30 до 12.30, с 13.30 до 16.30 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, 11, каб. 6. **Окончание приема заявлений – 24.12.2015 в 12.00.**
Все желающие могут предварительно ознакомиться с Объектом. Контактное лицо для осмотра Объекта: Мищенков Александр Анатольевич, 8 (0214) 59-52-36, 8 (033) 696-39-24.
Организатор аукциона или Продавец вправе снять лот с торгов до объявления его проданным без объяснения причин снятия.

**☎ Организатор аукциона: 8 (017) 306-00-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52 • www.ino.by • e-mail: torgi@ino.by**

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

**Могилевское областное управление филиала «Центр «Белтехинвентаризация» сообщает о проведении торгов в виде открытого аукциона по продаже недвижимого имущества, на которое обращено взыскание в счет неисполнения налогового обязательства**

**ЛОТ №1:** Капитальное строение с инв.№ 700/С-49221 – административно-бытовой корпус, расположенный по адресу: г. Могилев, ул. Ровчакова, 18: общ. пл. 1256 кв.м, год постройки здания – 1991 г., фундамент – ж/бетонный, стены – панельные, перекрытия – ж/б, кровля – рулонная.
Сведения о земельном участке: в составе земельного участка с кадастровым номером 740100000001000239 площадью 2,5746 га.

**Начальная цена продажи 1 508 931 000 рублей.**
**Сумма задатка 150 893 100 рублей**

| | |
|---|---|
| **Расчетный счет для перечисления задатка** | Получатель платежа Филиал «Центр «Белтехинвентаризация», р/с 3012105618108 в Региональной дирекции №700 ОАО «БПС-Сбербанк» г. Минск, код 369, УНП 102353509 |
| **Дата, время и место проведения аукциона** | **Аукцион проводится 28 декабря 2015 года в 12.00** по адресу: г. Могилев, ул. Лазаренко, 29, офис МОУ Филиала «Центр «Белтехинвентаризация». Последний день подачи заявок и внесения задатка: **24 декабря 2015 года до 12.00** |
| **Срок и условия оплаты приобретенного с аукциона имущества** | В течение двух месяцев и двадцати дней с момента подписания протокола аукциона на расчетный счет Организатора аукциона разовым платежом либо траншами |

Для участия в аукционе участник в установленный срок должен предоставить Организатору:

- заявление на участие в аукционе; - копию платежного документа о перечислении задатка; - паспорт; - индивидуальные предприниматели и юридические лица – резиденты Республики Беларусь – копию документа, подтверждающего государственную регистрацию; - юридические лица – нерезиденты Республики Беларусь – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписку из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена не ранее чем за 6 месяцев до даты подачи заявления на участие в аукционе) или эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения. Представитель физического лица, индивидуального предпринимателя, юридического лица предоставляет доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица).

Участник, выигравший торги, возмещает затраты на организацию и проведение аукциона, в соответствии с Соглашением, которые подлежат уплате в течение 3 рабочих дней после проведения аукциона.

Дополнительную информацию можно получить у организатора аукциона:
**(8-0222) 25-03-37, (8-0291) 400-394; 8-029-624-26-25, эл. почта bti9@inbox.ru**

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

**Могилевское областное управление филиала «Центр «Белтехинвентаризация» сообщает о проведении торгов в виде открытого аукциона по продаже недвижимого имущества, на которое обращено взыскание в счет неисполнения налогового обязательства**

**ЛОТ №1:** Гараж с пристройкой, расположенный по адресу: г. Могилев, ул. Кулибина, 23/2: общ. пл. 296,1 кв.м, год постройки здания – 1983 г., фундамент – бетонный, стены – кирпичные, перекрытия – ж/б, кровля – рулонная, металлочерепица.
Сведения о земельном участке: в составе земельного участка с кадастровым номером 740100000002001173 площадью 1,4467 га.

**Начальная цена продажи 1 019 785 000 рублей.**
**Сумма задатка 101 978 500 рублей**

| | |
|---|---|
| **Расчетный счет для перечисления задатка** | Получатель платежа Филиал «Центр «Белтехинвентаризация», р/с 3012105618108 в Региональной дирекции №700 ОАО «БПС-Сбербанк» г. Минск, код 369, УНП 102353509 |
| **Дата, время и место проведения аукциона** | **Аукцион проводится 29 декабря 2015 года в 12.00** по адресу: г. Могилев, ул. Лазаренко, 29, офис МОУ Филиала «Центр «Белтехинвентаризация». Последний день подачи заявок и внесения задатка: **28 декабря 2015 года до 15.00** |
| **Срок и условия оплаты приобретенного с аукциона имущества** | В течение двух месяцев и двадцати дней с момента подписания протокола аукциона на расчетный счет Организатора аукциона разовым платежом либо траншами |

Для участия в аукционе участник в установленный срок должен предоставить Организатору:

- заявление на участие в аукционе; - копию платежного документа о перечислении задатка;- паспорт; - индивидуальные предприниматели и юридические лица – резиденты Республики Беларусь – копию документа, подтверждающего государственную регистрацию; - юридические лица – нерезиденты Республики Беларусь – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписку из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена не ранее чем за 6 месяцев до даты подачи заявления на участие в аукционе) или эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения. Представитель физического лица, индивидуального предпринимателя, юридического лица предоставляет доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица).

Участник, выигравший торги, возмещает затраты на организацию и проведение аукциона, в соответствии с Соглашением, которые подлежат уплате в течение 3 рабочих дней после проведения аукциона.

Дополнительную информацию можно получить у организатора аукциона:
**(8-0222) 25-03-37, (8-0291) 400-394; 8-029-624-26-25, эл. почта bti9@inbox.ru**

## Филиал «Центр «Белтехинвентаризация»

**г. Гомель, ул. Гагарина, 46, оф. 2**

✓ Оценка оборудования и транспортных средств
✓ Оценка недвижимости и сетей всех форм собственности
✓ Раздел и вычленение недвижимости и земельных участков

**извещает о проведении повторного аукциона по продаже права заключения договоров аренды капитальных строений (зданий, сооружений), изолированных помещений, принадлежащих УО «Гомельский государственный университет имени Франциска Скорины», 8(0232) 60 70 51**

| № лота | Наименование объекта | Начальная цена продажи лота, бел. руб. (с НДС) | Сумма задатка, бел. руб. |
|---|---|---|---|
| 1 | - часть капитального строения (здание столовой №3) в составе: помещения подвала площадью 566,67 кв.м, помещения 1-го этажа площадью 629,28 кв.м; часть капитального строения (склад) площадью 109,4 кв.м. Размер арендной платы в месяц составит 391,6 базовой арендной величины без учета коммунальных услуг. Договор аренды заключается сроком на 3 (три) года. Цель использования: организация питания, розничная торговля, производство продуктов питания.<br>- часть капитального строения (здание столовой №3) в составе: помещения 2-го этажа площадью 625,1 кв.м. Договор безвозмездного пользования помещениями сроком на 3 (три) года для организации питания студентов и организации питания студентов, проходящих оздоровление (лечение) в студенческом санатории-профилактории университета | 3 524 400 | 352 440 |

| | |
|---|---|
| **Адрес объекта** | **Гомельская обл., г. Гомель, ул. Песина, 74** |
| **Срок подачи заявления** | **По 07 декабря 2015 г. в рабочие дни с 9⁰⁰ до 17⁰⁰ от даты опубликования настоящего извещения по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 46, оф. 2** |
| **Дата, время, место, проведения аукциона** | **09 декабря 2015 г. в 11.00 по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 46, оф. 2** |
| **Номер р/с для перечисления задатка** | р/с 3012105618108 в РД №700 ОАО«БПС-Сбербанк», код 369, УНП 102353509<br>Получатель платежа: Филиал «Центр «Белтехинвентаризация» РУП «Жилкоммунтехника» |
| **Условия продажи** | Цены указаны с НДС. Шаг аукционных торгов – 5%, заключить договор аренды в течение 10-ти календарных дней после подписания протокола о результатах аукциона, оплатить стоимость права аренды согласно договора аренды. Победитель возмещает затраты на организацию и проведение аукциона |

Для участия в аукционе необходимо:

1. Оплатить задаток на расчетный счет Организатора аукциона (Филиал РУП «Жилкоммунтехника» «Центр «Белтехинвентаризация») р/с 3012105618108 в РД №700 ОАО «БПС-Сбербанк», код 369, УНП 102353509 **по 07 декабря 2015 года** от даты опубликования настоящего извещения**.**

2. Подать заявление Организатору аукциона по установленной форме с приложением необходимых документов по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 46, оф. 2 **по 07 декабря 2015 года** в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 16.00 от даты опубликования настоящего извещения.

К заявлению прилагаются следующие документы:

- заверенное банком платежное поручение о внесении суммы задатка на расчетный счет, указанный в извещении (информационном сообщении);

- индивидуальным предпринимателем – копия (без нотариального засвидетельствования) свидетельства о государственной регистрации; юридическим лицом – доверенность, выданная представителю юридического лица (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель), а также копии учредительных документов и свидетельства о государственной регистрации юридического лица; иностранным юридическим лицом, иностранной организацией, не являющейся юридическим лицом, созданной в соответствии с законодательством иностранных государств, иностранным государством и их административно-территориальными единицами в лице уполномоченных органов, международной организацией – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов, выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в торгах) либо иное эквивалентное доказательство статуса юридического лица в соответствии с законодательством страны происхождения, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией; представителем иностранного инвестора – легализованная в установленном порядке доверенность, документ о финансовой состоятельности иностранного инвестора, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, без нотариального засвидетельствования; гражданину Республики Беларусь – копия паспорта и копия договора на открытие текущего (расчетного) счета (в случае отсутствия у физического лица текущего счета – необходимо его открыть); представителем гражданина Республики Беларусь или индивидуального предпринимателя – доверенность, заверенная нотариально.

При подаче документов на участие в торгах граждане Республики Беларусь, иностранные граждане, физические лица (граждане Республики Беларусь и лица без гражданства), постоянно проживающие за пределами Республики Беларусь, в том числе представители юридических лиц Республики Беларусь, представители иностранных инвесторов предъявляют паспорт.

В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником, объекты аукциона продаются этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5%.

Участник торгов имеет право до начала торгов письменно отозвать свое заявление на участие в них. Неявка участника торгов на торги признается отказом от участия в торгах. В этих случаях сумма внесенного им задатка возвращается Организатором аукциона в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов.

Победителями торгов будут признаны участники, предложившие более высокую цену. Лица, являющиеся победителями торгов, обязаны: подписать протокол о результатах аукциона; заключить договор аренды в срок не позднее 10 календарных дней от даты подписания протокола о результатах аукциона; оплатить право аренды в сроки, определенные в договоре аренды и возместить затраты на организацию и проведение аукциона, в т.ч. расходы по изготовлению и предоставлению участникам аукциона документации, необходимой для его проведения в течение 3(трех) рабочих дней. Информация о затратах, порядке и сроках их возмещения доводится до сведения участников до начала аукциона. Задатки, уплаченные участниками аукциона, ставшими победителями, будут учтены в счет исполнения обязательств по договору аренды.

**Дополнительная информация по тел.: (0232) 75 06 62, 75 06 63 (факс), сайт www.bti.by**

## Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»

# ИЗВЕЩАЕТ ОБ АУКЦИОНЕ ПО ПРОДАЖЕ ПРАВА ЗАКЛЮЧЕНИЯ ДОГОВОРА АРЕНДЫ ПОМЕЩЕНИЯ

| Наименование | Характеристика |
|---|---|
| **ЛОТ 1** | |
| **Наименование объекта, краткая характеристика, местонахождение объекта** | Право заключения договора аренды сроком 3 года капитального строения, инв. № 400/С-92074 (назначение – здание административно-хозяйственное, наименование – здание административно-хозяйственное), общей площадью 93,0 кв.м по адресу: г. Гродно, ул. Озерское шоссе, 6а |
| **Начальная цена продажи** | 2 790 000 (два миллиона семьсот девяносто тысяч) белорусских рублей с учетом НДС |
| **Коэффициент к базовой арендной величине по договору аренды** | 3,0 |
| **Сумма задатка** | 279 000 (двести семьдесят девять тысяч) белорусских рублей |
| **Условия аукциона** | Целевое назначение – для размещения офисных помещений |
| **ЛОТ 2** | |
| **Наименование объекта, краткая характеристика, местонахождение объекта** | Право заключения договора аренды сроком 3 года капитального строения, инв. № 400/С-92067 (назначение – здание специализированное автомобильного транспорта, наименование – гаражи), общей площадью 53,6 кв.м по адресу: г. Гродно, ул. Озерское шоссе, 6а/4 |
| **Начальная цена продажи** | 1 608 000 (один миллион шестьсот восемь тысяч) белорусских рублей с учетом НДС |
| **Коэффициент к базовой арендной величине по договору аренды** | 3,0 |
| **Сумма задатка** | 160 800 (сто шестьдесят тысяч восемьсот) белорусских рублей |
| **Условия аукциона** | Целевое назначение – для размещения офисных помещений, гаража |
| **ЛОТ 3** | |
| **Наименование объекта, краткая характеристика, местонахождение объекта** | Право заключения договора аренды сроком 3 года капитального строения, инв. № 420/С-26756 (назначение – здание административно-хозяйственное, наименование – административное здание с гаражом (автобаза)), общей площадью 643,3 кв.м по адресу: г. Лида, ул. Труханова, 34 |
| **Начальная цена продажи** | 19 299 000 (девятнадцать миллионов двести девяносто девять тысяч) белорусских рублей с учетом НДС |
| **Коэффициент к базовой арендной величине по договору аренды** | 3,0 |
| **Сумма задатка** | 1 929 900 (один миллион девятьсот двадцать девять тысяч девятьсот) белорусских рублей |
| **Условия аукциона** | Целевое назначение – для размещения офисных помещений, гаража |
| **Продавец** | УП «Барановичское отделение Белорусской железной дороги» Барановичская дистанция гражданских сооружений, 225407, г. Барановичи, ул. Вильчковского, 5, тел. 8-0163-42-25-08 |
| **Организатор торгов** | Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Гродно, ул. Врублевского, д. 3, каб. 209, тел.: 45-05-38, 41-98-32 |
| **Условия оплаты** | По договоренности сторон |
| **Срок заключения договора аренды** | Не позднее 20 рабочих дней с момента подписания протокола аукционных торгов |
| **Номер р/с для перечисления задатка** | р/с 301 257 917 0017 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, БИК 153001739, УНП 500833225 |

**Аукцион состоится 29 декабря 2015 г. в 11.00 по адресу: Гродненская область, г. Гродно, ул. Врублевского, 3**

К участию в аукционе допускаются физические лица, юридические лица и индивидуальные предприниматели, подавшие организатору аукциона в названный в извещении срок заявление с приложением необходимых документов и внесшие в установленном порядке на указанный в извещении текущий (расчетный) счет сумму задатка, получившие билеты участников аукциона и заключившие с организатором аукциона соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона.
Для участия в аукционе в указанный в извещении срок в Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» подается заявление на участие в аукционе со следующими документами:
- заверенная банком копия платежного поручения о внесении суммы задатка на текущий (расчетный) счет, указанный в извещении;
- *юридическим лицом – резидентом Республики Беларусь* – копия документа, подтверждающая государственную регистрацию юридического лица;
- *индивидуальным предпринимателем* – документ, подтверждающий государственную регистрацию индивидуального предпринимателя, и его копия, которая заверяется организатором аукциона;
- *юридическим лицом – нерезидентом Республики Беларусь* – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения; документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с удостоверенным переводом на белорусский или русский язык.
При подаче документов на участие в аукционе организатору аукциона предъявляются:
- представителем юридического лица, индивидуального предпринимателя – доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица) и документ, удостоверяющий личность этого представителя;
- физическим лицом – документ, удостоверяющий личность физического лица;
- представителем физического лица – доверенность и документ, удостоверяющий личность представителя.
Прием заявлений на участие в аукционе со всеми необходимыми документами заканчивается в установленные организатором аукциона день и время, указанные в извещении. Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. Сроком поступления заявления является дата его регистрации в журнале регистрации заявлений на участие в аукционе. Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за 3 календарных дня до назначенной даты проведения аукциона, о чем организатором аукциона извещаются участники аукциона.
В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов. Если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним лицом, предмет аукциона продается этому лицу при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 процентов.

**Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 209, с 8.30 до 17.30 (понедельник – четверг) и с 8.30 до 16.30 (пятница)**

**Последний день приема заявлений – 22 декабря 2015 г. до 15.00**

**Телефон для справок: 45-05-38 – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»**

■ Ліга чэмпіёнаў УЕФА

# ЯШЧЭ НЕ ЎСЁ ВЫРАШАНА!

**БАТЭ на сваім полі падзяліў балы з нямецкім «Баерам» і прэтэндуе на выхад у плэй-оф Лігі чэмпіёнаў**

Так, заўзяты скептык можа паказаць аптымісту турнірную табліцу, у якой наш чэмпіён знаходзіцца пакуль з чатырма баламі на апошнім радку. Але ў «Баера» і «Ромы» перад апошнім турам групавой стадыі ўсяго толькі на адзін бал болей. У любым выпадку, каб прайсці ў наступную стадыю еўракубкаў (Ліга чэмпіёнаў альбо Ліга Еўропы), «жоўта-блакітным» неабходна перамагчы «Рому» ў Італіі. І гэтай восенню хлопцы падобнае ўжо зрабілі.



Фота БЕЛТА.

Дарэчы, «Барселона» на сваім полі разграміла рымлян з лікам 6:1 і, зразумела, ужо забяспечыла сабе выхад у плэй-оф Лігі чэмпіёнаў.

А сустрэча паміж БАТЭ і «Баерам» прайшла ў звышнапружанай барацьбе. Ужо на 2-й хвіліне беларусы добра шакіравалі саперніка. Міхаіл Гардзейчук прабіў нямоцна, але гэтага хапіла, каб мяч нечакана прайшоў паміж ног у варатара леверкузэнскай каманды. Беларусы гулялі нядрэнна, аднак праз некаторы час «Баер» перахапіў ініцыятыву і стаў трымаць у напружанні барысаўскую абарону. На жаль, адноічы Сяргей Чэрнік, які правёў даволі неблагі матч, усё ж такі прапусціў. Лічбы 1:1 захаваліся на табло да канца сустрэчы.

— Пачатак гульні атрымаўся даволі нядрэнным, — падводзіць вынікі матча **Аляксандр ЕРМАКОВІЧ, галоўны трэнер БАТЭ**. — Розніца была ў тым, што ў Леверкузэне мы прапусцілі вельмі хуткія галы (у першым матчы беларусы саступілі 1:4 — **Аўт.**). Гэта, безумоўна, цісне на псіхалогію. На шчасце, сёння мы забілі, для нашай унутранай упэўненасці гэта было карысна. Пасля гола мы мелі яшчэ моманты, у якіх маглі забіваць. Праведзенай працай я вельмі задаволены. Мы навязалі барацьбу і зачапілі свае балы.

Застаецца толькі нагадаць, што апошні матч групавога розыгрышу бабарысаўчане правядуць 9 снежня ў Рыме з мясцовай «Ромай». Верым у каманду!

**Тарас ШЧЫРЫ.** *taras@zviazda.by*

## СЁННЯ

| Сонца | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 8.56 | 16.57 | 8.01 |
| Віцебск — | 8.52 | 16.40 | 7.48 |
| Магілёў — | 8.46 | 16.47 | 8.01 |
| Гомель — | 8.35 | 16.51 | 8.16 |
| Гродна — | 9.10 | 17.14 | 8.04 |
| Брэст — | 9.03 | 17.21 | 8.18 |

**Месяц**

*Маладзік 25 лістапада.*
*Месяц у сузор'і Блізнят.*

**Імяніны**

*Пр. Германа, Івана, Нікіфара.*
*К. Катарыны, Кандрата, Леанарда, Лявона, Сільвестра.*



Фота Надзеі БУЖАН.

## ЗАЎТРА




Даты | Падзеі | Людзі

**26 ЛІСТАПАДА**

**1885** год — 130 гадоў таму нарадзіўся Анс Эрнэставіч Дауман, удзельнік барацьбы за савецкую ўладу ў Беларусі і Прыбалтыцы, герой грамадзянскай вайны. З кастрычніка 1919-га — член РВС 16-й арміі, якая змагалася ў Беларусі. У 1920 годзе — камандзір стралковай дывізіі, удзельнічаў у вызваленні Чэрвеня, Пухавічаў, Клецка, Бярозы, Кобрына, Брэста ад войскаў буржуазнай Польшчы. Загінуў у баі ў 1920 годзе пад Брэстам пры фарсіраванні Заходняга Буга. Яго імем названа вуліца ў Мінску.



**1894** год — нарадзіўся (г. Севастопаль) Іван Дзмітрыевіч Папанін, славуты савецкі даследчык Арктыкі. Ён рана пачаў працаваць, скончыўшы ўсяго толькі 4 класы пачатковай школы. У 1914 годзе Іван Дзмітрыевіч ідзе служыць на флот. Падчас грамадзянскай вайны ў Крыме (1918–1920) Папанін становіцца камісарам аператыўнага ўпраўлення, камендантам крымскай НК, а потым ён быў прызначаны сакратаром Рэўваенсавета Чарнаморскага флоту. У 1922-м Папанін прыязджае ў Маскву — прызначаецца камісарам у Народны камісарыят марскіх спраў, а ў 1923 годзе — у Наркам пошт і тэлеграфаў. На гэтай пасадзе ён скончыў двухгадовыя вышэйшыя курсы сувязі, пасля чаго з'ехаў у Якуцію кіраваць будаўніцтвам радыёстанцыі. Адтуль Панін выпраўляецца ў экспедыцыю на ледаколе «Малыгін» у бухту Ціхая. У 1934 годзе пад яго кіраўніцтвам з'яўляецца палярная станцыя на мысе Чалюскін. У 1937-м пачала дрэйфаваць першая ў свеце станцыя на льдзіне «Паўночны полюс», якая прайшла каля дзвюх тысяч кіламетраў і амаль праз год прыбыла ў Грэнландскае мора. У складзе экспедыцыі быў і Папанін. За кіраўніцтва гэтай дрэйфуючай станцыяй ён атрымаў званне Героя Савецкага Саюза. У 1939 годзе даследчыка прызначаюць начальнікам Галоўпаўночмаршляху. На гэтай пасадзе Папанін ушчыльную заняўся стварэннем ледаколаў. Ён быў паўторна адзначаны «Залатой Зоркай» Героя Савецкага Саюза. У гады вайны Іван Дзмітрыевіч унёс значны ўклад у арганізацыю бесперабойнага руху суднаў на трасе Паўночнага марскога шляху. Пасля вайны Папанін заняўся акіяналогіяй і біялогіяй унутраных вод. З 1951 года і да самай смерці ён узначальваў аддзел марскіх экспедыцыйных работ Акадэміі навук.

**1925** год — 90 гадоў таму нарадзіўся Юрый Уладзіміравіч Семяняка, кампазітар, народны артыст Беларусі (1974). У 1957 годзе скончыў Беларускую кансерваторыю. У 1947–1963 гадах — канцэртмайстар Дзяржаўнай акадэмічнай харавой капэлы Беларусі. У яго творчасці пераважалі музыка для тэатра і песня, якім уласцівы лірызм, душэўны меладызм, заснаваны на беларускай народнай песеннасці і асаблівасцях сучасных масавых жанраў. Аўтар опер «Калючая ружа», «Зорка Венера», кантат «Ясныя дарогі», «Памяці Канстанціна Заслонава», песень «Квітней, Беларусь», «Ты мне вясною прыснілася» і многіх іншых. Пісаў музыку да кінафільмаў «Каханнем трэба даражыць», «Песня нашай зямлі», «Вясновыя мелодыі», тэлефільмаў, радыёспектакляў і тэлепастановак. Апрацоўваў беларускія народныя песні для хору. Значнае месца ў творчасці займалі харавыя творы, вакальныя дуэты, трыа, квартэты, музыка да драматычных спектакляў. У 1978–1980 гадах Юрый Семяняка з'яўляўся старшынёй Саюза кампазітараў Беларусі. Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі (1972). Памёр у 1990 годзе.

**Было сказана**

**Аркадзь КУЛЯШОЎ, народны паэт Беларусі:**
*Сябры з адчаю выцягнуць заўсёды,*
*Хоць знойдуцца між іх сябры з нагоды.*

## УСМІХНЕМСЯ

**Рэцэпт поснага булёну:**
**Падвесіць курыцу на акне так, каб яе цень падаў у напоўненую вадой каструлю.**

— Веніямін Сяргеевіч, як вы сябе адчуваеце?

— Цябе гэта не павінна турбаваць, Федзя, цябе няма ў завяшчанні!

**Як вараць суп у студэнцкім інтэрнаце. Варыцца суп:**
**1-ы курс: у каструлю трапляе прусак, суп выліваюць.**
**2-і курс: у каструлю трапляе прусак, суп выліваюць да таго часу, пакуль прусак сам не выплыве, і суп з'ядаюць.**
**3-і курс: у каструлю трапляе прусак, яго акуратна вымаюць лыжачкай і суп з'ядаюць.**
**4-ы курс: у каструлю трапляе прусак, суп з'ядаюць разам з прусаком.**
**5-ы курс: пакуль прусакоў не наловяць, суп не вараць!**

## «МІНІ-ЗАВОД» У ГАРАЖЫ

**Жыхар Маладзечанскага раёна арганізаваў па месцы жыхарства «міні-завод» па вырабе самагону.**

27-гадовы непрацуючы грамадзянін абсталяваў пад гэтыя мэты падвал гаража. Падчас агляду праваахоўнікі выявілі і канфіскавалі тры бочкі, у якіх была вадкасць светла-карычневага колеру, 160 літраў самагону і ўласна апарат для яго вырабу. Агульны аб'ём брагі ў бочках склаў дзве тоны. Як высветлілася, раней мужчына ўжо прыцягваўся да адміністрацыйнай адказнасці за аналагічнае правапарушэнне.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**







Малюнак Аляксандра ПЯТРОВА.

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: Н. ДРЫЛА (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), М. ЛІТВІНАЎ (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК.

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмная – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 284 44 04, падпіскі і распаўсюджвання — 284 44 04, 287 17 21, бухгалтэрыі: 287 18 81.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Передрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zvyazda.minsk.by,
(для зваротаў): zvarot@zvyazda.minsk.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.

Тыраж 20.035. Індэкс 63850. Зак. № 4632.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

Нумар падпісаны ў 19.30 25 лістапада 2015 года.